View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»

С. А. Шыдлоўскі

# ГІСТОРЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ І ФІЛАСОФСКАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя»

Наваполацк
ПДУ
2012

УДК 1(091)(476)(075.8)
ББК 87.3(4Беи)я73
Ш56

Рэкамендаваны да выдання навукова-метадычным саветам
гісторыка-філалагічнага факультэта ў якасці
вучэбна-метадычнага комплекса (пратакол № 3 ад 12.12.2011)

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
канд. гіст. навук, дац., ст. навук. супрацоўнік ІМЭФ НАН Беларусі
С. А. МІЛЮЧЭНКАЎ;
канд. філасоф. навук, дац., заг. каф. сац.-гум. дысцыплін
УА «ПДУ» І. А. БОРТНІК;
заг. каф. усеагульнай і айчыннай гісторыі УА «ПДУ» Д. У. ДУК

**Шыдлоўскі, С. А.**

Ш56 Гісторыя грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі : вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя» / С. А. Шыдлоўскі. – Наваполацк : ПДУ, 2012. – 148 с.

ISBN 978-985-531-315-2.

Асвятляюцца сутнасныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным і духоўным развіцці Беларусі на розных гістарычных этапах. Прыведзены заданні для праверкі засваення ведаў па матэрыяле курса.

Прызначаны для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя».

**УДК 1(091)(476)(075.8)**
**ББК 87.3(4Беи)я73**

**ISBN 978-985-531-315-2**

© Шыдлоўскі С. А., 2012
© УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт», 2012

# УВОДЗІНЫ

Дысцыпліна «Гісторыя грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі» вывучаецца студэнтамі 5 курса спецыяльнасці «Гісторыя». Яна адносіцца да ліку тых дысцыплін, якія завяршаюць прафесійную падрыхтоўку спецыяліста. Вывучэнне гэтага спецкурса дапаўняе веды па палітычнай гісторыі, спрыяе сістэматызацыі набытых ведаў і фарміраванню агульнай карціны беларускай культуры ў яе гістарычнай дынаміцы. Спецкурс цесна звязаны як з агульнаадукацыйнымі дысцыплінамі гуманітарнага цыкла, так і са спецыяльнымі дысцыплінамі. Ён заснаваны на ведах, атрыманых студэнтамі падчас вывучэння філасофіі, гісторыі рэлігіі, гісторыі культуры, а таксама такіх дысцыплін, як археалогія, этналогія, гісторыя Беларусі.

Актуальнасць курса абумоўлена тым, што ён з’яўляецца крыніцай фарміравання палітычнай і прававой культуры, сродкам выхавання грамадзянскай свядомасці. Вывучэнне гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі ўдасканальвае і ўзбагачае светапогляд, дапамагае арыентавацца ў складаным і супярэчлівым свеце сацыяльна-палітычных адносін, выхоўвае патрыятызм, спрыяе ўсебаковаму духоўнаму развіццю асобы. Ідэі і дасягненні мінулага аказваюць уплыў на сучасныя палітычныя погляды і арыентацыі.

Мэтай вывучэння курса з’яўляецца авалоданне ведамі аб заканамернасцях і асаблівасцях грамадска-палітычнага і духоўнага развіцця Беларусі на розных гістарычных этапах, сістэматычнае азнаямленне з асноўнымі перыядамі інтэлектуальнай і культурнай гісторыі Беларусі на падмурку базавых філасофскіх і агульнакультурных тэкстаў.

Падчас засваення курса студэнт павінен набыць уменне:

– аналізаваць гістарычныя крыніцы і бачыць іх філасофскае і грамадска-палітычнае значэнне;

– аналізаваць канкрэтныя сацыяльна-культурныя працэсы.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен ведаць:

– асноўныя метады комплексных даследаванняў філасофскай і грамадска-палітычнай думкі;

– асноўныя катэгарыяльныя паняцці і канцэпцыі дысцыпліны;

– гісторыю развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі ў Рэспубліцы Беларусь;

– асноўныя напрамкі і школы гісторыі сусветнай філасофіі.

Праграма курса прадугледжвае разнастайныя формы заняткаў: лекцыі, семінары, самастойныя заданні. Праграма разлічана на 85 гадзін, з іх 72 гадзіны аўдыторных заняткаў (54 гадзіны – лекцыйныя заняткі, 18 гадзін – семінары).

Лекцыйны курс дае базавы тэарэтычны матэрыял для авалодання дысцыплінай. Практычныя заняткі спрыяюць замацаванню і паглыбленню атрыманых ведаў, дазваляюць студэнту сфарміраваць навыкі аналізу гістарычных крыніц. Задачай практычных заняткаў па курсе «Гісторыя грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі» з'яўляецца не толькі вывучэнне асобных тэарэтычных палажэнняў, але і праца з пэўнымі творамі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі.

Самастойная праца па курсе «Гісторыя грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі» адыгрывае важную ролю пры вывучэнні дысцыпліны. Яна прадугледжвае індывідуальную дзейнасць студэнта з мэтай засваення філасофскіх катэгорый.

Дадзены вучэбна-метадычны комплекс пабудаваны на тэматычным прынцыпе. Тэмы адпавядаюць вучэбнай праграме курса «Гісторыя грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі» для студэнтаў-гісторыкаў і лагічна звязаны паміж сабой: не засвоіўшы адну з іх, не варта пераходзіць да вывучэння іншай.

# ТЭМА 1. ПРАДМЕТ, ЗАДАЧЫ І ПРЫНЦЫПЫ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА

1. Прадмет і задачы дысцыпліны. Перыядызацыя развіцця беларускай грамадска-палітычнай і філасофскай думкі.

2. Крыніцы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі. Гістарыяграфія праблемы.

## 1.1. Прадмет і задачы дысцыпліны. Перыядызацыя развіцця беларускай грамадска-палітычнай і філасофскай думкі

Грамадска-палітычная і філасофская думка з'яўляецца часткай грамадскай свядомасці і мае гістарычны характар. *Прадметам* вывучэння курса з'яўляюцца ідэі, якія знайшлі адлюстраванне ў навуковых, мастацкіх і публіцыстычных тэкстах. *Аб'ектам* дысцыпліны з'яўляецца гістарычны працэс развіцця беларускай грамадска-палітычнай і філасофскай думкі.

*Задачай курса* з'яўляецца вывучэнне ўзнікнення і развіцця на беларускіх землях тэарэтычных палажэнняў аб грамадстве, рэлігіі, культуры, дзяржаве, праве, даследаванне станаўлення этычных і эстэтычных поглядаў.

У працэсе вывучэння дысцыпліны выкарыстоўваюцца філасофскія і спецыяльна-навуковыя метады. *Прынцып гістарызму* спрыяе раскрыццю сувязяў паміж рознымі канцэпцыямі мінулага і сучаснасці. *Гістарычны падыход* дапамагае пазбаўляцца архаізацыі або мадэрнізацыі мінулага.

### *Перыядызацыя*

Гісторыю развіцця грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі можна ўмоўна падзяліць на восем перыядаў:

1. Грамадска-палітычная і філасофская думка часоў распаўсюджвання хрысціянства і станаўлення дзяржаўнасці на беларускіх землях (X – першая палова XIII стст.).

2. Грамадска-палітычная і філасофская думка перыяду этнічнай кансалідацыі беларускай народнасці (другая палова XIII – першая палова XVI стст.).

3. Грамадска-палітычная і філасофская думка Беларусі перыяду Рэфармацыі і феадальна-каталіцкай рэакцыі (другая палова XVI – сярэдзіна XVIII стст.).

4. Грамадска-палітычная і філасофская думка Беларусі перыяду Асветніцтва (другая палова XVIII ст.).

5. Грамадска-палітычная і філасофская думка Беларусі першай паловы XIX ст.

6. Грамадска-палітычная і філасофская думка Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст.

7. Грамадска-палітычная і філасофская думка Савецкай Беларусі (1919 – 1991 гг.).

8. Грамадска-палітычная і філасофская думка Рэспублікі Беларусь (1991 – пачатак XXI ст.).

Увядзенне хрысціянства спрыяла распаўсюджанню пісьмовай культуры, развіццю культурных сувязей з Візантыяй і краінамі Заходняй Еўропы. Важнай крыніцай грамадска-палітычнай думкі Беларусі з'яўляюцца помнікі агульнаславянскай культуры: «Аповесць мінулых гадоў», «Слова пра паход Ігаравы», «Жыціе Еўфрасінні Полацкай». У XI – XII стст. на беларускіх землях распаўсюджваліся рукапісныя кнігі, хрэстаматыі тэкстаў антычных аўтараў.

Перыяд станаўлення ВКЛ характарызуецца неадназначнымі тэндэнцыямі ў развіцці беларускага грамадства. Усходнеславянская культура, дзякуючы развіццю сваіх цывілізацыйных форм (наяўнасці высокай кніжнай культуры, традыцыі летапісання, кадыфікаванага права), аб'ектыўна займала дамінуючае становішча ў літоўскай дзяржаве. На працягу XV – XVI стст. развівалася кнігадрукаванне, адбываўся інтэлектуальны дыялог з заходнееўрапейскай рэнесанснай культурай. Аднак у гэты ж самы час беларускай эліце даводзілася з цяжкасцю адстойваць свае палітычныя і рэлігійныя правы, развіваўся працэс запрыгоньвання беларускага сялянства.

У другой палове XVI ст. на беларускіх землях распаўсюджваліся ідэі Рэфармацыі. Узнікалі жанры палемічнай публіцыстыкі, прадмоў і пасляслоўяў да біблейскіх тэкстаў, эпіграм, дзённікаў, навуковых трактатаў. Поспехі Рэфармацыі выклікалі жорсткую феадальна-каталіцкую рэакцыю. Пачалі развівацца працэсы акаталічвання і апалячвання беларускага набілітэту. Многія іншадумцы і рэлігійныя дысідэнты вымушаны былі эміграваць з Рэчы Паспалітай, каб пазбегнуць пераследу ўлад і каталіцкай царквы.

У другой палове XVIII ст. выяўляюцца асветніцкія тэндэнцыі. Асветніцкія ідэі адлюстраваны ў творчасці братоў Снядэцкіх і К. Багуслаўскага. Паслядоўнікамі вучэння фізіякратаў з'яўляліся І. Храптовіч, А. Тызенгаўз, І. Страйноўскі. Сінтэз асветніцкіх і рамантычных ідэй адбыўся ў творчасці Л. Бароўскага.

У грамадскай думцы 20 – 40-х гадоў XIX ст. пад уздзеяннем агульнарасійскіх грамадска-палітычных працэсаў выявіліся дзве тэндэнцыі: апалагетыка прыгону (Г. Ржавускі, Ю. Галухоўскі, К. Буйніцкі) і абгрунтаванне неабходнасці яго ліквідацыі (М. Валовіч, Ф. Савіч). У 30 – 40-я гады XIX ст. адбываўся працэс радыкалізацыі грамадскай думкі. Этнічнаму самавызначэнню беларусаў спрыяла творчасць П. Шпілеўскага, Р. Падбярэскага, Я. Баршчэўскага.

Прадстаўніком рэвалюцыйна-дэмакратычнага накірунку ў грамадскай думцы другой паловы XIX ст. быў К. Каліноўскі, выдавец беларускамоўнай газеты «*Мужыцкая праўда*», адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 г. У 1884 г. група беларускіх студэнтаў у Пецярбургу выдала два нумары народніцкага часопісу «*Гоман*», на старонках якога дэкларавалася права Беларусі на аўтаномію ў складзе Расійскай імперыі. У пачатку XX ст. беларускую рэвалюцыйную дэмакратыю прадстаўлялі Цішка Гартны (Жылуновіч), Янка Купала, Якуб Колас, Алаіза Пашкевіч.

У 60 – 90-я гады XIX ст. былі апублікаваны фальклорныя запісы, гістарычныя, краязнаўчыя і этнаграфічныя даследаванні К. Гаворскага, М. Каяловіча, І. Насовіча, Г. Кіпрыяновіча, П. Жуковіча, К. Харламповіча, Ю. Крачкоўскага, Я. Карскага, М. Федароўскага, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, М. Доўнар-Запольскага, М. Янчука, што аб'ектыўна засведчыла факт існавання самастойнага беларускага этнасу.

Значную ролю ў развіцці грамадскай думкі Беларусі адыгралі мясцовыя перыядычныя выданні: «Белорусский вестник», «Вестник Западной России», «Крестьянин», «Минский листок», «Минское русское слово», «Минское слово», «Наша Доля», «Наша Ніва», «Северо-Западная жизнь», «Северо-Западный край». Напярэдадні рэвалюцыі 1905 – 1907 гадоў узнікла адна з першых арганізацый беларускага нацыянальна-вызваленчага руху – народніцкая Беларуская сацыялістычная грамада (1902).

У выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года ўзнікла беларуская савецкая дзяржаўнасць. На працягу 20-х гадоў XX ст. у Беларускай ССР разгортвалася палітыка беларусізацыі. Аднак у 30-я гады Беларусь панесла значныя інтэлектуальныя страты падчас рэпрэсій. У неспрыяльных умовах фарміравалася грамадская беларуская думка на заходніх землях Беларусі ў 1921 – 1939 гады падчас польскай акупацыі і разгортвання палітыкі прымусовай паланізацыі беларускага грамадства.

## 1.2. Крыніцы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі. Гістарыяграфія пытання

Да асноўных тыпаў першакрыніц па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі можна аднесці фальклор, агіяграфію, летапісы, творы рэлігійна-палемічнай літаратуры, помнікі юрыдычнай думкі, творы мастацкай літаратуры, публіцыстыку, эпісталярную спадчыну грамадска-палітычных і культурных дзеячаў, палітычныя трактаты і філасофскія творы.

Першакрыніцы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі шматмоўныя. Яны стваралiся на царкоўнаславянскай, стара-

беларускай, лацінскай, польскай, рускай і беларускай мовах. У апошнія дзесяцігоддзі адбылося навуковае выданне вялікага корпусу помнікаў нацыянальнай думкі («Старажытная беларуская літаратура (XII – XVII стст.)», Мінск, 2007; «Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя», Мінск, 2003; «Беларускія летапісы і хронікі», Мінск, 1997; «Кніга жыцій і хаджэнняў», Мінск, 1994; «Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі», Мінск, 1988; перавыданні творчай спадчыны Ф. Скарыны, С. Полацкага, К. Каліноўскага, факсімільныя выданні газет «Наша доля» і «Наша Ніва»).

Першыя абагульняючыя працы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі з'явіліся ў 30-х гадах XX ст. Гэта былі даследаванні А. Луцкевіча, А. Цвікевіча, Ф. Турука. Плённа развівалася навука ў пасляваенныя гады, калі з'явіліся даследаванні А. А. Біралы, Э. К. Дарашкевіча, У. М. Конана, А. Ф. Коршунава, А. С. Майхровіча, Н. Н. Махнач, С. А. Падокшына, С. Ф. Сокала, В. Ф. Шалькевіча. У 2008 годзе пачалося выданне шматтомнай калектыўнай манаграфіі «Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі».

**Літаратура**

1. Бортнік, І. А. Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі : вучэб.-метад. дапаможнік / І. А. Бортнік. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 118 с.

2. Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / І. У. Вішнеўская. – Мінск : Тэсей, 2004. – 272 с.

3. Козел, А. А. Философская мысль Беларуси / А. А. Козел. – Минск : Амалфея, 2004. – 352 с.

## ТЭМА 2. СВЕТАПОГЛЯДНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ ТРАДЫЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Тэрміны: *анімізм, антрапамарфізм, пантэізм, політэізм, татэмізм, традыцыйная культура, трыкстэр, фальклор, фетышызм.*

1. Характэрныя рысы традыцыйнага светапогляду беларусаў.
2. Уяўленні аб прасторы і часе.

### 2.1. Характэрныя рысы традыцыйнага светапогляду беларусаў

Асаблівасці традыцыйнага беларускага светапогляду маюць як уласна беларускі, так і агульнаславянскі і індаеўрапейскі характар. Беларуская міфалогія і фальклор з'яўляюцца важнымі крыніцамі рэканструкцыі ранніх

агульнаславянскіх і індаеўрапейскіх светапоглядных сістэм. У VI ст. н. э. пачалося фарміраванне айчыннай традыцыйнай культуры і характэрных рыс беларускага традыцыйнага светапогляду. Да прыняцця хрысціянства рэлігійныя перакананні жыхароў беларускіх зямель уключалі элементы *політэізму* (веры ў адначасовае існаванне многіх багоў), *пантэізму* (абагаўлення астранамічных аб’ектаў, зямлі, дрэў, крыніц, камянёў), *анімізму* (пераканання ў існаванні душы і духаў), *антрапамарфізму* (надзялення чалавечымі рысамі прадметаў і з’яў прыроды, жывёл і раслін), *татэмізму* (уяўлення аб паходжанні людзей ад пэўнага віду жывёл, птушак ці раслін), *фетышызму* (веры ў звышнатуральную сілу асобных прадметаў, слоў), *магіі*. Традыцыйнаму светапогляду ўласцівы *касмалагізм* і *міфалагізм,* адсутнасць лінейнага бачання гісторыі і канцэпцыі сацыяльнага прагрэсу. Традыцыйная свядомасць была *сінкрэтычнай* і *дыфузнай* – зближаліся паняцці прасторы і часу, словы і прадметы, якія яны азначаюць; прычына і вынік амаль не адасабляліся. Мысленне характарызавалася метафарычнасцю і наяўнасцю бінарных апазіцый (катэгорый супрацьпастаўлення): дзень – ноч, правае – левае, мужчынскае – жаночае і інш.[1; 2]

Беларускай традыцыйнай культуры ўласціва рацыянальнасць. Рацыянальны прынцып блізкі і для айчыннага іканапісу, і для архітэктуры. Напрыклад, беларуская гатычная архітэктура, у адрозненне ад заходнееўрапейскіх узораў, сваімі прапорцыямі суразмерная чалавеку. У айчынных казках пераважаюць бытавыя сюжэты, персанажы беларускай міфалогіі галоўным чынам існуюць сярод людзей[3].

## 2.2. Уяўленні аб прасторы і часе

Народнае ўяўленне аб прасторы і часе фарміравалася найперш пад уплывам прыродна-геаграфічнага фактару. У беларускіх фальклорных тэкстах найчасцей згадваюцца распаўсюджаныя архетыпы мясцовай прыроды – лес, балота, поле. Для абазначэння прасторавых паняццяў часта выкарыстоўваюцца словы з перыферычным значэннем – край, старана. Час успрымаўся як незваротнае «цячэнне», якое «праходзіць», «сплывае». Нашым продкам была ўласціва моцная прывязанасць да родных мясцін. Любоў да

[1] Топоров, В. Н. Значение белорусского ареала в этногенетических исследованиях / В. Н. Топоров // Славяне: адзінства і мнагастайнасць: тэзісы дакладаў і паведамленняў Міжнароднай канферэнцыі (Мінск, 24 – 27 мая 1990 г.). – Секцыя 2: Этнагенез славян. – Мінск, 1990. – С. 87 – 90.
[2] Зайкоўскі, Э. Касмалагічныя ўяўленні старажытнага насельніцтва Беларусі / Э. Зайкоўскі // Гістарычна-археалагічны зборнік памяці Міхася Ткачова. У 2 ч. Ч. 1. – Мінск, 1993. – С. 79 – 93.
[3] Конан, У. Біблейскія і хрысціянскія матывы / У. Конан // Наша вера [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://media.catholic.by/nv/n11/art12.htm. – Дата доступа: 24.12.2011.

роднай вёскі, хаты супрацьпастаўлялася пачуццю адчужанасці ў знешнім свеце («Родная зямля – маці, чужая старонка – мачаха»). Беларускія фальклорныя творы XIX ст. сведчаць аб атаясамленні паняццяў «Радзіма» і «родны кут» [4; 5].

Беларускі народны каляндар уключае святы і прысвяткі. Большасць дзён года мае асобную назву, адпаведныя абрады, гульні. Назвы месяцаў былі звязаны з пэўнымі прыродна-кліматычнымі асаблівасцямі. Найбольшая колькасць беларускіх прыказак і прымавак прысвечана вясне, найменшая – восені. Кожнаму сезону адпавядаюць свае святы. Са святамі былі звязаны народныя прыкметы, гаспадарчыя назіранні. Розныя віды працоўнай дзейнасці і адпачынку прымяркоўваліся да святочных дзён («Барыс – за саху бярысь», «Па Міколі не сей аўса ніколі»)[6].

**Крыніцы**

1. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / скл. Ф. Янкоўскі; прадм. Д. Бугаева. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 493 с.

2. Беларускі фальклор: Хрэстаматыя: вучэб. дапаможнік для філалагічных факультэтаў ВНУ / склад. К. П. Кабашнікаў [і інш.]. – 4-е выд., перапрац. – Мінск : Вышэйшая школа, 1996. – 856 с.

3. Богданович, А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: Этнографический очерк / А. Е. Богданович. – Минск : Беларусь, 1995. – 186 с.

4. Янкоўскі, Ф. Беларускія народныя параўнанні: кароткі слоўнік / Ф. Янкоўскі. – Мінск : Вышэйшая школа, 1973. – 237 с.

**Літаратура**

1. Анисимов, А. Ф. Духовная жизнь первобытного общества / А. Ф. Анисимов. – М.–Л. : Наука, 1966. – 244 с.

2. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1: А капэла – Куцця / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш]. – Мінск : БелЭН імя П. Броўкі, 2005. – 768 с.

3. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: у 2 т. Т. 2: Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – «Яшчур» / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш]. – Мінск : БелЭН імя П. Броўкі. – 832 с.

4. Валодзіна, Т. В. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. В. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 1999. – 167 с.

5. Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии / редколл.: К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 479 с.

---

[4] Санько, С. Штудыі з кагнітыўнай і кантрастыўнай культуралёгіі / С. Санько. – Менск : БГАКЦ, 1998. – С. 96 – 128.

[5] Казакова, І. В. Беларускі фальклор: вучэб. дапам. / І. В. Казакова. – Мінск : выд. цэнтр БДУ, 2007. – С. 42.

[6] Васілевіч, У. Беларускі народны каляндар / У. Васілевіч // Паэзія беларускага земляробчага календара / склад. А. С. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – С. 554.

6. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад. А. І. Гурскага. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 427 с.
7. Конан, У. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / У. Конан. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 237 с.
8. Развитие этнического самосознания славянских народов в эпоху раннего средневековья / отв. ред. В. Д. Королюк. – М. : Наука, 1982. – 360 с.
9. Трубачев, О. Н. Этногенез и культура древнейших славян / О. Н. Трубачев. – 2-е изд., доп. – М. : Наука, 2003. – 489 с.

# ТЭМА 3. САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ ЗАРАДЖЭННЯ І РАЗВІЦЦЯ ФІЛАСОФСКАЙ ДУМКІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Тэрміны: *монатэізм, рэлігійны сінкрэтызм, праваслаўе, Сусветнае Дрэва, язычніцтва.*

1. Асаблівасці хрысціянізацыі беларускіх зямель.
2. Рэлігійны сінкрэтызм у беларускай традыцыйнай культуры.

## 3.1. Асаблівасці хрысціянізацыі беларускіх зямель

Славянскія народы на працягу X стагоддзя пачалі прымаць хрысціянства. Маравы былі ахрышчаны каля 800 года. У 964 годзе хрысціянства прыняла Балгарыя, у 966 годзе – Польшча, у 973 годзе – Чэхія. Паводле паведамлення ісландскай «Сагі пра Хрост», у Полацку ў канцы X стагоддзя хрысціянскае вучэнне пашыраў скандынаўскі місіянер Торвальд Вандроўнік (Thorvald Kodransson). Тут быў пабудаваны храм і манастыр Іаана Хрысціцеля. Памёр Торвальд у Полацку каля 1000 г. Каля 1050 г. Полацк наведаў вікінг Бранд. Па сведчанні Бранда, палачане шанавалі Торвальда як святога[7]. У 988 г. вялікі князь кіеўскі Уладзімір прызнаў сябе васалам імператара Візантыі Васіля II, ажаніўся з сястрой імператара і пачаў уводзіць хрысціянства на землях Кіеўскай Русі. Гэтыя падзеі адбываліся да расколу хрысціянства (1054). Першая на беларускіх землях епархія была ўтворана ў Полацку каля 992 г. пры князю Ізяславе. Першым вядомым з летапісаў полацкім уладыкам быў епіскап Міна, прызначаны на кафедру ў 1105 г. Другой на тэрыторыі Беларусі была Тураўская епархія, заснаваная ў 1005 г. Яе першым уладыкам быў епіскап Фама[8].

[7] Катлярчук, А. Місія Торвальда Вандроўніка, або Скандынаўскія пачаткі хросту Беларусі / А. Катлярчук // [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://www.bielarus.org/open.php?n=528&a=3. – Дата доступа: 24.12.2011.
[8] Мельников, А. А. Путь непечален. Исторические свидетельства о святости Белой Руси / А. А. Мельников. – Минск : Белорусской Православной Церкви Московского Патриархата, 1992. – С 18.

Хрысціянізацыя першапачаткова ахапіла вышэйшыя слаі гарадскога насельніцтва Полацкай зямлі і Турава-Пінскага княства. У Панямонні язычніцкія анклавы існавалі да XVII стагоддзя. У IX – XI стст. узмацніліся культурныя сувязі паміж беларускімі землямі і Візантыяй. Дзякуючы дзейнасці асветнікаў Кірыла і Мяфодзія, распрацоўцы імі ў 863 г. кірылічнага алфавіту, узнікла старажытнаславянская пісьмовая культура. Пра біблейскую рукапісную традыцыю ў Беларусі сведчаць ілюстраваныя рукапісныя Евангеллі XI – XVI стст. (Тураўскае, Аршанскае, Полацкае, Друцкае, Лаўрышаўскае, Мсціжскае, Жыровіцкае, Шаршоўскае).

### 3.2. Рэлігійны сінкрэтызм у беларускай традыцыйнай культуры

З канца X ст. у беларускай традыцыйнай культуры назіраўся язычніцка-хрысціянскі сінкрэтызм – спалучэнне язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў. Тэрмін *«язычніцтва»* ўзыходзіць да царкоўнаславянскага слова «языцы» – «народы». Усходнеславянскія аўтары называлі язычнікамі не толькі нехрысціянскіх суседзяў праваслаўнай Русі, але і сваіх продкаў, якія не ведалі хрысціянства. У лацінскай мове тэрміну «язычнік» адпавядае паняцце *«paganus»*, якое азначала нехрысціян-жыхароў сельскай мясцовасці.

На працягу IX – XIII стст. у народнай культуры адбываўся сінтэз элементаў язычніцкай і хрысціянскай веры. У асобных фальклорных творах прысутнічаюць як язычніцкія, так і хрысціянскія матывы. Да некаторых народных святаў царква прымеркавала хрысціянскія ўрачыстасці (Купалле, Масленіца). Хрысціянскія святыя перанялі «функцыі» язычніцкіх багоў: св. Ілля – Перуна, св. Улас – Вялеса, Іаан Хрысціцель – Купалы, св. Юры – Ярылы. Біблейскія сюжэты набылі ў Беларусі спецыфічную інтэрпрэтацыю. Паводле народных вераванняў, хрышчэнне ёсць ачышчэнне ад першароднага граху, а Купалле – ачышчэнне вадою і агнём ад хваробаў. Амбівалентны (дваісты) характар вады (паглынанне і адраджэнне) выявіўся ў апазіцыі «жывой» і «мёртвай» вады. Евангельскі эпізод пра ўваскрашэнне Лазара мае аналогію ў народным сюжэце ўваскрашэння героя пры дапамозе жывой вады. Пад уплывам біблейскага вобраза Д'ябла-Змея адбылася трансфармацыя Змяінага Цара ў сімвал спакусы. Спазнаў хрысціянскі ўплыў і яшчэ адзін міфалагічны архетып – *Сусветнае Дрэва* – канцэпцыя Космасу, падзеленага на тры зоны – Неба (шаты), Зямля (ствол), Апраметная (карэнні)[9].

---

[9] Конан, У. Біблейскія і хрысціянскія матывы / У. Конан // Наша вера [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://media.catholic.by/nv/n11/art12.htm. – Дата доступа: 24.12.2011.

**Крыніцы**

1. Чарадзейныя казкі. У 2 ч. Ч. 1 / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы; склад. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]; уступ. арт. К. П. Кабашнікава. – 2-е выд., выпраўл. і дапр. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 639 с. – (Беларуская народная творчасць).

2. Чарадзейныя казкі. У 2 ч. Ч. 2 / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы; склад. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]; уступ. арт. К. П. Кабашнікава. – 2-е выд., выпраўл. і дапр. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 691 с. – (Беларуская народная творчасць).

**Літаратура**

1. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т. Т. 1: Эпоха Сярэднявечча / В. Б. Евароўскі [і інш.]; рэдкал.: В. Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – 573 с.

2. Клибанов, А. И. Духовная культура средневековой Руси / А. И. Клибанов. – М. : Аспект Пресс, 1996. – 368 с.

3. Лихачев, Д. С. Развитие русской литературы X – XVII веков / Д. С. Лихачев. – СПб. : Наука, 1999. – 3-е изд. – 204 с.

4. Языкович, В. Р. Православные ценности и традиционная белорусская культура / В. Р. Языкович, К. В. Языкович // XII Международные Кирилло-Мефодиевские чтения [Электронный ресурс]. – 2011. – Режим доступа: http://www.inst.by/basis/publ/XII2-15.pdf. – Дата доступа: 09.08.2011.

# ТЭМА 4. АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ФІЛАСОФСКІХ ПОШУКАЎ У БЕЛАРУСІ Ў IX – XIII СТСТ.

Тэрміны: *агіяграфія, звычаёвае права.*

1. Прававыя звычаёвыя нормы як крыніца маральна-этычных уяўленняў.
2. Грамадска-палітычныя погляды Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Кліменція Смаляціча.
3. Эстэтычныя ўяўленні ў старажытнабеларускай літаратуры (IX – XIII стст.).

## 4.1. Прававыя звычаёвыя нормы як крыніца маральна-этычных уяўленняў

У сістэме маральна-этычных і прававых адносін беларускага насельніцтва існавалі старадаўнія формы прававых звычаёвых норм. У маральна-прававой сферы нормы звычаёвага права працягваюць панаваць да нашага часу. У раннесярэднявечны перыяд многія прававыя адносіны, якія не былі фіксаваны пісьмова, грунтаваліся на звычаі. Новыя звычаі маглі замацоў-

вацца за два-тры пакаленні. Звычай фарміраваўся ў выглядзе забароны або дазволеных ці абавязковых паводзін. Некаторыя звычаі трансфармаваліся ў прававую норму[10].

Звычаі («звыкласць», «старына», «даўніна») рэгулявалі прававую сферу гаспадарча-вытворчых, спадчынна-маёмасных, шлюбна-сямейных адносін. Нормы звычаёвага права вызначалі вытворча-эканамічныя і маральна-этычныя паводзіны кожнага ў сферы дзяржаўных, саслоўных, канфесіянальных і сямейных адносін. Звычай з'яўляўся юрыдычна-прававой і маральна-этычнай нормай на беларускіх землях у пытаннях вясковага, міжсямейнага і ўнутрысямейнага побыту. Рэгіяналізм норм звычаёвага права спалучаўся з кансерватызмам прававой свядомасці. Меркавалася, што ў свеце пануе назаўсёды ўстаноўлены Богам нязменны парадак. Мадэрнізацыя прававой сістэмы разглядалася як ашуканства Бога. Пэўны час прынцып «навіны не ўводзіць» задавальняў усе сацыяльныя колы грамадства, у той час як пісанае права фармулявалася ў вузкасаслоўных інтарэсах шляхты без уліку патрэб сялянства і мяшчанства. Таму ў народным асяроддзі назіралася супрацьпастаўленне традыцыйных звычаяў дзяржаўнаму праву[11].

Першыя запісы звычаёвага права былі зроблены ў граматах і дагаворах Полацка, Віцебска і Смаленска з Рыгай і Лівонскім ордэнам XIII – XIV стст. Дадзеныя граматы рэгулявалі парадак куплі-продажу, перавозкі тавараў, гандлёвых пошлін на падставе мясцовага звычаёвага права. У Полацку многія нормы старажытнага права працягвалі захоўвацца і пазней. Засталося права вырашаць важнейшыя пытанні гарадскога і земскага жыцця на агульным сходзе («вечы», «радзе») мяшчан і баяр. За палачанамі захоўвалася мяшчанскае землеўладанне, забарона на судовае разбіральніцтва над палачанамі па-за межамі Полацкай зямлі. Ваявода Полацкай зямлі прызначаўся са згоды палачан і абавязаны быў у першы дзень «крест целовати к полочаном». Ваявода пры разглядзе спраў па зямельных спрэчках абавязаны быў вырашаць іх сумесна «с старшими бояры полоцкими подлуг давнего обычая». Значнымі маёмаснымі правамі карысталіся жанчыны. Рашэнні і прысуды, вынесеныя ў Полацкай зямлі, не пераглядаліся ў вышэйшых судах дзяржавы. Аднак многія з рэгіянальных норм, якія дэкларавaліся земскімі прывілеямі для Полацка, не выконваліся ўладамі ВКЛ; гэта датычыць, напрыклад, нормы прызначэння ваяводы. Пэўныя

---

[10] Штыхаў, Г. Звычаёвае права, закон і суд / Г. Штыхаў. // [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://jivebelarus.net/for-pupils-and-students/history-of-belarus-medieval-period/customary-law-and-justice.html#lnk2. – Дата доступа: 09.08.2011.

[11] Бардах, Ю. Звычаёвае шлюбнае права русінаў Вялікага Княства Літоўскага (XV – XVII ст.) / Ю. Бардах // Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / пер. з пол. М. Рамаонўскага і А. Істоміна. – Мінск : Бібліятэка часопіса «Беларускі Гістарычны Агляд», 2002. – С. 199.

нормы звычаёвага права Полацкай зямлі былі замацаваны ў земскіх і гарадскіх прывілеях і выкарыстаны пры падрыхтоўцы Судзебніка Казіміра (1468) і Статутаў ВКЛ (1529, 1566 і 1588)[12].

### 4.2. Грамадска-палітычныя погляды Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Кліменція Смаляціча

Дзейнасць *Еўфрасінні Полацкай* (каля 1101 – 23 або 25.05.1167) была накіравана на дасягненне маральнай і духоўнай дасканаласці народа Полацкай зямлі. Асветніца займалася дабрачыннасцю, спрыяла школьнай асвеце, маральнаму і эстэтычнаму выхаванню дзяўчат. Еўфрасіння Полацкая выказвалася за змякчэнне княжацкай улады, заклікала дапамагаць бедным, хворым і старым людзям. У «*Жыціі Еўфрасінні Полацкай*» ствараецца ідэал духоўнай і фізічнай прыгажосці чалавека. Аўтар жыція ўкладвае ў вусны сваёй гераіні словы аб часовым характары фізічнай прыгажосці і аб «нетленности» прыгажосці самаахвярнасці. Еўфрасіння Полацкая – прыхільніца хрысціянскай ідэі міру. У «Жыціі» гаворыцца, што яна «не хацела бачыць, каб хто варагаваў: ні князь з князем, ні баярын з баярынам, ні з простых хто са сваім сябрам». Асветніца складала і, магчыма, запісвала малітвы і дыдактычныя пропаведзі. Еўфрасіння Полацкая заснавала ў Полацку жаночы св. Спаса, а таксама мужчынскі манастыры, якія зрабіліся цэнтрамі асветы Полацкага княства. У 1984 г. Еўфрасіння Полацкая прылічана да Сабора Беларускіх Святых[13].

*Клімент Смаляціч* нарадзіўся ў Смаленску ў першай палове XII ст., вучыўся ў Канстанцінопалі. У 1147 г. кіеўскі князь Ізяслаў Мсціслававіч узвёў Клімента Смаляціча ў сан кіеўскага мітрапаліта без благаславення канстанцінопальскага патрыярха. Клімент Смаляціч быў прыхільнікам незалежнасці мясцовай царквы ад Візантыі. Вядомы змест толькі аднаго яго твора – *«Послание к Фоме пресвитеру».* «Пасланне» Клімента Смаляціча сведчыць аб уплывах палітычных ідэй антычнасці на фарміраванне палітычнай думкі Кіеўскай Русі.

*Кірыла Тураўскі* (каля 1130 – 1182) – пісьменнік, прапаведнік, царкоўна-палітычны дзеяч, нарадзіўся ў Тураве ў заможнай мяшчанскай сям'і, амаль да канца сваіх дзён займаў у родным горадзе епіскапскую кафедру. Кі-

---

[12] Чаквін, І. У. Этнасацыяльная гісторыя Беларусі ў XIV – XVI стст. Этнаўтваральныя фактары працэсу фарміравання народнасці / І. У. Чаквін // Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / В. К. Бандарчык, І. У. Чаквін [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – С. 68 – 70.

[13] Мельнікаў, А. А. Ефрасіння Полацкая / А. А. Мельнікаў // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – С. 109.

рылу Тураўскага сучаснікі называлі «другім Златавустам»; у XII – XVI стст. яго тэксты ўключаліся ў папулярныя рукапісныя зборнікі разам з творамі айцоў царквы. У 1596 г. выйшаў першы друкаваны збор твораў Кірылы Тураўскага. Захавалася восем словаў-пропаведзей, некалькі прытчаў, два каноны, каля 30 малітваў, аўтарства якіх належыць Кірылу Тураўскаму. Грамадска-палітычныя погляды аўтара выяўлены ў *«Прытчы пра чалавечую душу і цела»*, альбо *«Прытчы пра сляпога і кульгавага»*, у якой Кірыла Тураўскі выступаў супраць сепаратысцкай палітыкі ўладзіміра-суздальскага князя Андрэя Багалюбскага і растоўскага епіскапа Фёдара[14].

Усходнеславянская філасофская культура фарміравалася на ўзорах перакладной і арыгінальнай літаратуры («Ізборнікі Святаслава», сачыненні Псеўда-Дзіянісія Арэапагіта, «Дыялектыка» Іаана Дамаскіна, «Дзіоптра» Піліпа Пустынніка, зборнікі афарызмаў «Пчала» і «Ізмарагд», «Слова аб законе і боскай ласцы» Іларыёна, «Павучанне» Уладзіміра Манамаха, «Словы» Кірылы Тураўскага, «Маленне» Данііла Заточніка», «Жыціе Аляксандра Неўскага», «Аповесць мінулых гадоў», «Фізіялог», шасцідневы, палеі, хронікі, касмаграфія Касьмы Індыкаплава, апокрыфы). Вядомыя былі на беларускіх землях «Александрыя», «Траянскія дзеі», «Святая святых, ці Арыстоцелева брама». Аўтарытэтам карысталіся творы Псеўда-Дзіянісія Арэапагіта. У старажытнарускай філасофскай культуры вызначыліся дзве тэндэнцыі: ірацыяналістычна-неаплатанічная і рацыяналістычна-арыстоцелеўская (прадстаўленая творамі Іаана Дамаскіна, «Ізборнікам Святаслава» 1073 г.). Праваслаўная рэлігійна-філасофская традыцыя грунтавалася на вобразна-сімвалічным, эмацыянальна-эстэтычным спосабе пазнання[15].

## 4.3. Эстэтычныя ўяўленні ў старажытнабеларускай грамадскай думцы (IX – XIII стст.)

Асноўнай крыніцай сярэднявечных эстэтычных канцэпцый была Біблія і вучэнне айцоў царквы. Побач з хрысціянскай развівалася народная і раннефеадальная свецкая эстэтыка. Беларускія землі зазналі ў першую чаргу ўплыў візантыйскай эстэтыкі. Асноўнай праблемай візантыйскай эстэтыкі было пытанне аб суадносінах мастацтва і рэлігіі. Для візантыйскай

[14] Мельнікаў, А. А. Кірыла Тураўскі / А. А. Мельнікаў, В. А. Чамярыцкі // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – С. 160.

[15] Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст. У 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII ст. / рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – С. 16 – 27.

эстэтыкі было характэрным спалучэнне антычных, раннехрысціянскіх і ўсходнеазіяцкіх традыцый. Сутнасць прыгажосці ў візантыйскай эстэтыцы бачылася ў гармоніі і інтэнсіўнасці элементаў (яркасць святла, ззянне самацветаў і каштоўных металаў, чыстыя насычаныя колеры). Усходнія традыцыі пышнасці, інтэнсіўнасці святла і колеру, манументальнасці форм, урачыстасці літургіі рабілі акцэнт на пачуццёвы эфект. Усходнеславянская народная эстэтыка мае падобныя ўяўленні аб прыгажосці як аб тым, што ззяе (сонца, золата). У хрысціянскай сярэднявечнай эстэтыцы прысутнічае і сімвалічная трактоўка прыгажосці[16].

Пропаведзі Кірылы Тураўскага з'яўляюцца ўзорам усходнеславянскага прамоўніцкага мастацтва. Паэтычны элемент у іх часам пераважаў над царкоўным дыдактызмам. Для светапогляду Кірылы Тураўскага характэрна пазітыўнае стаўленне да прыгажосці фізічнага свету. Аднак ён ставіў матэрыяльную прыгажосць ніжэй за духоўную[17].

«*Слова пра паход Ігаравы*» (канец XII ст.) прасякнута фальклорнымі матывамі. Твор з'ўляецца прыкладам вобразнага ўспрымання эстэтычнага ў прыродзе і чалавечым жыцці. Крыніцай «Слова» быў народны ўсходнеславянскі гераічны эпас.

Хрэстаматыя «*Пчала*» складаецца з фрагментаў Святога пісання, выслоўяў айцоў царквы і антычных аўтараў. У трактоўцы эстэтычных паняццяў у «Пчале» выяўляюцца хрысціянская аскетычная эстэтыка і антычнае вучэнне аб меры як крытэрыі прыгажосці[18].

**Крыніцы**

1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры, XI – першая палова XVIII стагоддзя / навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 1015 с.

2. Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў горадзе Полацку. Блаславі, Ойча! // Кніга жыцій і хаджэнняў / уклад. А. А. Мельнікава. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – С. 42 – 57.

3. Аповесць пра Усяслава Полацкага // Старабеларуская літаратура XI – XVIII стст.: Хрэстаматыя / уклад., прадм. Г. Твaрановіч. – Беласток : Wyd-wo Uniwersytet w Bialymstoku, 2004. – 772 с.

4. Памятники общественной мысли Древней Руси. Т. I – III / И. Н. Данилевский (отв. ред.). – М. : РОССПЭН, 2010.

[16] Дорошевич, Э. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э Дорошевич, В. Конон. – М. : Искусство, 1972. – С. 22 – 25.
[17] Тамсама. – С. 27 – 29.
[18] Тамсама. – С. 31 – 33.

5. Переводные памятники философской мысли в Древней Руси: [Сб. ст.] / М. Н. Громов (отв. ред.). – М. : ИФРАН, 1992. – 205 с.

6. Творы Кірылы Тураўскага // Кірыл, епіскап Тураўскі: Жыццё, спадчына, светапогляд / А. А. Мельнікаў. – Мінск : Бел. навука, 2000. – С. 251 – 452.

**Літаратура**

1. Бондарь, С. В. Философско-мировоззренческое содержание «Изборников» 1073 – 1076 годов / С. В. Бондарь. – Киев : Наук. думка, 1990. – 149 с.

2. Будовниц, И. У. Общественно-политическая мысль Древней Руси (XI – XIV вв.) / И. У. Будовниц. – М. : изд-во АН СССР, 1960. – 488 с.

3. Горский, В. С. Философские идеи в культуре Киевской Руси XI – начала XII в. / В. С. Горский. – Киев : Наук. думка, 1988. – 215 с.

4. Громов, М. Н. Русская философская мысль X – XVII вв. / М. Н. Громов, Н. С. Козлов. – М. : изд-во МГУ, 1990. – 285 с.

5. Громов, М. Н. Идейные течения древнерусской мысли / М. Н. Громов. – СПб : изд-во Рус. Христиан. гуманитар. ин-та, 2001. – 959 с.

6. Еворовский, В. Б. Философская мысль Киевской Руси XI – XIII вв.: Тенденции становления / В. Б. Еворовский. – Минск : Тэхналогія, 1996. – 124 с.

7. Замалеев, А. Ф. Мыслители Киевской Руси / А. Ф. Замалеев, В. А. Зоц. – Киев : Вища шк., изд-во при Киев. гос. ун-те, 1987. – 181 с.

8. Замалеев, А. Ф. Отечественные мыслители позднего средневековья, конец XIV – первая треть XVII в. / А. Ф. Замалеев. – Киев : Лыбидь, 1990. – 171 с.

9. Философские и богословские идеи в памятниках древнерусской мысли / М. Н. Громов (отв. ред.). – М. : Наука, 2000. – 375 с.

# ТЭМА 5. АЙЧЫННАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І ФІЛАСОФСКАЯ ДУМКА Ў ПЕРЫЯД СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ

Тэрміны: *Евангелле-апракас*, *ісіхазм.*

1. Усходнеславянскі ўплыў на фарміраванне кніжнай культуры ВКЛ.
2. Дзейнасць Грыгорыя Цамблака.

## 5.1. Усходнеславянскі ўплыў на фарміраванне кніжнай культуры ВКЛ

У 1316 (ці 1317) годзе канстанцінопальскі патрыярх Іаан Гліка прызначыў для ВКЛ асобнага мітрапаліта. Мітрапаліт Феафіл размясціў сваю кафедру ў Наваградку. Першы раз мітраполія праіснавала да смерці Феафіла (каля 1330 г.). Альгерд аднавіў барацьбу за мітраполію і паспрабаваў захапіць кіеўскую кафедру. Паводле Хронікі Быхаўца (XVI ст.), Альгерд прыняў праваслаўе яшчэ ў маладосці, быў двойчы жанаты з праваслаўнымі

ўсходнеславянскімі князёўнамі. Разам з тым, яму прыпісваюць расправу над праваслаўнымі «трыма літоўскімі пакутнікамі» ў 1347 годзе, а таксама пакаранне смерцю 500 віленскіх мяшчан за забойства сямі францысканцаў.

Да эпохі Гедыміна і Альгерда належыць ілюмінаванае напрастольнае Евангелле (Лаўрышаўскае). Кніга датуецца пачаткам ці першай паловай XIV ст. і знаходзіцца ў бібліятэцы імя Чартарыйскіх у Кракаве. Даследчыкі пачатку XX ст. бачылі ў мове помніка рысы з паўночна-ўсходняй Беларусі, у найноўшай літаратуры падкрэсліваюцца яго паўднёварускія карані. Лаўрышаўскае Евангелле ўяўляе тып поўнага *апракасу* (лекцыянару), г.зн. змяшчае богаслужбовыя евангельскія чытанні на кожны дзень года, апроч шасці тыдняў Вялікага посту, для якіх прыводзяцца толькі суботнія і нядзельныя тэксты. У малюнках Лаўрышаўскага Евангелля прыкметны сувязі з паўночнарускім мастацтвам. Раёны Заходняй і Паўднёвай Беларусі знаходзіліся ў гэты час таксама пад значным культурным уплывам Галіцкай Русі. У мове Евангелля з Каўрова (поўны апракас XIV ст. са збораў Пушкінскага Дома) прысутнічаюць агульныя заходнерускія рысы. Памянёны ў старэйшай (канец XIV ст.) прыпісцы на кнізе «Святы Спас на востраве» ўказвае на адзін з храмаў вядомага Полацкага Прадцечанскага «на востраве» манастыра і, значыць, на бытаванне там гэтай кнігі ўжо ў XIV ст. Друцкае Евангелле-апракас было перапісана для друцкай царквы Багародзіцы ў XIV ст. Праз сто гадоў Друцкі кодэкс быў укладзены ў віленскую царкву Уваскрэсення Хрыстовага[19].

## 5.2. Дзейнасць Грыгорыя Цамблака

Грыгорый Цамблак паходзіў з вядомага балгарскага роду, адукацыю атрымаў у Тырнаўскім манастыры Святой Тройцы. У перыяд турэцкага нашэсця на Балгарыю з 80-х гадоў XIV ст. Г. Цамблак быў вымушаны пакінуць радзіму. 15 лістапада 1415 г. у Навагародку на саборы праваслаўных іерархаў ВКЛ без згоды Канстанцінопаля Г. Цамблак быў пастаўлены на мітраполію «Киева и всея Руси». Пасля 1416 г., калі Кіеў быў разбураны ханам Эдыгеем, мітрапаліцкая кафедра была перанесена Г. Цамблакам у Вільню. Сваёй рэзідэнцыяй ён зрабіў Наваградак. У 1418 г. на чале дэлегацыі з ВКЛ, Ноўгарада, Малдавіі і Вялікай Арды Г. Цамблак прымаў удзел у XVI Канстанцкім саборы каталіцкай царквы. Ён прапанаваў склікаць сабор аб веры для паразумення католікаў і праваслаўных. Аднак гэтая прапанова была адхілена. У 1419 г. Г. Цамблак памёр у Вільні. Паводле іншых

[19] Николаев, Н. Начала книжной культуры Великого княжества Литовского. (Эпоха Гедимина и Ольгерда) / Н. Николаев // Фёдоровские чтения 2005. – М., 2005. – С. 443 – 464.

звестак, ён заняў мітрапаліцкую кафедру ў адным з малдаўскіх манастыроў пад імем Гаўрыіла (памёр пасля 1452).

Светапогляд Г. Цамблака сфарміраваўся на перакрыжаванні паўднёваславянскай і ўсходнеславянскай літаратурных традыцый. Г. Цамблак абапіраўся на вопыт антычных рытараў – Рамана Сладкапеўца, Грыгорыя Вялікага, Іаана Дамаскіна, Іаана Златавуста – і быў паслядоўнікам вучэння *ісіхазму*, якое развівалася ў XIV ст. у Візантыі. У дадзеным вучэнні выяўлялася цікавасць да індывідуальных перажыванняў чалавека. Паслядоўнікі вучэння лічылі, што шляхам маральнага ўдасканалення чалавек пры жыцці можа зліцца з Богам. Галоўнай мэтай ставілася ўдасканальванне чалавечай асобы. Ісіхасты лічылі, што таямніцу свету немагчыма зразумець з дапамогай толькі логікі. Свае творы яны рабілі метафарычнымі. Асноўным прынцыпам арганізацыі тэксту з’яўляўся паўтор, на аснове якога гучала скразная тэма. Паўтараліся «ключавыя» словы, важныя для разумення тэксту. Дадзенаму стылістычнаму прыёму ўласцівы складаны сінтаксіс[20].

Грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць мітрапаліта працягвалася ў ВКЛ да 1419 г. Г. Цамблак увёў у беларускіх храмах балгарскі распеў. На беларускай зямлі ім было створана пятнаццаць твораў розных жанраў – пахвалы святым гістарычным асобам («Слова пахвальнае Дзімітрыю»), пропаведзі («Слова на Узнясенне», «Слова на Успенне Багародзіцы», «Слова на Узвіжанне», «Слова наПератварэнне»), палемічны твор («Слова, як трымаюць веру немцы»), прамовы («Спавяданне веры», «Слова пахвальнае бацькам Канстанцкага сабору», «Прывітальная прамова Марціну V»), духоўны верш («На Успенне Багародзіцы»), дзелавыя дакументы («Акруговае пасланне літоўскага вялікага князя Вітаўта», «Саборная грамата епіскапаў»). Пропаведзі на царкоўныя святы, прамоўленыя ў Наваградку, складаюцца з рытмічна пабудаваных стылістычных перыядаў. Рытмічныя варыяцыі дазваляюць вяртацца да асноўнай тэмы, якая пры гэтым паглыбляецца. «Слова наПератварэнне» мае кальцавую кампазіцыю (пачынаецца і заканчваецца гімнам). У Бібліі Г. Цамблак знаходзіў тэмы, матывы і сродкі мастацкай выразнасці. У «Слове на Узнясенне Ісуса Хрыста» цытаты з біблейскіх кніг выконваюць ролю стылістычнага і сэнсавага цэнтра. Творы Г. Цамблака перапісваліся праваслаўнымі манахамі Супрасльскага, Слуцкага Свята-Траецкага, Жыровіцкага, Аршанскага, Лаўрышаўскага манастыроў на працягу XV – XIX стст.[21]

[20] Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст. У 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII ст. / рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – С. 221 – 232.

[21] Казакова, Т. П. Жыццёвы і творчы шлях Грыгорыя Цамблака / Т. П. Казакова. [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://www.bsu.by/Cache/pdf/254463.pdf. – Дата доступа: 09.08.2011.

**Крыніцы**

1. Беларускія летапісы і хронікі / укл. У. Арлоў. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 432 с.

2. Мемарыял Вітаўта / публ. А. Ліцкевіча // Беларуская думка. – 2009. – № 2. – С. 93 – 96.

3. Цамблак, Г. Слова пахвальнае Яўфімію Тырнаўскаму / Г. Цамблак // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII ст. / В. А. Чамярыцкі (нав. рэд.). – Мінск : Беларуская навука, 2003. – С. 228 – 232.

**Літаратура**

1. Голенченко, Г. Я. Исторические знания в XIV – XVIII вв. // Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. / П. Т. Петриков, Д. В. Карев, А. А. Гусак [и др.]. – Минск, 1996. – С. 14 – 23.

2. Котлярчук, А. Православная церковь в Великом княжестве Литовском / А. Котлярчук // Вестник Белорусского православного экзархата. – Т. 1. – Минск, 1998. – С. 7 – 25.

3. Міраповіч, А. Праваслаўная Беларусь / А. Міраповіч. – Беласток : Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2009. – 352 с.

4. Нікалаеў, М. Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1: Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М. Нікалаеў. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2009. – 424 с.

5. Пашуто, В. Т. Древнерусское наследие и исторические судьбы восточного славянства / В. Т. Пашуто, Б. Н. Флоря, А. Л. Хорошкевич. – М., 1982. – 263 с.

6. Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – 368 с.

7. Чамярыцкі, В. А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры / В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 191 с.

# ТЭМА 6. ПЕРАДУМОВЫ СТАНАЎЛЕННЯ ФІЛАСОФСКАЙ КУЛЬТУРЫ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ Ў БЕЛАРУСІ

Тэрміны: *брацкія школы, праваслаўныя брацтвы, Рэнесанс, універсітэт.*

1. Крыніцы рэнесанснай культуры.
2. Праблема захавання нацыянальнай мовы і традыцый.

## 6.1. Крыніцы рэнесанснай культуры

*Рэнесанс* (ад фран. *renaissance* – «адраджэнне») – грамадска-палітычны і культурны рух, які пачаўся ў Італіі і ахапіў у XV – XVI стст. шэраг еўрапейскіх краін. Тэрмін упершыню ўжыў італьянскі гісторык культуры *Джорджа Вазары* (1512 – 1574), які пазначаў ім перыяд італьянскага мас-

тацтва з 1250 па 1550 гг. – час адраджэння ідэалаў і эстэтыкі антычнасці. Агульнапрынятым дадзены тэрмін зрабіўся ў XIX стагоддзі, дзякуючы працы *Якаба Буркгардта* «Культура Рэнесансу ў Італіі» (Базель, 1860).

На працягу XIV – XV стст. беларускія землі зазналі ўплыў чэшскай і нямецкай культур, што выявілася, напрыклад, у распаўсюджванні ідэй гусізму і з'яўленні на беларускіх землях архітэктурных помнікаў у стылі позняй готыкі. У XVI ст. пасярэдніцай заходнееўрапейскага культурнага ўплыву на ВКЛ з'яўлялася Польшча, якая мела цесныя сувязі з рымскай курыяй. Галоўнымі асяродкамі рэнесанснай культуры былі каралеўскі двор і рэзідэнцыі магнатаў. Зніжаны варыянт рэнесанснай культуры характэрны для сярэдняй шляхты. Мяшчанская і сялянская культура грунтавалася пераважна на старажытных усходнеславянскіх традыцыях, што забяспечыла захаванне беларускай гутарковай мовы.

Цэнтрамі фарміравання новай культуры былі гарады. Адным з буйнейшых гарадоў на тэрыторыі ВКЛ з'яўляўся Полацк, у якім налічвалася каля 50 рамесных прафесій. З канца XIV ст. беларускія гарады атрымлівалі магдэбургскае права. Фактарам новай гарадской культуры зрабілася мецэнацтва. Выдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны, напрыклад, ажыццяўлялася пры фінансавым садзеянні гараджан-беларусаў.

***Абнаўленне сістэмы адукацыі.*** Новыя ідэі распаўсюджваліся ў першую чаргу ў студэнцкіх асяродках. Стан каталіцкай сістэмы адукацыі ў ВКЛ да пераўтварэнняў, пачатых езуітамі ў апошняй трэці XVI ст., быў нездавальняючы. Да ўзнікнення Кёнігсбергскага ўніверсітэта ў 1544 г. Кракаўская акадэмія заставалася адзіным цэнтрам вышэйшай адукацыі ў Рэчы Паспалітай. Аднак выхадцы з ВКЛ мелі магчымасць атрымліваць адукацыю за мяжой. У другой палове XVI – XVII стст. набываюць папулярнасць пратэстанцкія ўніверсітэты ў Лейпцыгу, Цюбінгаме, Вітэнбергу, Базэлі, Франкфурце-на-Одэры. У апошнім дзесяцігоддзі XVI ст. павялічылася колькасць студэнтаў з ВКЛ у італьянскіх універсітэтах (Падуя, Балоння, Рым).

З сярэдзіны XVI ст. у Беларусі пачала абнаўляцца канфесійная сістэма адукацыйных устаноў. У 1539 г. у Вільні была адкрыта пратэстанцкая школа, якую ўзначаліў Аўрам Кульва. У 1542 годзе школа была зачынена па патрабаванні каталіцкага віленскага біскупа. У 80-х гадах XVI ст. карысталася вядомасцю арыянская школа ў Іўі, з другой чвэрці XVII ст. – кальвінісцкая гімназія ў Слуцку. Існаваў праект стварэння рэфармацыйнага ўніверсітэта ў Вільні, аднак з-за супраціву каталіцкага касцёлу ён не быў рэалізаваны.

Недастатковы ўзровень развіцця праваслаўнай сістэмы адукацыі стаў відавочным з адкрыццём пратэстанцкіх школ. Адказам на гэты выклік было адкрыццё *Астрожскай школы*, работа асветніцкага гуртка пры Кіева-Пя-

чэрскай лаўры. У развіцці айчыннай культуры XVII – XVIII стст. вялікую ролю адыграла *Кіева-Магілянская акадэмія.* У канцы XVI – XVIII стст. пры праваслаўных брацтвах пачалі адкрывацца *брацкія школы* – пачатковыя і сярэднія навучальныя ўстановы. Акрамя беларускай, у брацкіх школах вывучалі царкоўнаславянскую, грэчаскую, лацінскую і польскую мовы, рыторыку, творы Платона, Арыстоцеля, майстэрства вершаскладання і музыку. Даваліся пэўныя веды па арыфметыцы, геаметрыі, геаграфіі, астраноміі. Выкладчыкамі ў брацкіх школах былі С. і Л. Зізаніі, М. Смятрыцкі, Л. Карповіч, С. Косаў, С. Собаль. Найперш брацкія школы ўзніклі ў Вільні (1584), Магілёве (1500), Брэсце (1591), Мінску (1612), Пінску, Слуцку. У 1633 г. была адкрыта брацкая школа ў Полацку, якая дзейнічала да канца 1660-х гг. У полацкай школе выкладалі выдатныя педагогі – Сімяон Полацкі, Ігнацій Іяўлевіч, Філафей Утчыцкі. Пры полацкай школе існаваў тэатр[22].

***Кнігадрукаванне.*** Заснавальнік усходнееўрапейскага кнігадрукавання палачанін *Францыск Лукіч Скарына* (каля 1490 – каля 1551) на працягу 1517 – 1518 гг. выдаў у Празе на царкоўнаславянскай мове Псалтыр і на старабеларускай мове 22 кнігі Старога Запавету. Ф. Скарына прызначаў свае пераклады для простых людзей, карыстаўся як крыніцай чэшскай Біблiяй – усё гэта можа ўказваць на гусіцкія сімпатыі полацкага асветніка. На карысць праваслаўнай прыналежнасці Ф. Скарыны сведчыць Сімвал веры, надрукаваны ім па праваслаўным каноне ў «Малой падарожнай кніжцы». У 1530 г. польскі кароль Жыгімонт Стары дэкрэтам забараніў пропаведзь антыкаталіцкіх поглядаў, а таксама распаўсюджванне кніг падобнага зместу. Ф. Скарына пакінуў ВКЛ і з Вільні выехаў ў Кёнігсберг да Альбрэхта Гогенцолерна, які аб'явіў лютэранства афіцыйным веравызнаннем. На доўгі час на тэрыторыі ВКЛ перапынілася традыцыя друкавання кірылічных кніг.

На працягу другой паловы XVI – першай паловы XVII стагоддзя друкарні засноўваліся ў Брэсце, Вільні, Заблудаве, Лоску, Любчы, Мінску, Слуцку, Супраслі. Выдаваліся кнігі як рэлігійнага, так і свецкага зместу. Пашыралася вытворчасць паперы. Пачыналі камплектавацца прыватныя бібліятэкі, існавалі царкоўныя і манастырскія кнігазборы.

*Ілья Фёдаравіч Капіевіч* (каля 1651 – 1714) – пісьменнік, энцыклапедыст, выдавец. Вучыўся ў Слуцкай кальвіністкай школе. Эміграваў у Галандыю, верагодна, з-за праследу ўладаў Рэчы Паспалітай па рэлігійных матывах. У Галандыі (1697) пазнаёміўся з расійскім манархам Пятром I. Па

[22] Батвіннік, М. Б. Брацкія школы / М. Б. Батвіннік // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – С. 52.

дамоўленасці з царом ён склаў планы выдання падручнікаў для Расіі. У 1699 – 1706 гадах І. Ф. Капіевіч падрыхтаваў і выдаў каля 20 кніг па гуманітарных, прыродазнаўчых, тэхнічных і вайсковых галінах ведаў. І. Ф. Капіевіч некалькі гадоў служыў у Пасольскім прыказе перакладчыкам, распрацаваў навуковую тэрміналогію па многіх галінах ведаў. І. Ф. Капіевіч быў перакананы ў неабходнасці адукацыі, падкрэсліваў вялікае значэнне featureзнабаковага навучання. Галоўную этыка-эстэтычную каштоўнасць асветнік бачыў у мудрасці і асвеце[23].

***Палітычна-прававыя канцэпцыі.*** Палітыка-прававая канцэпцыя эпохі грунтавалася на дактрынах натуральнага права, грамадскага пагаднення і дзяржаўнага суверэнітэту, мела ўзаемасувязь з канцэпцыяй рымскага права.

Ідэя грамадскага пагаднення, распрацаваная Платонам, развівалася ў XVI ст. Эразмам Ратэрдамскім і Нікола Макіявелі. Тэорыя суверэнітэту Жана Бадэна з'яўлялася ідэалагічнай асновай працэсу цэнтралізацыі дзяржаў. Разам з тым, Ж. Бадэн сцвярджаў неабходнасць абмежавання суверэннай улады манарха Боскім, натуральным і чалавечым законамі. Суверэнітэт разумеўся як вяршэнства дзяржаўнай улады на дзяржаўнай тэрыторыі, што паспрыяла паскарэнню кадыфікацыі нацыянальных заканадаўстваў.

***Развіццё юрыдычнай думкі.*** У XV – XVI стст. адбывалася цэнтралізацыя ВКЛ, якая прывяла да скасавання сістэмы княстваў-удзелаў і завяршылася рэформамі XVI ст. (аграрная 1557 г., адміністрацыйная і судовая 1564 – 1566 гг.). Уніфікацыя права прадугледжвала замену мясцовага права асобных зямель агульнадзяржаўным. Першым зборам асноўных законаў ВКЛ быў Судзебнік 1468 г. Казіміра Ягелончыка, напісаны на старабеларускай мове на аснове ўсходнеславянскага звычаёвага права і норм Рускай Праўды. Кадыфікацыя права была завершана ў Статуце ВКЛ 1529 г. і істотна дапоўнена ў наступных Статутах 1566 і 1588 гг.

Статуты ВКЛ змяшчалі нормы дзяржаўнага, цывільнага, шлюбна-сямейнага, адміністрацыйнага і працэсуальнага права. У Статуце ВКЛ 1566 г. была пашырана сфера прававога рэгулявання, выпрацавана юрыдычная тэрміналогія. Перад камісіяй стаяла задача змяніць заканадаўства ў адпаведнасці з рэформамі сярэдзіны XVI ст. Прыняцце Статута 1588 г. было абумоўлена заключэннем Люблінскай уніі. Статут дазваляў набываць у ВКЛ землі і атрымліваць пасады толькі ўраджэнцам княства. Інстытут прэзумпцыі невінаватасці з'явіўся ў Статуце 1566 г. і распаўсюджваўся толькі на шляхту. У Статуце 1588 г. ён стаў прымяняцца і ў адносінах да астатніх са-

[23] Капіевіч, Г. Ф. // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 220 – 222.

слоўяў, упершыню таксама было ўведзена палажэнне аб адказнасці шляхты за забойства простага чалавека. Статуты ВКЛ з'яўляліся інструментам сацыяльна-палітычнага дамінавання феадальных груп. У крымінальным праве захоўваўся прынцып запалохвання, існавала практыка пазасудовай расправы над залежнымі людзьмі. Статуты ВКЛ юрыдычна афармілі сістэму прыгонніцтва на беларускіх землях, надалі шляхецтву выключныя прывілеі, ліквідавалі рэшткі аўтаноміі ўсходнеславянскіх княстваў. Статут ВКЛ 1588 г. дзейнічаў на частцы тэрыторыі Беларусі да 1840 г.[24]

## 6.2. Праблема захавання нацыянальнай мовы

***Паходжанне назвы Белая Русь.*** Адно з першых вядомых пісьмовых сведчанняў выкарыстання тэрміна «беларус» у якасці этнічнага самавызначэння належыць Саламону Рысінскаму. У 1586 г. пры паступленні ў Альтдорфскі ўніверсітэт ён запісаў сябе як Solomo Pantherus Leucorussus (*Leucorussus* с лацінскай мовы перакладаецца як *беларус*). *Саламон Рысінскі* (каля 1560 – 13 лістапада 1625) паходзіў з Полацкага ваяводства, быў лютэранінам. У 1618 г. ён выдаў першы ў свеце збор славянскіх народных прыказак і прымавак, з'яўляўся аўтарам літаратурных і літаратуразнаўчых твораў на лацінскай мове.

Тэрмін *«Белая Русь»* (Alba Russia) упершыню фіксуецца ў заходнееўрапейскім геаграфічным трактаце Descriptiones terrarium («Апісанне зямель») другой паловы XIII ст. У «Хроніцы Польшчы» Яна з Чарнкова пад 1382 г. Полацк згадваецца як «крэпасць Белай Русі» («in guodam Castro Albae Russiae Polozk dicto»). Да канца XVI ст. дадзеная назва канчаткова замацавалася за тэрыторыяй Полаччыны, Віцебшчыны і Магілёўшчыны. Першапачаткова назва Alba Russia з'явілася менавіта ў заходніх крыніцах, і толькі з часам гэты тэрмін быў прыняты нашымі продкамі як саманазва. Польскі даследчык А. Латышонак перакладае тэрмін «Белая Русь» як «Верхняя Русь» – зямля ў вярхоўі рэк Волгі, Дняпра і Заходняй Дзвіны (тэрыторыя Полацкага і Смаленскага княстваў)[25].

У XVI ст. тэрмін «Белая Русь» пачынае ўсё часцей згадвацца ў дачыненні да тэрыторый, якія сёння лічацца этнічна беларускімі. Так, у кальвінскай Літоўскай Ядноце існаваў спачатку рускі, а потым беларускі дыстрыкт, які ўключаў полацкае, віцебскае, мсціслаўскае і мінскае ваяводствы

[24] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 37 – 38.
[25] Латышонак, А. Нацыянальнасьць – Беларус / А. Латышонак. – Беласток-Вільня : Інстытут беларусістыкі, Беларускае гістарычнае таварыства, 2009. – С. 340 – 344.

ВКЛ[26]. Ян Вісліцкі ў сваёй паэме «Пруская вайна» (1515) згадвае «беларусаў, славутых мужнасцю ў войнах». Аднак больш шырокае выкарыстанне ў якасці этнічнага самавызначэння праваслаўнага ўсходнеславянскага насельніцтва ВКЛ у XVI ст. меў тэрмін «русін», «руські». Ілюстрацыяй можа служыць верш Яна Казіміра Пашкевіча, які датуецца 1621 годам:

Полска квитнет лациною,
Литва квитнет русчызною,
Без той в полще не пребудеш,
Без сей в литве блазнъм будзеш.
Той лати[н]а езык дает.
Та без руси не вытрвает.
Ведзъ же юж, рус, иж тва хвала
По всем свете юж дойзрала;
Весели ж се ты, русине,
Тва слава никгды не зкгине.

***Моўнае пытанне ў ВКЛ.*** Традыцыйным кампанентам моўнай культуры беларускага народа з'яўлялася царкоўнаславянская. Паступова ў пісьмовым ужытку яе пачала выцясняць «проста мова», ці «руска мова», – старабеларуская літаратурная мова, якая фарміравалася на народнай аснове. Кірылічнае кнігадрукаванне на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах, якое ў 1517 – 1525 гг. пачаў Ф. Скарына, было цесна звязана з усходнеславянскай праваслаўнай традыцыяй.

Пасля таго як дзейнасць Скарыны ў Вільні была забаронена літоўскім урадам, наступная друкарня на тэрыторыі ВКЛ з'явілася толькі ў 1553 г. у Брэсце і пачала выдаваць кнігі ўжо на польскай мове. У 1562 г. Сымон Будны выдаў у Нясвіжы дзве кнігі на старабеларускай мове. Значную колькасць кірылічных кніг выпусцілі ў Вільні Мамонічы і друкарня Віленскага праваслаўнага брацтва. На польскай і лацінскай мовах выдавала сваю прадукцыю пераважная большасць друкарняў Беларусі другой паловы XVI ст. Калі на лацінскай і польскай мовах друкавалася шмат свецкай літаратуры, то на старабеларускай і царкоўнаславянскай – у асноўным творы рэлігійнага зместу.

*Васіль Ця́пінскі* (Амельяновіч, 1530-я гг. – каля 1603), ураджэнец Полаччыны, уладальнік фальварка Цяпіна (цяпер Чашніцкі раён Віцебскай вобласці). Каля 1570 г. выдаў Евангелле ва ўласным перакладзе на старабела-

---

[26] Латышонак, А. Навуковыя крыніцы самаакрэслення Саламона Рысінскага як беларуса / А. Латышонак // Рэфармацыя і грамадства: XVI стагоддзе: Зборнік матэрыялаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі. – 29 лістапада 2003 г.– Мінск : Беларускі кнігазбор, 2005. – С. 126 – 131.

рускую мову, дадаўшы прадмову і каментары. Прадмова была прысвечана абароне беларускай культурнай традыцыі. В. Цяпінскі засведчыў пачатак адчужэння часткі ўсходнеславянскай палітычнай эліты ад роднай мовы.

У Статут ВКЛ 1566 г. быў уключаны артыкул пра дзяржаўнасць «руськай» (старабеларускай) мовы. Гэты артыкул перайшоў і ў Статут ВКЛ 1588 г. Большасць афіцыйных і гаспадарчых дакументаў краіны, у тым ліку Метрыка ВКЛ, збор дзяржаўных юрыдычных актаў, дыпламатычных дакументаў і гаспадарчых інвентароў, складаліся на старабеларускай мове.

Аднак сфера функцыянавання старабеларускай мовы пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай няўхільна звужалася. Кіруючыся саслоўнымі інтарэсамі, літоўскае шляхецтва падчас Лівонскай вайны настаяла на заключэнні Люблінскай уніі 1569 г. У Рэчы Паспалітай польская мова фактычна з’яўлялася мовай каралеўскага і велікакняжацкага двара і пратэстанцкага руху. Польскую мову ў сваёй дзейнасці пераважна ўжывалі пратэстанты, ускосна спрыяючы паланізацыі беларускай культуры. У канцы 60-х гг. XVI ст. у літаратуры ВКЛ з’явіліся першыя польскамоўныя творы. З канца XVI ст. польская мова трапіла ў навучальныя праграмы праваслаўных брацкіх школ. З агульнай колькасці кніг, выдадзеных у XVI – першай палове XVII ст. на тэрыторыі ВКЛ, на польскай мове надрукавана 46 %, на лацінскай – 38 %, на старабеларускай («руськай») і царкоўнаславянскай – 10 %. Пастанова Сейма 1696 г. фактычна надала польскай мове статус дзяржаўнай у ВКЛ. Адметнае месца ў беларускай культуры XVI – XVII стст. займала грэчаская мова. Латынь заставалася мовай навукі, літаратуры і каталіцкага касцёла. Супраць цэнтралісцкай тэндэнцыі ў практыцы польскіх палітычных колаў выступалі А. Рымша, Г. Пельгрымоўскі, Я. Радван, Я. Казаковіч.

***Развіццё гістарыяграфіі.*** У XVI ст. распрацоўвалася новая канцэпцыя гісторыі ВКЛ, якая была заклікана павысіць прэстыж літоўскай магнатэрыі. Адпаведна гэтай патрэбе паходжанне літоўскіх князёў і шляхты выводзілася ад міфічнага рымскага патрыцыя Палемона і яго світы («Хроніка Быхаўца», «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» М. Стрыйкоўскага). Фальшаваліся гістарычныя звесткі аб мінулым усходнеславянскіх зямель у складзе ВКЛ. Адбывалася белетрызацыя гістарыяграфічных твораў і нават дзелавых дакументаў. Узорам такога літаратурнага жанру была перапіска 1567 – 1587 гг. аршанскага старасты Ф. Кміты-Чарнабыльскага з урадам ВКЛ. Агульнадзяржаўнае летапісанне заняпала, аднак існавалі мясцовыя летапісы. На мяжы XVI – XVII стст. стварыўся Баркулабаўскі летапіс, у якім апісанне гістарычных падзей суіснуе з запісамі асабістых уражанняў летапісца. Узнікаюць новыя жанры – дыярыушы (дзённікі) і мемуары (успаміны).

**Крыніцы**

1. Капіевіч, І. Ф. Са спадчыны / І. Ф. Капіевіч // Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост. Э. К. Дорошевич [и др.]. – М. : Педагогика, 1986. – С. 135 – 138.
2. Скарына, Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія / Ф. Скарына; уступ. арт., падрыхт. тэкстаў, камент., слоўнік А. Ф. Коршунава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.
3. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. – Мінск : Тэсей, 2003. – 352 с.
4. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 573 с.

**Літаратура**

1. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т. Т. 2: Протарэнесанс і Адраджэнне / С. І. Санько [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – 840 с.
2. Мещеряков, В. П. Братские школы Белоруссии (XVI – 1-я пол. XVII в.) / В. П. Мещеряков. – Минск : БГУ, 1977. – 57 с.
3. Міраловіч, А. Праваслаўнае школьніцтва на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага да канца XVIII ст. / А. Міраловіч // Белорусский сборник. – СПб. : Рос. нац. библиотека Санкт-Петербурга, 2005. – Вып. 3. – С. 56 – 65.
4. Порецкий, Я. И. Соломон Рысинский: Solomo Pantherus Leucorussus (конец XVI – начало XVII в.) / Я. И. Порецкий. – Минск : изд-во БГУ, 1983. – 158 с.
5. Спиридонов, М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV – XVI вв.) / М. Ф. Спиридонов. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 223 с.
6. Юхо, І. А. Крыніцы беларуска-літоўскага права / І. А. Юхо. – Мінск : Беларусь, 1991. – 238 с.

# ТЭМА 7. АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМКІ ЭПОХІ РЭНЕСАНСУ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Тэрміны: *антрапацэнтрызм, гнастыцызм, гуманізм, Паўночнае Адраджэнне.*

1. Характэрныя рысы рэнесанснай культуры.
2. Анталагічныя аспекты філасофіі Беларусі XVI – XVII стст.
3. Эстэтычныя аспекты рэнесанснай думкі.

## 7.1. Характэрныя рысы рэнесанснай культуры

***Перыядызацыя.*** Эпоха Адраджэння разглядаецца як пераходная паміж сярэднявеччам і Новым часам. У агульнапрынятай перыядызацыі эпохі за аснову ўзяты этапы развіцця выяўленчага мастацтва Італіі XIII – XVI стагоддзяў: протарэнесанс (XIII ст.); ранняе Адраджэнне (XIV – XV стст.);

сярэдняе (або высокае) Адраджэнне (XV – XVI стст.) і позняе Адраджэнне, асобнай фазай якога стаў маньерызм (XVI ст.). Паводле італьянскай тэрміналогіі: дучэнта (XIII ст.); трэчэнта (XIV ст.); кватрачэнта (XV ст.); чынквечэнта (XVI ст.).

Новая культура краін, што месцяцца на поўначы і захадзе ад Альпаў (Францыя, Нідэрланды, нямецкамоўныя землі), атрымала назву *Паўночнага Адраджэння*. Характэрныя рысы Рэнесансу выявіліся таксама ў Чэхіі, Венгрыі, Польшчы і ВКЛ, часткова ў Скандынавіі. Самабытная рэнесансная культура склалася ў Іспаніі, Партугаліі і Англіі.

У Беларусі можна вызначыць два этапы развіцця культуры Рэнесансу: *ранні Рэнесанс* (першая палова XVI ст.) і *позні Рэнесанс* (другая палова XVI – пачатак XVII стст.). Першы этап характарызуецца хрысціянскім універсалізмам і патрыятызмам (Ф. Скарына, М. Гусоўскі і Я. Вісліцкі). На другім этапе набірала моц каталіцкая рэакцыя, абвастралася ідэалагічная, рэлігійная, літаратурна-публіцыстычная барацьба.

***Ідэалогія гуманізму***. Да галоўных рысаў эпохі адносяць гуманізм, антрапацэнтрызм, развіццё прыродазнаўства, росквіт выяўленчага мастацтва. Паходжанне канцэпцыі гуманізму звязана з ідэямі Цыцэрона, якія аказалі ўплыў на Петрарку і Эразма Ратэрдамскага. У антычным разуменні, humanitas («чалавечая годнасць») – гэта выдатныя ўчынкі і подзвігі, а таксама выхаванне «ўзорных грамадзян». Humanitas у рэнесансным разуменні – самапазнанне і самаўдасканаленне праз авалоданне антычнай мудрасцю. З ідэалогіі гуманізму вынікаў прынцып *антрапацэнтрызму*, паводле якога чалавек уяўляецца мэтай усяго, што адбываецца ў свеце.

***Абнаўленне філасофскай навукі.*** У рэнесансным мысленні фарміравалася тэндэнцыя абнаўлення хрысціянства. Эразм Ратэрдамскі, Мікалай Кузанскі, Марсілія Фічына, Піка дэла Мірандола, Парацэльс, Джардана Бруна прыўнеслі новыя тэмы ў еўрапейскую філасофскую думку. Развіваўся адраджэнскі неаплатанізм і арыстоцелеўская галіна філасофіі. Адраджалася папулярнасць гнастыцызму, магіі, астралогіі, алхіміі, што дало імпульс да развіцця эксперыментальнага прыродазнаўства.

Асновы сучасных паліталогіі і сацыялогіі заклалі працы Ж. Бадэна і Н. Макіявелі. Ідэя сацыяльнай справядлівасці на хрысціянскіх прынцыпах маралі была абгрунтавана ў трактаце Т. Мора «Утопія», а потым у «Горадзе Сонца» Т. Кампанэлы. Апалогія свецкай улады прасочваецца ў творах Марсілія Падуанскага і ў праграмным творы Петраркі «Мастацтва жыцця». У працах Л. Бруні, П. Брачаліні, Л. Альберці, Д. Манэці гуманістычная

этыка афармляецца як асобны тып філасофскага стаўлення да жыцця. М. Лютэр, У. Цвінглі, Ф. Меланхтон, Ж. Кальвін падрыхтавалі глебу для пераходу ад адраджэнскага ідэалу дасканалай асобы да новаеўрапейскага ідэалу рацыянальна-актыўнага і этычна-адказнага суб'екта.

***Вывучэнне феномену Рэнесансу.*** У працы *Якаба Буркгардта* «Культура Рэнесансу ў Італіі» эпоха Адраджэння разглядаецца як італьянскі гістарычны перыяд, якому ўласцівы індывідуалізм, пачуццёвасць, свецкі дух у рэлігіі з тэндэнцыяй да язычніцтва, вызваленне ад улады аўтарытэтаў, якія ў мінулым панавалі над духоўным жыццём, асаблівая ўвага да гісторыі, філасофскі натуралізм і папулярнасць мастацтваў. Рэнесанс, паводле Буркгардта, быў эпохай нараджэння новай культуры, супрацьпастаўленай культуры сярэднявечча, і ў гэтым выяўляецца яе важная роля, якую нельга зводзіць толькі да заслугі аднаўлення антычных ідэалаў.

У 11-томнай працы *Конрада Бурдаха* «Ад Сярэднявечча да Рэформы» (Берлін, 1912 – 1939) разглядаецца паходжанне ідэі Адраджэння. К. Бурдах лічыць Адраджэнне больш высокай, чым сярэднявечча, духоўнай формай жыцця. Антычнасць, якую людзі Адраджэння збіраліся вярнуць да жыцця, павінна была спрыяць «абнаўленню» хрысціянства. К. Бурдах аспрэчваў тэзіс, нібыта Рэнесанс – гэта час бязбожнасці і аднаўлення язычніцтва. Ён даводзіў, што Рэнесанс меў карані ў ідэі адраджэння рымскай дзяржаўнасці, што ўзыходзіла да дзейнасці *Кола дзі Рыенца*.

## 7.2. Анталагічныя аспекты філасофіі Беларусі XVI – XVII стст.

Фарміраванне анталагічных поглядаў на беларускіх землях у XVI – XVII стст. адбывалася на базе рэлігійнага рацыяналізму і вальнадумства, сінтэзу біблейскіх уяўленняў з антычнымі прыродазнаўчымі ведамі. Так, у прадмове да «Кнігі Быцця» Ф. Скарына супастаўляе хрысціянскае вучэнне аб стварэнні свету «з нічога» з арыстоцелеўскай канцэпцыяй вечнасці матэрыі, схіляючыся да хрысціянскай крэацыяністкай канцэпцыі. Крыніцамі прыродазнаўчых ведаў з'яўляліся «Натуральная гісторыя» Плінія Старэйшага і трактаты Арыстоцеля. Ідэя антычных аўтараў аб бязмежнасці Сусвету з'яўлялася адной з перадумоў натурфіласофіі эпохі Адраджэння. Яна супярэчыла вучэнню тамізму аб адзінстве свету і яго канчатковасці. У канцы 30-х гг. XVII ст. у Вільні была выдадзена кніга Альберта Дыблінскага па астраноміі, у якой папулярызавалася геліяцэнтрычнае вучэнне Мікалая Каперніка. Аднак сістэма Каперніка зрабілася агульнапрынятай на беларускіх землях толькі ў XVIII ст. Айчыннае развіццё прыродазнаўчай

навукі паскорылася з утварэннем Віленскай езуіцкай (1579) і Кіева-Магілянскай акадэміі (1632).

***Матэрыялізм.*** Айчынная эвалюцыя анталагічных уяўленняў ішла ад рэлігійнага рацыяналізму і натуралізму да матэрыялізму. Ідэі атэізму і матэрыялізму на беларускіх землях фіксуюцца з сярэдзіны XVI ст. (С. Лован, К. Бекеш, К. Лышчынскі). У канцы XVI – пачатку XVII ст. спробу абнаўлення артадаксальнай праваслаўнай анталогіі робяць Стэфан і Лаўрэнцій Зізаніі.

*Сымон Будны* (каля 1530 – 1593) лічыў Бога безаблічным пачаткам, першаасновай быцця, а Святы дух – яго атрыбутам. Хрыстос, на думку Буднага, з'яўляўся прапаведнікам і прарокам. С. Будны адмаўляе бессмяротнасць чалавечай душы і рэальнасць існавання замагільнага свету. У «Катэхізісе» Будны пісаў аб падпарадкаваным становішчы душы ў дачыненні да цялеснай субстанцыі. Звышнатуральныя сітуацыі ў Бібліі С. Будны імкнуўся тлумачыць зыходзячы з побытавага вопыту.

*Андрэй Белабоцкі* (сярэдзіна XVII ст. – пасля 1712 г.) – паэт і філасаф. Эмігрыраваў з ВКЛ з-за пераследу каталіцкіх колаў. Свае асноўныя рэлігійна-філасофскія і паэтычныя творы напісаў у Маскоўскай дзяржаве. А. Белабоцкі вучыўся ў Слуцкай кальвінісцкай школе, потым – у заходнееўрапейскіх універсітэтах. Прытрымліваўся платонаўска-арыстоцелеўскай канцэпцыі вечнасці матэрыі. У сваіх творах «Рыторыка» і «Вялікая навука» А. Белабоцкі распрацоўваў вучэнне аб сутнасным, якое, на яго думку, вышэй за ўсе рэчы, у тым ліку і Бога[27].

## 7.3. Эстэтычныя аспекты рэнесанснай думкі

Эпоха Рэнесансу вызначаецца ростам прэстыжу мастацкай творчасці. У мастацтве Рэнесансу форма мае большую каштоўнасць, чым змест. Эстэтычная думка гэтага перыяду развівалася ў сферы паэтыкі, рыторыкі, літаратурнай крытыкі. Белетрыстыка не да канца аддзялілася ад красамоўства, а тэорыя паэзіі – ад рыторыкі і логікі. Адбывалася спроба паяднаць хрысціянскую і антычную эстэтыку. Уваходжанне антычнай эстэтычнай думкі ў мясцовую традыцыю адбывалася праз пасярэдніцтва заходнееўрапейскіх універсітэтаў, перакладной літаратуры. Да канца XVII ст. папулярнымі кнігамі заставаліся аповесці «Александрыя», «Троя», рыцарскія рама-

[27] Горфункель, А. Х. Андрей Белобоцкий – поэт и философ конца XVII – начала XVIII в. / А. Х. Горфункель // Труды отдела древнерусской литературы. – М., Л. : изд-во АН СССР, 1962. – Т. XVIII. – С. 188 – 213.

ны пра Трыстана і Баву. Вялікі ўплыў на развіццё выяўленчага мастацтва Беларусі аказаў візантыйскі іканапіс.

***Новалацінская літаратура.*** Вяршынямі новалацінскай паэзіі ВКЛ з'яўлялася творчасць Яна Вісліцкага і Міколы Гусоўскага. На лацінскай мове пісалі таксама Ф. Градоўскі, Я. Радван, езуіты М. Сарбеўскі, М. Бойер, Я. Эйсмант.

*Ян Вісліцкі* (каля 1480 – 1530) з'яўляецца аўтарам оды ў гонар Канстанціна Астрожскага, а таксама паэмы «Пруская вайна» (1515). Гэта былі ўзоры свецкай літаратуры, адкрытай да праблем грамадства. Паэма «Пруская вайна» складаецца з трох частак. Першая частка – зварот да алімпійскіх багоў з просьбай натхніць паэта для праслаўлення караля Жыгімонта I, другая – гісторыя заваявання крыжакамі прусаў, а таксама апісанне Грунвальдскай бітвы, трэцяя частка паэмы прысвечана шлюбу Ягайлы з праваслаўнай князёўнай Соф'яй Гальшанскай. Ян Вісліцкі з'явіўся пачынальнікам свецкай плыні ў эпічнай паэзіі Рэчы Паспалітай. Пісьменнік выкарыстаў вопыт антычнай і беларускай народнай паэзіі. Прыклад Яна Вісліцкага мог натхніць *Міколу Гусоўскага*, аўтара новалацінскай ліра-эпічнай паэмы «Песня пра зубра» (1522)[28].

**Крыніцы**

1. Будны, С. Фрагменты твораў / С. Будны // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI – начала XIX в. – Минск : изд-во АН БССР, 1962. – С. 50 – 78.

**Літаратура**

1. Галенчанка, Г. Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Я. Галенчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 283 с.

2. Падокшын, С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С. А. Падокшын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 283 с.

3. Порецкий, Я. И. Ян Вислицкий / Я. И. Порецкий. – Минск : Университетское, 1991. – 111 с.

[28] Парэцкі, Я. І. Паэма Яна Вісліцкага «Пруская вайна» (1516) / Я. І. Парэцкі, Ю. І. Прэнская // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. – Вып. 1. – Мінск : Народная асвета, 1973. – С. 161 –175.

# ТЭМА 8. РЭФАРМАЦЫЙНЫ РУХ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Тэрміны: *антытрынітарызм, арыянства, інквізіцыя, кальвінізм, лютэранства, Рэфармацыя.*

1. Агульная характарыстыка рэфармацыйнага руху.
2. Асаблівасці распаўсюджвання ідэй Рэфармацыі ў Беларусі.

## 8.1. Агульная характарыстыка рэфармацыйнага руху

*Рэфармацыя* (ад лат. *reformatio* – пераўтварэнне) – шырокі грамадскі рух у Заходняй і Цэнтральнай Еўропе ў XVI ст., накіраваны на рэфармаванне хрысціянскай дактрыны. Пачатак Рэфармацыі пакладзены ў 1517 г. абнародаваннем т.зв. «95 тэзісаў» М. Лютэра ў Вітэнбергу (Саксонія). Асноўныя кірункі Рэфармацыі: бюргерскі (М. Лютэр, Ж. Кальвін, У. Цвінглі); народны (Т. Мюнцэр, анабаптысты); каралеўска-княжацкі. Рэфармацыя была ідэйна звязана з Сялянскімі войнамі 1524 – 1526 гг. у Германіі, Нідэрландах і Англійскай рэвалюцыяй. Рэфармацыя з’яўляецца працягам Рэнесансу, аднак супярэчыць некаторым рэнесансным тэндэнцыям.

Ідэолагі пратэстантызму фактычна адмаўлялі правы царквы на зямельную ўласнасць, аспрэчвалі каталіцкае Святое Пісанне. У пратэстанцтве значэнне царкоўнай арганізацыі зводзілася да мінімуму. Галоўным у справе выратавання прызнавалася індывідуальная вера, якая грунтуецца на асабістых адносінах чалавека з Богам. Выратаванне не заслугоўваецца, а даруецца адвольна Богам. Малітвы, пакланенне іконам, ушанаванне святых, царкоўныя рытуалы пратэстанты лічаць марнымі ў справе выратавання. Верыць у збаўчую ахвяру і ўваскрашэнне Ісуса Хрыста, прытрымлівацца высокамаральных паводзінаў, актыўна дзейнічаць на прафесійнай і грамадскай ніве – усё разам з’яўляецца шляхам выратавання. Сведчанне абранасці – поспех у кар’еры, сямейным жыцці. Крыніца рэлігійнай ісціны – Святое Пісанне. Меркаванні Святых Айцоў, багасловаў і Папы Рымскага не разглядаюцца пратэстантамі як аўтарытэтныя. Святар у пратэстантызме – выбарная пасада. Ідэолагі пратэстантызму арыентавалі чалавека на зямныя рэаліі – працу, сям’ю, самаўдасканаленне. Пратэстанцкая этыка, на думку Макса Вебера, сфарміравала ў еўрапейцаў «дух капіталізму», для якога характэрны працавітасць, ашчаднасць, прафесійная добрасумленнасць[29].

Раннія рэфарматары былі прыхільнікамі неўмяшальніцтва царквы ў дзяржаўныя справы. Аднак дактрына кальвіністаў давала ідэйныя падста-

[29] Зень, С. М. Пратэстантызм / С. М. Зень // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – С. 267.

вы ў асобных выпадках не падпарадкоўвацца ўладзе. Рэфарматары першымі перакладалі Біблію на сучасныя мовы (Уікліф – у Англіі, Гус – у Чэхіі, Лютэр – у Германіі).

## 8.2. Асаблівасці распаўсюджвання ідэй Рэфармацыі ў Беларусі

Пратэстантызм распаўсюджваўся ў ВКЛ пераважна ў выглядзе лютэранства, кальвінізму і антытрынітарызму. Большасць суполак дзейнічала ў заходніх і цэнтральных землях Беларусі, дзе размяшчаліся ўладанні Радзівілаў. Шляхта аддавала перавагу кальвінізму. У мяшчанскім асяроддзі, пераважна сярод немцаў, распаўсюджвалася лютэранства. Існавалі таксама радыкальныя пратэстанцкія накірункі (арыянства). Пратэстантызм не распаўсюдзіўся ў асяроддзі беларускага сялянства. Уплыў на рэфармацыйны рух у ВКЛ зрабіла ідэалогія кальвінізму і лютэранства, гусіцкага руху, нямецка-мараўскі анабаптызм. Дзейнасць расійскіх уцекачоў – «феадасіянаў» – паўплывала на фарміраванне антытрынітарызму.

***Гусізм***. У 1413 г. ВКЛ наведаў Геранім Пражскі, паплечнік Яна Гуса. Чэхі запрасілі Вітаўта стаць чэшскім каралём. У 1423 г. пяцітысячнае войска ВКЛ накіравалася ў Чэхію і знаходзілася ў краіне на працягу сямі гадоў. У 30-я гады XV стагоддзя ўплыў гусіцкіх ідэй у грамадстве ВКЛ узмацніўся, што пагражала становішчу каталіцкай царквы. Літоўскі ўрад у 30 – 40-х гг. XV ст. выдаў некалькі пастаноў, накіраваных супраць свабоды веравызнання. У 1436 г. у ВКЛ пачала дзейнічаць *інквізіцыя.*

***Лютэранства***. Лютэранства пранікала ў ВКЛ пачынаючы з 1520-х гг. непасрэдна з Германіі праз беларускіх студэнтаў нямецкіх універсітэтаў, перадусім Лейпцыгскага. Рэфарматарскі рух у ВКЛ быў звязаны з пратэстантамі Лівоніі, Польшчы, Усходняй Прусіі, дзе з 1525 г. лютэранства зрабілася дзяржаўнай рэлігіяй, а ў 1544 г. быў заснаваны пратэстанцкі Кёнігсбергскі ўніверсітэт. У 1525 г. у Вільні вучэнне Марціна Лютэра пачаў прапаведаваць Станіслаў Рафаловіч. У 1539 г. Юры з Эйшышак спрабаваў заснаваць у Вільні лютэранскую школу. У тым жа годзе выпускнік Вітэнбергскага ўніверсітэта А. Кульва адкрыў пратэстанцкую школу, што выклікала жорсткую рэакцыю з боку каталіцкай царквы і ўраду ВКЛ. У 1542 г. у дэкрэце Жыгімонта Старога А. Кульву і яго прыхільнікам было загадана адмовіцца ад сваіх поглядаў пад пагрозай пазбаўлення шляхецкай годнасці і канфіскацыі маёмасці. Таксама было забаронена адпраўляць моладзь на вучобу ў Нямеччыну і запрашаць немцаў у якасці выхавацеляў і настаўнікаў.

***Кальвінізм.*** Галоўнымі апекунамі кальвінізму ў ВКЛ былі віленскі ваявода *Мікалай Радзівіл Чорны* і яго брат *Мікалай Радзівіл Руды*. Пры-

няўшы ў 1533 г. разам з сям'ёй новае вучэнне, Мікалай Радзівіл Чорны выкарыстаў свой уплыў для распаўсюджвання кальвінізму. У 1553 г. ён заснаваў у Берасці першы кальвінскі збор з друкарняй, у 1561 г. – малельні ў Нясвіжы, Клецку, Оршы, Ашмянах, Іўі, Кейданах, Брэсце, Віцебску, Гарадзеі, Заслаўі, Мінску, Слуцку, Смаргоні. Пры зборах адкрываліся шпіталі, школы, друкарні. Кальвінісцкія школы пачалі дзейнічаць у Вільні, Наваградку, Нясвіжы, Слуцку, Оршы і Ашмянах. У 60-х гг. XVI ст. у кальвінізм перайшлі Кішкі, Дарагастайскія, Хадкевічы, Саламярэцкія, Валовічы. У 1557 г. у Вільні адбыўся ўстаноўчы сінод пратэстантаў ВКЛ. У 1563 г. кальвінісцкая шляхта атрымала роўныя правы з каталікамі і праваслаўнымі.

***Антытрынітарызм***. На працягу 1562 – 1565 гг. з кальвінскага лагера вылучаецца радыкальны кірунак – антытрынітарызм, або арыянства (ад імя святара Арыя, які жыў у IV ст. н.э. у Александрыі і адмаўляў адзінасутнасць Тройцы). Антытрынітарыі вядомы таксама пад назвай польскіх ці літоўскіх братоў, пазней – сацыніянаў. Дыспут паміж кальвіністамі і антытрынітарыямі на Петрыкаўскім сінодзе (1565) замацаваў раскол у рэфарматарскім руху. У Рэчы Паспалітай да канца XVI ст. існавала каля 170 арыянскіх прыходаў. Арыянскімі цэнтрамі на беларускіх землях былі Іўе, Лоск, Любча, Клецк, Наваградак. У 1658 г. каронны сейм прыняў рашэнне аб выгнанні арыян з Рэчы Паспалітай.

Вылучалася два накірункі антытрынітарызму: левы – плебейска-сялянскі – і правы – шляхецка-бюргерскі. У левым крыле вызначальную ролю адыгрывалі гарадскія нізы, яго ідэолагі выказвалі сацыяльныя памкненні беднаты. Ідэйнымі кіраўнікамі левага крыла былі Пётр з Ганёндза, Марцін Чаховіц, Якуб з Калінаўкі, Лаўрэнцій Крышкоўскі, Павел з Візны, Ян Немаеўскі. Гучала крытыка сацыяльна-палітычных асноў грамадства; левыя выступалі супраць свецкай улады, прыватнай уласнасці, войнаў. У правым крыле пераважалі шляхта і ўмераныя бюргерскія пласты з гарадоў. Вядучым ідэолагам правай плыні антытрынітарызму быў Сымон Будны. Дзеячы правага крыла ў рэлігійна-філасофскай сферы займалі рацыяналістычную пазіцыю, крытыкавалі царкоўна-рэлігійную дагматыку кананічных хрысціянскіх цэркваў.

**Літаратура**

1. Падокшын, С. А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI – XVII стст. / С. А. Падокшын. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 149 с.

2. Сокол, С. Ф. Политическая и правовая мысль Белоруссии XVI – первой половины XVII в. / С. Ф. Сокол; науч. ред. И. А. Юхо, АН БССР, Ин-т философии и права. – Минск : Наука и техника, 1984. – 188 с.

# ТЭМА 9. РЭЛІГІЙНАЯ ПАЛЕМІКА І ЎСТАЛЯВАННЕ ЦАРКОЎНАЙ УНІІ

Тэрміны: *Брэсцкая царкоўная унія*, *езуіты*, *Контррэфармацыя, палемічная літаратура, схаластычная філасофія.*

1. Сутнасць палітыкі Контррэфармацыі ў Беларусі.
2. Педагагічная дзейнасць езуітаў у Беларусі.
3. Палемічная літаратура.

## 9.1. Сутнасць палітыкі Контррэфармацыі ў Беларусі

*Контррэфармацыя* – комплекс мер, прынятых каталіцкай царквой у XVI – XVII стст. з мэтай падаўлення пратэстанцкага руху і вяртання тэрыторый, якія адпалі ад каталіцтва. Тэрмін «Контррэфармацыя» быў уведзены нямецкім гісторыкам Леапольдам фон Ранке.

У XVI ст. у сенаце ВКЛ большасць складалі кальвіністы і лютэране. Аднак перамога Контррэфармацыі ў Польшчы прадвызначыла палітычнае паражэнне пратэстантаў у ВКЛ. Пасля Люблінскай уніі (1569) у Рэчы Паспалітай пачала праводзіцца палітыка Контррэфармацыі. Пачынаючы з 90-х гг. XVI ст. на высокіх дзяржаўных пасадах прысутнічалі толькі католікі і ўніяты. Каталіцкая царква атрымлівала ад дзяржавы разнастайныя палітычныя і эканамічныя прэферэнцыі. На працягу XVI – XVIII стст. на беларускіх землях дзейнічалі 24 каталіцкія манаскія ордэны. Статут ВКЛ 1588 г. утрымліваў тэкст Варшаўскай канфедэрацыі аб верацярпімасці, аднак школы і друкарні праваслаўных і пратэстантаў зачыняліся. Студэнты езуіцкіх навучальных устаноў учынялі пагромы ў іншаверных цэрквах і друкарнях. Асабліва жорсткія ганенні з боку каталіцкай царквы і дзяржавы пачаліся супраць антытрынітарыяў.

Контррэфармацыя ў ВКЛ была накіравана супраць пратэстантызму і праваслаўя. Галоўным правадніком палітыкі Контррэфармацыі былі езуіты. У 1569 г. у Вільню прыбыла першая група езуітаў, а ў 1570 г. была заснавана Віленская езуіцкая калегія. Галоўным ідэолагам Контррэфармацыі ў ВКЛ з'яўляўся езуіт П. Скарга (1536 – 1612). У 1573 г. сыны Мікалая Радзівіла Чорнага, а таксама магнат Ян Хадкевіч перайшлі ў каталіцкую веру. Колішнія пратэстанты з дробнай і сярэдняй шляхты сталі далучацца да каталіцкай царквы. У 1599 г. у Вільні кальвіністы і праваслаўныя стварылі канфедэрацыю для абароны сваіх інтарэсаў. Аднак наступленне Контррэфармацыі, раскол у пратэстанцкім асяроддзі, адсутнасць шырокай

сацыяльнай падтрымкі зрабілі незваротным працэс дэградацыі пратэстанцкага руху. Заключэнне Берасцейскай уніі 1596 г. – яшчэ адзін поспех Контррэфармацыі ў ВКЛ. Унія ўводзілася гвалтоўна, што справакавала рост сацыяльнага напружання ў грамадстве. Супраціўленне каталіцкай экспансіі вылівалася ў народныя паўстанні (напрыклад, Віцебскае паўстанне 1623 г.). У канцы XVI ст. рэфармацыйны рух ВКЛ пачаў згасаць, большасць кальвінісцкай шляхты стала пераходзіць у каталіцтва, а ў пачатку XVII ст. значная частка праваслаўнай шляхты прыняла унію. Паводле сеймавых пастаноў 1764 г., адступніцтва ад каталіцтва каралася выгнаннем з краіны або смерцю.

***Дзейнасць Жыгімонта Вазы.*** Польскі кароль Жыгімонт Ваза (1587 – 1632), сын шведскага караля Яна III Вазы і сястры Жыгімонта Аўгуста Кацярыны, на працягу свайго панавання імкнуўся зрабіць каталіцызм адзіным веравызнаннем у Рэчы Паспалітай. Жыгімонт Ваза, кіруючыся ідэяй каталіцкай экспансіі, пачаў вайну са Швецыяй, падтрымаў маскоўскую авантуру Ілжэдзмітрыя. Казацка-сялянская вайна сярэдзіны XVII ст., руска-польская вайна 1654 – 1667 гг., шведская інтэрвенцыя былі вынікам палітыкі Жыгімонта Вазы. Войны другой паловы XVII ст. знішчылі практычна ўсё беларускае мяшчанства. Толькі на пачатку XIX ст. колькасць жыхароў Беларусі дасягнула ўзроўню першай паловы XVII ст. Дэмаграфічная катастрофа і эканамічны заняпад суправаджаліся паланізацыяй усходнеславянскага насельніцтва ВКЛ і далейшым запрыгоньваннем беларускага сялянства.

## 9.2. Педагагічная дзейнасць езуітаў у Беларусі

***Віленская акадэмія.*** У ВКЛ былі накіраваны буйныя дзеячы ордэна езуітаў П. Скарга, М. Сміглецкі, З.Варшэвіцкі. З канца 60-х гг. XVI ст. езуіты стваралі навучальныя ўстановы сярэдняга ўзроўню – калегіумы. Першы з іх быў заснаваны ў Вільні ў 1570 г. Праз дзевяць гадоў ён атрымаў статус акадэміі. Кіраванне Віленскай акадэміяй было цэнтралізаваным, адсутнічала аўтаномія, выбарнасць рэктараў. Акрамя лацінскай мовы, у Акадэміі вывучалася грэчаская, больш сціпла – «русінская» і нямецкая. У малодшых класах і на школьных мерапрыемствах выкарыстоўвалася польская мова. Навучанне доўжылася 7 гадоў. У Акадэмію прымаліся і некатолікі. З 1599 г. у Акадэміі дзейнічала агульнаеўрапейская праграма адукацыі, распрацаваная езуіцкім ордэнам, – Ratio studiorum. Віленская акадэмія была цэнтральным звяном каталіцкай сістэмы адукацыі ў ВКЛ.

***Перыядызацыя педагагічнай дзейнасці ордэна езуітаў.*** Першы этап педагагічнай дзейнасці ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі: да канца першай паловы XVII ст.; другі этап: другая палова XVII ст. – 40-я гг. XVIII ст.; трэці этап: 40-я гг. XVIII ст. – 1773 г.; пачатак чацвёртага этапа супадае з момантам далучэння ўсходніх рэгіёнаў Беларусі да Расійскай імперыі, ён працягваўся да 1820 г. – часу выгнання езуітаў з Расійскай імперыі.

У першы перыяд дзейнасць ордэна была сканцэнтравана ў гарадах, дзе пераважаў уплыў рэфармацыйнага руху або праваслаўнай царквы. За гэты тэрмін езуіты стварылі сем вучэбных устаноў у Беларусі. Чатыры з іх з'яўляліся вышэйшымі (у Полацку, Нясвіжы, Оршы і Пінску). Пінская вышэйшая школа была прызначана для будучых функцыянераў ордэна. У Брэсце (1620) і Гародні (1621) дзейнічалі сярэднія вучэбныя ўстановы, у Віцебску (1648) – пачатковая школа. У 1648 – 1649 навучальным годзе 76,5 % педагогаў, якія працавалі ў школах ордэна на тэрыторыі Беларусі, з'яўляліся прафесарамі. Першай працу па падрыхтоўцы настаўнікаў рыторыкі пачала Полацкая калегія. Вялікі ўклад у падрыхтоўку настаўнікаў рыторыкі ў Полацку ўнеслі паэт і філосаф Мацей Казімір Сарбеўскі, філосаф Жыгімонт Лаўксмін. Вучнем полацкіх езуітаў з'яўляўся паэт-лацініст *Мікалай Кміціц* (1601 – 1632). У апошні перыяд працягвалі дзейнічаць вучэбныя ўстановы ордэна ў Полацку, Віцебску, Оршы, Мсціславе і Магілёве[30].

***Схаластычная філасофія.*** Схаластыка вызначала ўзровень навуковых ведаў і светапогляд грамадства эпохі Контррэфармацыі. Схаластычныя веды акумулявалі вопыт еўрапейскай філасофскай культуры некалькіх тысячагоддзяў. Поўны курс філасофіі быў разлічаны на тры гады. На працягу першага года вывучалася логіка (рацыянальная філасофія), другога – фізіка (прыродная філасофія), трэцяга – метафізіка і маральная філасофія. У Віленскім калегіуме арыстоцелеўская філасофія дапаўнялася платонаўска-стаічнай. Філасофію разумелі як універсальнае веданне. Філасофскія дысцыпліны дзяліліся на тэарэтычныя (логіка, фізіка, метафізіка) і практычныя (этыка, эканоміка, палітыка). Непасрэдна творы Арыстоцеля не вывучаліся. Выкладанне грунтавалася на каментарах да яго тэкстаў. Схаластыка дапускала для выкладчыка магчымасць акцэнтаваць увагу на той дысцыпліне, якая ўяўлялася яму найбольш важнай. Але ў цэлым у схаластычнай філасофіі перыяду Контррэфармацыі пераважаў інтарэс да логікі і фізікі.

---

[30] Блинова, Т. Б. Иезуиты в Беларуси: Роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т. Б. Блинова. – Гродно : ГрДУ, 2002. – С. 34.

*Сігізмунд Лаўксмін* (1596 – 1670) – тэолаг, аўтар шэрагу прац па рыторыцы і філасофіі. Вучыўся ў Полацку і Віленскім універсітэце. Выкладаў у Полацку, Нясвіжы, Вільні. Яго праца «Практычнае красамоўства, ці Падручнік рытарычнага мастацтва», якое вытрымала 13 выданняў, стала навучальным дапаможнікам у некалькіх краінах. Падручнік страціў сваё значэнне толькі ў канцы XVIII ст. С. Лаўксміну таксама належыць работа «Душа дыялектыкі...», якая з'яўлялася адлюстраваннем асноўных праблем логікі і філасофіі мовы познесхаластычных філосафаў[31].

*Лука Залускі* (1604 – 1676) – філосаф і педагог. Вучыўся ў Віленскай акадэміі. У 1669 г. атрымаў званне магістра філасофіі, а ў 1652 г. – доктара тэалогіі. Быў прапаведнікам у Вільні, Мінску і Нясвіжы. У 1640 г. выдаў кнігу «Універсальная філасофія». Кніга складаецца з дзвюх частак: практычная філасофія («Этыка», «Эканоміка», «Палітыка») і тэарэтычная філасофія («Логіка», «Натуральная філасофія», «Метафізіка»). Л. Залускі паставіў на першае месца навукі пра чалавека, акцэнтуючы іх практычныя задачы. Філасофія для яго найперш з'яўляецца «настаўніцай маралі»[32].

*Тэадор Білевіч* (сяр. XVII – пач. XVIII стст.) – дзяржаўны дзеяч ВКЛ, філосаф. Адукацыю атрымаў у Віленскай акадэміі (1672 – 1675). У 1675 г. Т. Білевіч выдаў у Вільні магістарскую дысертацыю «Філасофія рацыянальная, натуральная і маральная…». Вёў «Дзённік». Яго «Філасофія...» – пераказ курса, які ён вывучаў у Віленскай акадэміі. Работа Т. Білевіча дае ўяўленне пра змест філасофскай адукацыі ў ВКЛ у другой палове XVII ст. Т. Білевіч акцэнтаваў увагу на сацыяльна-этычных праблемах і даказваў карысць філасофіі ў справе выхавання грамадзян. З усіх філасофскіх дысцыплін Т. Білевіч аддаваў перавагу «філасофіі маральнай». Ён імкнуўся перадаць паняцце арыстоцелеўскага эўдэманізму, звяртаючыся да тэксту «Нікамахавай этыкі». Т. Білевіч быў знаёмы з тэорыяй «асвечанага абсалютызму»[33].

## 9.3. Палемічная літаратура

*Брэсцкая царкоўная унія 1596 года* стагоддзямі заставалася фактарам расколу для беларускага грамадства і на доўгі час вызначыла характар вострай публічнай дыскусіі. Палемічная літаратура, народжаная падзеямі Брэсцкай царкоўнай уніі, узнімала праблемы сацыяльна-палітычнага жыцця, пытанні захавання нацыянальнай культуры. Палемісты спрачаліся па

[31] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X – XIX ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 244 – 245.
[32] Тамсама. – С. 215 – 216.
[33] Тамсама. – С. 182.

пытаннях царкоўнага права, папскага прымату, паходжання Святога Духа, чыстца, цэлібату. Гістарычныя аргументы палемістаў ахоплівалі чатыры падзеі: хрышчэнне Русі, царкоўны раскол 1054 года, Фларэнтыйскі сабор (1438 – 1445) і Брэсцкі сабор 1596 года. Праваслаўны бок абапіраўся на гістарычныя дакументы, якія даводзілі кананічнае адзінства Кіеўскай мітраполіі з Царградскім патрыярхатам. Палемічная літаратура прадстаўлена рукапіснымі і друкаванымі помнікамі на царкоўнаславянскай, старабеларускай, польскай і лацінскай мовах. Палеміка стымулявала інтэлектуальнае ажыўленне ў ВКЛ. Палемічная літаратура мела форму адкрытых пасланняў, заклікаў, трактатаў, памфлетаў, пропаведзяў. Палемісты выкарыстоўвалі шырокі набор юрыдычных, гістарычных і рэлігійна-гістарычных аргументаў, а таксама разнастайных літаратурных прыёмаў. Большасць тэкстаў друкаваліся ў Вільні, Астрозе, Кіеве і Львове[34].

***Перыядызацыя.*** Гісторыю развіцця палемічнай літаратуры на беларускіх землях умоўна можна падзяліць на два перыяды: 1) 1580-я гг. – 1630 г.; 2) 1630 г. – канец XVII стагоддзя. Палемічныя творы першага перыяду былі больш вострымі, у другі перыяд яны набылі дагматычны характар. Прадстаўнікамі праваслаўнага лагера з’яўляліся Мялецій Сматрыцкі, Лявонцій Карповіч, Іаў Барэцкі, Андрэй Мужылоўскі, Захарый Капысценскі, Афанасій Філіповіч, Канстанцін Астрожскі. Уніятаў прадстаўлялі Іпацій Пацей, Іосіф Руцкі, Іасафат Кунцэвіч, Леў Крэўза, Анастасій Сялява, Ілля Марахоўскі. Вядучая роля ў палеміцы ў гэты перыяд належала з праваслаўнага боку Мялецію Сматрыцкаму, з уніяцкага – Іпацію Пацею, а потым Іосіфу Руцкому. Жорсткія ўмовы барацьбы абумовілі тое, што многія творы праваслаўных аўтараў выходзілі ананімна. З самага пачатку каталікі праводзілі агрэсіўную прапаганду ідэі уніі. Першымі ў літаратурнае адзінаборства ўступілі Пётр Скарга з Хрыстафорам Філалетам і Клірык Астрожскі з Іпаціем Пацеем[35].

Упершыню абгрунтаванне ідэі царкоўнай уніі было дадзена рэктарам Львоўскай калегіі Бенядзіктам Гербестам у трактаце «Вывады веры рымскай царквы і гісторыя грэчаскай няволі» (Львоў, 1586). Ён выступаў у абарону ўлады папы рымскага і каляндарнай рэформы, уведзенай папам Рыгорыем XIII у 1582 г. Яму адказаў Герасім Сматрыцкі, рэктар Астрожскай акадэміі («Ключ царства нябеснага»). Новую палеміку справакаваў твор езуіта *Пятра Скаргі* (1536 – 1612) «Аб адзінстве Боскай царквы пад адным

---

[34] Кароткі, У. Г. Палемічная літаратура / У. Г. Кароткі // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – С. 238 – 239.

[35] Падокшын, С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз) / С. А. Падокшын. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – С. 69 – 70.

пастырам і аб грэчаскім ад гэтага адзінства адступленні з перасцярогай і напамінкам рускім народам, якія стаяць пры грэках» (Вільня, 1577). Апалагетыкай уніі з'яўляўся твор П. Скаргі «Апісанне і абарона сабора рускага Берасцейскага» (1597). Ён абвінавацiў праціўнікаў уніі ў непадпарадкаванні дзяржаўнай уладзе, што надало рэлігійнай палеміцы палітычны характар. Аднаўленне ў 1620 г. Кіеўскай праваслаўнай мітраполіі зрабілася нагодай для з'яўлення твора М. Сматрыцкага «Верыфікацыя нявіннасці» (1621). Яму ў адказ выступіў уніяцкі мітрапаліт Іосіф Руцкі з трактатам «Двайная віна» (1621). М. Сматрыцкі па тэме гэтай спрэчкі напісаў «Абарону Верыфікацыі» і «Апендыкс на Экзамен абароны Верыфікацыі», а І. Руцкі – «Экзамен абароны». Да палемікі далучыліся дзяржаўныя дзеячы ВКЛ Ян Скумін-Тышкевіч, Мікалай Трызна, Адам Храптовіч, Юрый Мялешка. У 1621 г. пад іх аўтарствам з'явіўся «Ліст да манахаў манастыра Святога Духа», які быў накіраваны супраць трактатаў М. Сматрыцкага. У 40-я гг. XVII ст. у дыскусіях удзельнічалі Ян Дубовіч, Касьян Саковіч. У «Літасе» (Кіеў, 1644) П. Магіла раскрытыкаваў «Перспектыву» (Кракаў, 1642) К. Саковіча. Апошні адказаў творам «Кайло, або Молат на крушэнне камянёў схізмы» (Кракаў, 1646). Літаратурная палеміка паміж уніятамі і праваслаўнымі не спынялася да канца XVIII стагоддзя[36].

***Палемісты-ўніяты.*** *Іпацій Пацей* (1541 – 1613) прапанаваў шляхі пераадолення супярэчнасцяў паміж усходняй і заходняй хрысціянскімі цэрквамі («Унія грэкаў з рымскай царквой», 1595). Дактрына І. Пацея атрымала падтрымку польскага караля Жыгімонта Вазы. Апалагетыкай уніі з'яўляліся творы І. Пацея «Справедливое описанье поступку и справы сынодовое, и оборона згоды и едности свершенное, которая ся стала на сыноде Берестейском в року 1596» (1597), «Отпис на лист неякога Клирика Острожского безъименного» (1598), «Антырызіс» (1600), «Абарона Фларэнтыйскага сабора» (1603) і «Гармония, албо согласие веры» (1608).

*Іосіф Руцкі* (1573 ці 1574 – 1637) выступіў з планам заснаваць уласны патрыярхат у ВКЛ. Дадзены план пацвярджаў прэтэнзіі ўніяцкай царквы ВКЛ на ролю дзяржаўнай і прадугледжваў стварэнне монацаркоўнай, монаідэалагічнай дзяржавы.

***Праваслаўныя палемісты.*** Да значных твораў праваслаўнай палемічнай літаратуры належаць трактат *Стэфана Зізанія* «Казанье святого Кирилла Иерусалимского об антихристе» (1596), а таксама два палемічныя

[36] Марозава, С. В. Ідэя царкоўнай уніі ў грамадзка-палітычным жыцці Беларусі XV – пачатку XVI ст. / С. В. Марозава // Царква [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://pawet.net/library/history/bel_history/marozava/31/Ідэя царкоўнай уніі ў грамадзка-палітычным жыцці Беларусі XV – пачатку XVI ст.html. – Дата доступа: 09.08.2011.

лісты да І. Пацея і «Гісторыя аб Лістрыкійскім, гэта значыць бандыцкім Ферарскім, або Фларэнтыйскім саборы» *Клірыка Астрожскага* (1598).

Кніга *Хрыстафора Філалета* «Апокрисис, албо отповедь на книжкы о съборе Берестейском» (Вільня, 1597) прызнавалася адным з лепшых сатырычных твораў свайго часу. Х. Філалет дасціпна аспрэчваў аргументы П. Скаргі аб неабходнасці Брэсцкай уніі. Унія, згодна з Філалетам, – гэта не толькі палітычны, але і духоўны гвалт над усходнеславянскай культурай. Каб нейтралізаваць уздзеянне «Апокрисиса» на грамадства, уніяты знішчалі тыраж гэтай кнігі.

Вялікі рэзананс атрымалі творы *Мялеція Сматрыцкага* «Антыграфі» (1608) і «Фрынас» (1610). «Фрынас» («Плач») Тэафіла Арталога (псеўданім М. Сматрыцкага) – выдатны помнік беларускай палемічнай літаратуры, быў выкуплены каталікамі і спалены. Супраць М. Сматрыцкага выступілі П. Скарга з кнігай «На трены и плач Теофила Ортолога» (Кракаў, 1610) і ўніят Ілля Марахоўскі з «Парегорией» (1612). Яны абвінавацілі аўтара ў прапагандзе пратэстанцкіх ідэй. Польскі кароль Жыгімонт III сваім універсалам забараніў продаж і набыццё кнігі М. Сматрыцкага, аўтар і выдавец падлягалі арышту. У 1622 г. М. Сматрыцкі апублікаваў «Эленхус» з абвінавачваннем уніятаў у распальванні сацыяльнай варожасці. З аспрэчваннем выказванняў М. Сматрыцкага выступіў А. Сялява («Антыэленхус»). У 1622 г. М. Сматрыцкі надрукаваў «Юстыфікацыю нявіннасці», а ў 1623 г. – «Суплікацыю» – ліст да сенатараў і дэпутатаў вальнага сейма. Расчараваўшыся ў вышэйшым кіраўніцтве праваслаўнай царквы, М. Сматрыцкі перайшоў у лагер уніятаў. Тэарэтычныя аспекты уніі ён разглядзеў у трактатах «Апалогія» (1628), «Пра шэсць адрозненняў у вучэнні Усходняй і Заходняй цэркваў» (1628) і «Катэхізісе» (каля 1628). З крытыкай М. Сматрыцкага выступіў *Андрэй Мужылоўскі* ў творы «Антыдотум» (1629), на які М. Сматрыцкі адказаў «Экзетэзісам» (1629). Андрэй Мужылоўскі з’яўляўся таксама аўтарам «Адказу на ліст віленскіх уніятаў» (1616). Ён пісаў аб прыярытэце веры ўнутранай, духоўнай, у параўнанні з верай вонкавай, абрадавай, і лічыў немагчымым рацыянальнае Богапазнанне, сцвярджаў несумяшчальнасць веры і ведання, тэалогіі і філасофіі. Шырокі розгалас атрымаў «Сінопсіс» (Вільня, 1632) – праграмны твор праваслаўных публіцыстаў, падрыхтаваны для дэпутатаў канвакацыйнага сейма 1632 г. Дзейнасць сеймавай камісіі па ўрэгуляванні міжцаркоўных адносін у ВКЛ і Польшчы падрабязна адлюстравана ў творы «Суплементум Сінопсіс» (Вільня, 1632)[37].

[37] Марозава, С. В. Ідэя царкоўнай уніі ў грамадзка-палітычным жыцці Беларусі XV – пачатку XVI ст. / С. В. Марозава // Царква [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://pawet.net/library/history/bel_history/marozava/31/Ідэя царкоўнай уніі ў грамадзка-палітычным жыцці Беларусі XV – пачатку XVI ст.html. – Дата доступа: 09.08.2011.

**Крыніцы**

1. Памятники полемической литературы в Западной Руси. В 3 кн. // Русская историческая библиотека. – СПб. : Археографическая комиссия, 1878 – 1903.

**Літаратура**

1. Блинова, Т. Б. Иезуиты в Беларуси: Роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т. Б. Блинова. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 427 с.
2. Катлярчук, А. «Уцёкі мазгоў», ці Лёсы пратэстантаў Вялікага княства Літоўскага ў другой палове XVII стагоддзя / А. Катлярчук // Спадчына. – 2006. – № 1. – С. 65 – 78.
3. Короткий, В. С. Творческий путь Мелетия Смотрицкого / В. С. Короткий. – Минск : Наука и техника, 1987. – 190 с.
4. Коршунов, А. Ф. Афанасий Филиппович: жизнь и творчество / А. Ф. Коршунов. – Минск : Наука и техника, 1965. – 183 с.
5. Мараш, Я. Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569 – 1795) / Я. Н. Мараш. – Минск : Вышэйшая школа, 1971. – 272 с.
6. Падокшын, С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз) / С. А. Падокшын. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 111 с.
7. Саверчанка, І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока / І. Саверчанка. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 319 с.
8. Тананаева, Л. И. Сарматский портрет. Из истории польского портрета эпохи барокко / Л. И. Тананаева. – Москва : Наука, 1979. – 303 с.
9. Яскевіч, А. Падзвіжнікі і іх святыні: Духоўная культура старажытнай Беларусі / А. Яскевіч. – Мінск : Полымя, 2001. – 368 с.

# ТЭМА 10. СВЕЦКІ НАКІРУНАК БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ДУМКІ ПЕРЫЯДУ КОНТРРЭФАРМАЦЫІ

1. Накірункі грамадска-філасофскай думкі Беларусі ў XVII – першай палове XVIII стст.
2. Ідэі А. Алізароўскага, А. Волана, А. Валовіча, Л. Сапегі.
3. Атэізм і вальнадумства.

## 10.1. Накірункі грамадска-філасофскай думкі Беларусі ў XVII – першай палове XVIII стст.

У XVII – першай палове XVIII стст. грамадска-палітычнае жыццё ВКЛ развівалася пад знакам Контррэфармацыі. У філасофскай і грамадска-палітычнай думцы гэтага часу налічвалася чатыры накірункі: рэнесансна-гуманістычны, да якога прымыкаў нацыянальна-вызваленчы рух, схаластычны арыстацелізм, эклектычная філасофія і навуковая раннеасветніцкая думка.

Рэнесансная традыцыя, якая працягвалася ў творчасці Чаховіца, Лована, Лышчынскага, Л. Зізанія, сутыкнулася з каталіцкай рэакцыяй і рэлігійнай нецярпімасцю. Таму элементы матэрыялізму і атэізму, што праяўля-

ліся ў грамадскай думцы XVI ст., саступілі месца схаластыцы і эклектыцы. Аднак новаеўрапейскія ўплывы паступова разбуралі схаластычна-эклектычныя настроі і стымулявалі развіццё навукі і філасофскіх пошукаў. Грамадска-палітычная думка нацыянальна-вызваленчага руху знайшла адлюстраванне ў творах Васіля Цяпінскага, Мялеція Сматрыцкага, Афанасія Філіповіча, Стэфана Зізанія, Хрыстафора Філалета, Андрэя Мужылоўскага.

У канцы XVI – XVII ст. у ВКЛ з'явілася *«прафесійная філасофія»* – схаластычны арыстацелізм, які выкладаўся ў каталіцкіх калегіумах дактарамі філасофіі. Схаластыкам быў уласцівы традыцыяналізм, антыіндывідуалізм. Аднак пад уплывам новых ідэйных тэндэнцый узнікалі спробы выкладаць філасофію ў гуманістычным аспекце (Л. Залускі, С. Лауксмін, Т. Білевіч).

Пад уплывам новых ідэй з сярэдзіны XVIII ст. у ВКЛ схаластыка пераўвасабляецца у так званую *«эклектычную філасофію»*. Афармляюцца антысхаластычныя і прыродазнаўчанавуковыя накірункі філасофскіх даследаванняў, прадстаўленыя імёнамі А. Скарульскага, С. Шадурскага, Б. Дабшэвіча, К. Нарбута. За гэтай плынню замацаваўся тэрмін «эклектыка».

## 10.2. Ідэі А. Алізароўскага, А. Волана, А. Валовіча, Л. Сапегі

*Арон Алізароўскі* (1618 – 1659) – прадстаўнік свецкага накірунку ў сацыялагічнай і палітыка-прававой думцы ВКЛ XVII ст. Нарадзіўся ў праваслаўнай сям'і на беларускім Падзвінні. З'яўляўся прафесарам права Віленскай акадэміі. У сваіх работах цытаваў і аналізаваў творы больш як 250 аўтараў.

А. Алізароўскі распрацоўваў тэорыі натуральнага права і грамадскага дагавору («Аб палітычнай супольнасці людзей», Гданьск, 1651). Паводле класіфікацыі Алізароўскага, існуюць боскае, натуральнае права і права народаў. Боскае права забараняе несправядлівасць. Прырода і розум выступілі ў філосафа як зыходныя ўзаемадапаўняльныя перадумовы права. Паводле канцэпцыі А. Алізароўскага, існуюць тры віды свабоды: прававая, філасофская і палітычная. Прававая свабода – гэта здольнасць людзей у адпаведнасці з прыроднай і агульнай годнасцю распараджацца сваім жыццём паводле ўласнага разумення і патрабаванняў закону, філасофская – улада розуму над эмоцыямі, палітычная – панаванне ў грамадстве права.

У Рэчы Паспалітай грамадзянамі – «народам палітычным» – была толькі шляхта. А. Алізароўскі лічыў, што грамадзянскія правы мусяць мець усе жыхары дзяржавы, акрамя рабоў і іншаземцаў. А. Алізароўскі пісаў пра злачыннасць улады паноў над жыццём сялян. Грамадзяне ўсіх саслоўяў, на думку філосафа, павінны быць роўнымі перад законам і мець магчымасць свабоднага пераходу з аднаго саслоўя ў іншае.

Ігнараванне прынцыпаў грамадскага дагавору, на думку А. Алізароўскага, вядзе да самазнішчэння дзяржавы. Разбуральнымі фактарамі ў Рэчы Паспалітай з'яўляюцца адсутнасць законнасці і справядлівасці, няроўнасць, эгаізм пануючых саслоўяў. Сімпатыі А. Алізароўскага на баку спадчыннай манархіі, і ў той жа час ён быў праціўнікам тыраніі. На яго думку, народ павінен мець права на паўстанне[38].

*Андрэй Волан* (1530 – 1610) – грамадска-палітычны дзеяч, філосаф, пратэстанцкі ідэолаг, літаратар. Аўтар каля сарака твораў – багаслоўскіх і палітыка-праававых трактатаў, прац па этыцы.

Некаторыя даследчыкі прыпісваюць А. Волану аўтарства твора «Размова паляка з літвінам», прысвечанага разгляду ўмоў магчымай уніі паміж Польшчай і ВКЛ, а таксама крытыцы шляхецкага самаўладства і асуджэнню прыгнёту шляхтай сялян[39]. А. Волан удзельнічаў у шматлікіх дыспутах з П. Скаргам, Ф. Соцынам. Творы А. Волана перакладаліся гугенотамі ў Францыі, кальвіністамі ў Германіі і ўключаліся Ватыканам у Індэкс забароненых кніг. У сваіх творах А. Волан закранаў палітычныя і сацыяльныя тэмы. Адзін з галоўных твораў А. Волана – трактат «Аб палітычнай і грамадзянскай свабодзе» (1572), у якім разглядаюцца пытанні роўнасці ўсіх саслоўяў. На аснове прац Арыстоцеля, Платона, Цыцэрона А. Волан сцвярджаў, што «свабода найбольш пасуе да чалавечай натуры».

*Астафій Багданавіч Валовіч* (1520 – кан. 1587) – дзяржаўны і грамадскі дзеяч. Разам з віленскім ваяводам і канцлерам Мікалаем Радзівілам Рудым, жамойцкім старостам Янам Хадкевічам, падскарбіем Мікалаем Нарушэвічам прапанаваў г.зв. «Праект уніі», які гарантаваў ВКЛ адносную незалежнасць у саюзе з Польшчай. Прымаў удзел у аграрных рэформах 1550 – 1560-х гг. Сумесна з юрыстамі А. Ратундусам і П. Раізіем рыхтаваў Статут ВКЛ 1566 г. Разам з Мікалаем Радзівілам Чорным, Мікалаем Радзівілам Рудым, Янам Кішкам быў апекуном рэфармацыйнага руху ў ВКЛ. У канцы жыцця прыхільна ставіўся да антытрынітарызму. Падтрымліваў В. Цяпінскага, Якуба з Калінаўкі і С. Буднага. С. Будны прысвяціў Валовічу кнігу «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам» (Нясвіж, 1562).

*Леў Іванавіч Сапега* (1557 – 1633) – дзяржаўны дзеяч, публіцыст. Л. І. Сапега за сваё жыццё неаднаразова змяняў веравызнанне і вернасць палітычным групоўкам. Спачатку ён перайшоў з веры продкаў – праваслаўя – у кальвінізм, а ў 1588 г. выракся пратэстантызму і прыняў каталіц-

---

[38] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X – XIX ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 169 – 170.

[39] Бортнік, І. А. «Размова паляка з літвінам» / І. А. Бортнік // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т. Т. 2: Протарэнесанс і Адраджэнне / С. І. Санько [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – С. 644 – 645.

тва. У 1596 г. Л. І. Сапега падтрымліваў ідэю царкоўнай уніі. Ён разважаў, што грэка-каталіцкая царква паспрыяе ўмацаванню ВКЛ і пазбавіць яе ад унутраных канфліктаў. Прытым Л. І. Сапега зарэкамендаваў сябе праціўнікам гвалту над праваслаўным насельніцтвам пры ўсталяванні уніі. Выказваўся ў духу еўрапейскага гуманізму аб неабходнасці незалежнасці і свабоды чалавека, застаючыся адным з найбольш буйных уладальнікаў прыгонных сялян у ВКЛ. З постаццю Л. І. Сапегі звычайна звязваюць падрыхтоўку і выданне Статута ВКЛ 1588 г., які юрыдычна канчаткова афарміў сістэму прыгону ў Беларусі.

## 10.3. Атэізм і вальнадумства

*Атэізм* (ад грэч. бязбожнасць) – сістэма матэрыялістычных поглядаў, якая не прызнае існаванне Бога і іншых звышнатуральных сіл і сцвярджае аб'ектыўна абумоўлены характар паходжання і развіцця прыроды, грамадства, чалавека. Атэізм адмаўляе існаванне замагільнага свету і дае ўласнае тлумачэнне зямнога жыцця і яго сэнсу, духоўных каштоўнасцей, сутнасці сацыяльнага развіцця. Ад атэізму трэба адрозніваць вальнадумства, рэлігійны скептыцызм, дэізм і пантэізм. Атэізм як сістэма поглядаў узнік у Старажытнай Грэцыі на базе матэрыялізму і стыхійнай дыялектыкі. У Новы час пазіцыі атэізму ўзмацнялі навуковыя адкрыцці М. Каперніка, Г. Галілея, Дж. Бруна, пазней – развіццё прыродазнаўства і матэрыялізму Новага часу (Ф. Бэкан, Д. Дзідро, Л. Феербах).

Вальнадумства аказала моцнае ўздзеянне на развіццё культуры Беларусі. Элементы вальнадумства прысутнічаюць ужо ў ерасях XIV – XV стст. Якасна новы характар вальнадумства набыло ў эпоху Адраджэння. Заснаваны Ф. Скарынам гуманістычна-асветніцкі накірунак вальнадумства ў XVI – XVII стст. быў развіты ў творчасці С. Буднага, В. Цяпінскага, Л. Зізанія. Вяршыняй вальнадумства ў Беларусі ў XVII ст. сталі ідэі К. Лышчынскага. Жорсткія рэпрэсіі вымушалі беларускіх вальнадумцаў ствараць парадыйныя і сатырычныя ананімныя творы: «Прамовы Мялешкі» (першая палова XVII ст.), «Ліст да Абуховіча» (1655)[40].

*Казімір Лышчынскі* (1634 – 1689) – філосаф, пакутнік за атэістычныя перакананні, вядомы па пяці фрагментах трактата «Пра неіснаванне Бога», а таксама па матэрыялах следства. У 1658 г. К. Лышчынскі ўступіў у ордэн езуітаў, працаваў у езуіцкіх школах. У 1666 г. ён выйшаў з ордэна. На падставе пяці фрагментаў з твора К. Лышчынскага «Пра неіснаванне Бога»

[40] Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. даведнік / рэд. Г. П. Пашкоў. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – С. 23 – 24.

цяжка даць цэласную характарыстыку поглядаў вальнадумца. Даследчыкі адзначаюць высокі ўзровень ведання К. Лышчынскім еўрапейскай філасофіі. Апаненты К. Лышчынскага лічылі яго паслядоўнікам эпікурэйскай атамістычнай канцэпцыі, у адпаведнасці з якой свет уяўляе сабой выпадковую камбінацыю атамаў. К. Лышчынскі нібыта адмаўляў біблейскія цуды, Боганатхнёнасць Бібліі. Яму прыпісвалася словы аб тым, што прырода з'яўляецца прычынай самой сябе. Бог, мяркуючы па назве трактата, на думку філосафа, не існуе. Няма і прыроджанай ідэі Бога. Ён з'яўляецца хімерай чалавечай свядомасці, якую выкарыстоўваюць царква і дзяржава ў сваіх мэтах. Тэолагі пры абгрунтаванні догмаў рэлігіі робяць свядомы падман. Матэрыялістычны падыход К. Лышчынскага выяўляўся таксама ў адмаўленні неўміручасці душы, замагільнага жыцця, пекла і раю[41].

### Крыніцы


1. Алізароўскі, А. О политической общности людей / А. Алізароўскі // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 128 – 143.

2. Білевіч, Т. Філасофія рацыянальная, натуральная і маральная / Т. Білевіч // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 154 – 163.

3. Волан, А. О государе и его личных добродетелях / А. Волан // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 44 – 54.

4. Залускі, Л. Агульная філасофія / Л. Залускі // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 91 – 109.

5. Лаўксмін, С. Практычнае красамоўства. Сутнасць дыялектыкі / С. Лаўксмін // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 109 – 127.

6. Сапега, Л. Юзафату Кунцевичу от 12 марта 1622 г. / Л. Сапега // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 70 – 79.


### Літаратура


1. Голенченко, Г. Я. Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI – середине XVII в. / Г. Я. Голенченко. – Минск : Навука і тэхніка, 1989. – 302 с.

2. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.) / ред. К. П. Буслов [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1973. – 556 с.


[41] Рэлігія і царква на Беларусі : Энцыкл. даведнік / рэд. Г. П. Пашкоў. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – С. 183.

# ТЭМА 11. ЭСТЭТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ ЭПОХІ КОНТРРЭФАРМАЦЫІ

Тэрміны: *беларуская рэзь, віленскае барока, вялікі стыль, іканапіс, сармацкі партрэт.*

1. Асаблівасці беларускага барока.
2. Эстэтычныя погляды прадстаўнікоў эпохі Контррэфармацыі ў Беларусі.

## 11.1. Асаблівасці беларускага барока

Культура Беларусі XVII – XVIII стст. развівалася ў межах *вялікага стылю барока*, які не толькі ўплываў на мастацтва, але і ахапіў сферы грамадска-палітычнай думкі, побыту. Адначасова адчуваўся магутны ўплыў візантыйскай мастацка-філасофскай спадчыны. Заставаліся актуальнымі асобныя рысы мастацкай сістэмы Рэнесансу, з'яўляліся элементы ранняга класіцызму і Асветніцтва.

Барока яшчэ называюць «стылем Контррэфармацыі». Стварэнне новай рэлігійнай вобразнасці звязана з Трыдзенскім саборам (1545 – 1547, 1547 – 1549, 1551 – 1552, 1562 – 1563). Рашэнні Трыдзенскага сабора сталі праграмай Контррэфармацыі.

Шырокае распаўсюджанне стылю барока на беларускіх землях абумоўлена экспансіяй каталіцкай царквы і ў першую чаргу – дзейнасцю езуітаў. Храналагічна эпоха барока абмяжоўваецца маньерызмам (XVI ст.) і ракако (другая палова XVIII ст.). Вылучаюць ранняе барока (канец XVI – першая палова XVII стст.), сталае барока (сярэдзіна XVII – другая палова XVII ст.), позняе барока (XVIII ст.). Адрозніваюць высокае, сярэдняе і нізавое барока. Высокае барока прадстаўлена рэлігійнай мураванай архітэктурай, партрэтным жывапісам, дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, скульптурнай пластыкай, надмагільнікамі, алтарамі, аб'ёмнай разьбой, інтэр'ерамі палацаў, вырабамі мануфактур. Сярэдняе барока ўключае мастацкае аздабленне жылля сярэднезаможнай шляхты і гараджан, уніяцкіх, драўляных каталіцкіх і праваслаўных храмаў. Да нізавога барока належаць праявы культуры ніжэйшых слаёў грамадства – у асноўным творы паэзіі, музыкі, элементы аздаблення грамадска-архітэктурных пабудоў[42].

Беларускае барока можна аднесці да паўночнаеўрапейскай галіны. Яно адрозніваецца шэрагам рысаў: стылістычнай сінкрэтычнасцю, лаканічнасцю і манументальнасцю форм. На фарміраванне архітэктуры бела-

[42] Лазука, Б. А. Беларускае барока: Гісторыка-тэарэтычныя праблемы стылю / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2001. – С. 10 – 14.

рускага барока аказала ўплыў крэпаснoe і народнае дойлідства. У другой палове XVIII ст. у ВКЛ сфарміраваўся арыгінальны архітэктурны стыль, блізкі да ракако, – віленскае барока (Сафійскі сабор у Полацку, касцёл жаночага бернардынскага манастыра ў Мінску)[43].

***Беларускі іканапіс.*** Іканапіс – старажытны від рэлігійнага мастацтва. Беларуская ікона сумяшчае праваслаўную кананічную традыцыю выяўлення сакральнага і адначасова матэрыялізм заходнееўрапейскага рэлігійнага жывапісу. У Беларусі ў XVII – XVIII стст. ікона фактычна ўзяла на сябе функцыі бытавога жанру, нацюрморта, пейзажа. Эстэтыка іконы ўяўляе сабой сінтэз візантыйскай кананічнай іконы, еўрапейскага станковага жывапісу і мясцовых жывапісных традыцый, распачатых фрэскамі полацкіх праваслаўных Спаса-Еўфрасіннеўскага храма і Сафійскага сабора.

Беларуская іканапісная школа адрознівалася рэалістычнымі выявамі прадметаў побыту, краявіду, людзей. Постаці малююцца аб'ёмнымі, што парушае іканапісны прынцып, у адпаведнасці з якім фігуры павінны быць падкрэслена бесцялесныя. Згодна з канонам, фон іконы залатога колеру, будынкі – абстракцыя, вопратка – грэка-візантыйская. У сюжэт беларускіх ікон уведзены рэальныя архітэктурныя помнікі, вопратка людзей па тагачаснай модзе. Беларуская ікона мае прасторавую глыбіню. На шэрагу ікон прысутнічае лінейная перспектыва, недапушчальная ў кананічным іканапісе. Памеры фігур святых суадносяцца не з іх кананічным статусам, а з месцам у прасторы. Фон беларускіх ікон раслінна-арнаментаваны, упрыгожаны ляпным ці ціснёным пазалочаным арнаментам. На шэрагу ікон арнаментаваны німб. Арнамент з часам выцясняецца архітэктурнымі пейзажамі і драпіроўкамі. У беларускай іконе прысутнічае рамка, якая выступае за межы іканапіснай плоскасці. На беларускай іконе можна сустрэць подпіс аўтара, што супярэчыць іканапісным правілам[44].

Рысы беларускай іканапіснай школы фіксуюцца з XVI стагоддзя. У гэты час на іконах «Маці Божая Адзігітрыя» (канец XV – пач. XVI стст.), «Параскева» з'явіліся аб'ёмныя мадэліроўкі, рэалістычныя твары, раслінны арнамент. У XVII стагоддзі гэтыя рысы зрабіліся агульнараспаўсюджанымі. Шэдэўр гэтага перыяду – ікона «Раство Багамацеры» *Пятра Еўсяевіча* 1649 г. Сярод выдатных узораў беларускага іканапісу другой паловы XVII стагоддзя – «Параскева з жыццём», «Багамацер Адзігітрыя Баркалабаўская», «Сашэсце ў пекла». У XVIII стагоддзі традыцыі мясцовага іканапісу цесна ўзаемадзейнічалі з дасягненнямі культур барока і ракако («Аў-

[43] Дубянецкі, Э. С. Барока / Э. С. Дубянецкі // Культуралогія: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2003. – С. 43 – 45.
[44] Іканапіс Беларусі XV – XVIII стст. / склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь. – 1998. – С. 5 – 9.

рамій і Меркурый Смаленскія», «Цалаванне Іаакіма і Ганны», «Пакланенне вешчуноў»). Самабытнай з'явай беларускага іканапісу гэтага часу з'яўляўся феномен прымітыўнага мастацтва (іконы «Святое сямейства», «Цуд Георгія аб змеі»). Такім чынам, беларуская ікона эпохі барока стылістычна знаходзілася паміж традыцыямі візантыйскага іканапісу і еўрапейскага рэлігійнага жывапісу[45].

***Сармацкі партрэт.*** Акрамя іконы, спецыфічныя рысы мае і беларускі партрэтны жывапіс эпохі. У Беларусі працавалі выхадцы і прадстаўнікі розных краін і школ. Паказальныя партрэты Крыштафа Весялоўскага і Грызельды Сапегі, нясвіжскі партрэт Януша Антонія, галерэя партрэтаў выкладчыкаў езуіцкага калегіума ў Полацку, мінскі партрэт (верагодна) Ігнація Завішы. У гэтых працах прысутнічаюць спецыфічныя мясцовыя рысы – шляхецкі сарматызм, рэалістычная непасрэднасць, іканапісны мастацкі канон (плоскаснасць, зваротная перспектыва).

***Магілёўская і Віцебская жывапісныя школы.*** У сярэдзіне XVII стагоддзя фарміруецца Магілёўская жывапісная школа, а ў сярэдзіне XVIII стагоддзя – Віцебская.

Адной з асноўных стылістычных асаблівасцяў Магілёўскай школы з'яўляецца тэхніка пазалочаных фонаў са стылізаваным раслінным арнаментам. Дадзенай школе ўласцівы мастацкі рэалізм. Карціны Віцебскай школы адрозніваюцца большай выразнасцю і яркасцю фарбаў. У стылістычных адносінах Віцебская школа з'яўляецца пераемніцай Магілёўскай. Магілёўскія і віцебскія мастакі пісалі з натуры. Дзякуючы іх творчасці, захаваліся ўнікальныя рысы людзей таго часу, вопраткі, інтэр'ера. Яны адлюстравалі эстэтычныя ўяўленні і густы эпохі.

Разьбярства па дрэве ў Беларусі XVII стагоддзя дасягнула значнага развіцця, аформіўшыся ў спецыфічны стыль – г.зв. «*беларуская рэзь*». Многія беларускія майстры апынуліся ў Маскве. Тут яны стварылі шэраг каштоўных эстэтычных твораў у Нова-Дзявоцкім манастыры і ў Каломенскім палацы. Асаблівасцю беларускага разьбярства было ўжыванне шматлікіх калон, пакрытых ажурным дэкорам, наяўнасць ярусаў у іканастасах.

## 11.2. Эстэтычныя погляды прадстаўнікоў эпохі Контррэфармацыі ў Беларусі

У грамадска-палітычным жыцці Беларусі з сярэдзіны XVII стагоддзя абвастраюцца нацыянальныя і рэлігійныя супярэчнасці. У мастацкай сферы адбываецца канфрантацыя дзвюх тэндэнцый: свецкай традыцыі і тэала-

[45] Іканапіс Беларусі XV – XVIII стст. / склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь. – 1998. – С. 10 – 18.

гічнай эстэтыкі. Апошняя шырока прадстаўлена ў творчасці езуітаў. У езуіцкіх калегіумах вывучаліся Вяргілій, Гарацый, трактаты Цыцэрона, Салюстыя. Прамоўніцкае мастацтва – адна з галоўных складовых частак езуіцкай эстэтыкі. Выдадзеныя трактаты езуітаў, як правіла, з'яўляліся пераказам курсаў лекцый, якія чыталіся ў езуіцкіх калегіумах у Полацку, Мінску, Слуцку, Шчучыне. Акрамя тэарэтычных палажэнняў, у іх уключаліся практыкаванні па стылістыцы, вершаскладанню, утрымліваліся архітэктурныя чарцяжы, ноты.

Наступ каталіцкай рэакцыі не спыніў развіццё народнай творчасці. Змрочная рэальнасць не пазбавіла беларусаў пазітыўнага светапогляду: народная творчасць нараджала ў гэты час гумарыстычныя творы, узоры любоўнай лірыкі. Беларуская народная эстэтыка ўплывала на станаўленне прафесійнага мастацтва ў ВКЛ – архітэктуры, жывапісу, музыкі, прыкладнога мастацтва, палемічнай літаратуры.

***Эстэтычныя погляды пісьменнікаў-палемістаў.*** Значнае распаўсюджанне атрымалі на беларускіх землях творы *Лазара Барановіча* – украінскага царкоўнага, палітычнага і літаратурнага дзеяча. Яго ідэі атаясамлення паняцця прыгажосці з Радзімай і маці былі сугучныя поглядам Сімяона Полацкага. Эстэтычныя погляды Л. Барановіча ўяўляюць сабой сінтэз народнай эстэтыкі і хрысціянскіх канцэпцый прыгажосці. Л. Барановіч ведаў антычную міфалогію, творы рымскіх пісьменнікаў. Для яго характэрна тэалагічная трактоўка прыгажосці. Боская прыгажосць выяўляецца ў постаці Бога. Блізкія эстэтычныя канцэпцыі сустракаюцца і ў Транквіліёна, які бачыў цяжкасці ў магчымасці ўвасаблення прыгажосці ў мастацтве. Барановіч, Транквіліён, Карповіч, Сматрыцкі паступова вызваляюцца ад уплыву эстэтычных ідэй Рэнесансу[46].

*Лявонцій Карповіч* выдатна валодаў эстэтычнай тэрміналогіяй. Эстэтычныя ацэнкі ў яго былі звязаны з маральна-рэлігійнымі. Для Л. Карповіча вышэйшая каштоўнасць, этычная і эстэтычная, – вера. Фізічная прыгажосць, па меркаванні філосафа, – часовая, цела чалавека – хваравітая форма. Аднак у Л. Карповіча можна знайсці і пазітыўныя выказванні ў адносінах да зямной прыгажосці, развагі аб адзінстве ўтылітарнага і эстэтычнага[47].

*Мялецій Сматрыцкі*, падобна да Л. Карповіча, бачыў прыгажосць у праваслаўнай веры. У сваім палемічным творы «Фрынас, або Плач усходняй царквы» ён малюе вобраз жанчыны, некалі прыгожай, а цяпер зганьба-

[46] Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст. У 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII ст. / рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – С. 494 – 500.
[47] Тамсама. – С. 565 – 580.

ванай, як сімвал праваслаўнай царквы, якая зазнала рэпрэсіі ў ВКЛ. У разуменні прыгажосці М. Сматрыцкі абапіраецца на народныя ўяўленні, у якіх нябесныя свяцілы разглядаюцца як эталон прыгажосці. У палемічных творах М. Сматрыцкага часта выкарыстоўвацца эстэтычная тэрміналогія. Ён эмацыйна асуджае агідныя з'явы, звязаныя з рэпрэсіямі супраць праваслаўных у ВКЛ. Крытыка папства ў М. Сматрыцкага вобразная і экспрэсіўная. Філосаф разглядаў таксама праблемы рыторыкі і паэтыкі[48].

Містычныя алегорыі ва ўспрыманні эстэтычнага ярка адбіліся ў творчасці *Афанасія Філіповіча*. У яго «бачаннях» выяўляецца жудаснае і прыгожае, пераплятаюцца «божыя знакі» і натуралістычныя элементы рэальнасці. Вобразна-містычнае з'явілася асноўнай формай выяўлення эстэтычнага ў творчасці А. Філіповіча.

Да беларускай палемічнай літаратуры адносяцца таксама «Прамова Мялешкі» і «Ліст да Абуховіча». Абодва помнікі асуджаюць захапленне замежнымі модамі, супрацьпастаўляючы ім беларускія нацыянальныя фасоны і стравы. Напрыклад, у «Прамове Мялешкі» з агідай апісваецца непрактычнасць замежнай вопраткі.

Такім чынам, рэлігійнае супрацьстаянне прыводзіла палемістаў да пошуку эстэтычнага толькі ў сваёй веры. Аднак эстэтычныя прынцыпы ў прадстаўнікоў палемікі супадалі.

Творчасць *Сімяона Полацкага* (Самуіл Гаўрылавіч Пятроўскі-Сітніяновіч; 1629 – 1680) – адна з вяршынь развіцця грамадска-палітычнай і эстэтычнай думкі ў Беларусі і Расіі XVII стагоддзя. Сімяон Полацкі атрымаў выдатную адукацыю ў Кіева-Магілянскай калегіі. У 1656 г. ён прыняў манаства і пачаў выкладаць у полацкай брацкай школе паэтыку, рыторыку і славянскія мовы. У 1664 г. Сімяон Полацкі з'ехаў з роднага горада ў Маскву, дзе прысвяціў сябе педагагічнай і выдавецкай дзейнасці. Ён выкладаў латынь дзяржаўным чыноўнікам, вучыў царскіх дзяцей, адкрыў у Крамлі так званую «верхнюю» друкарню. Творчасць Сімяона Полацкага – яркага прадстаўніка стылю барока ў паэзіі – можна падзяліць на два перыяды: беларускі (1654 – 1664) і маскоўскі (1664 – 1680). Паэтычная творчасць пісьменніка зазнала ўплывы польскай і заходнееўрапейскай традыцый, а таксама звязана з беларускай народнай творчасцю, што выяўляецца ў структуры фразы, наяўнасці гутарковых інтанацый і элементаў народнага гумару. Сімяон Полацкі лічыў, што мастацкая творчасць мае адносіны

---

[48] Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст. У 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII ст. / рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – С. 545 – 560.

толькі да «цялеснай» – вонкавай – формы. Мастак павінен імкнуцца, як да ідэалу, да дакладнага адлюстравання прадметаў; ён падобны да пчалы, якая збірае ад «духмяных кветак прыгожае і карыснае»[49].

*Мацей Казімір Сарбеўскі* (1595 – 1640) – паэт, філасаф, педагог. Аўтар трактатаў «Багі язычнікаў, альбо Тэалогія, філасофія прыроды і этыка, палітыка, эканоміка, астраномія і іншыя мастацтвы і навукі, якія змяшчаюцца ў міфах паганскай тэалогіі», «Аб трагедыі і камедыі, альбо Сенека і Тэрэнцый», «Лірычныя характары, альбо Гарацый і Піндар», «Аб вартасцях і недахопах лірычнага верша, альбо Авідзій», «Аб жарце і дасціпнасці, альбо Сенека і Марцыял». Трактат «Багі язычнікаў» М. К. Сарбеўскага – своеасаблівая энцыклапедыя антычнасці. Мэтай кнігі з’яўляецца хрысціянская рэабілітацыя антычнай міфалогіі, раскрыццё філасофскага і эстэтычнага значэння старажытных міфаў. У курсах паэтыкі, якія М. К. Сарбеўскі чытаў у езуіцкіх калегіумах, ён сфармуляваў ідэю аўтаномнасці мастацтва. Свет мастацтва выступае ідэальнай рэальнасцю, якую стварае мастак. Найвышэйшы від мастацтва, паводле М. К. Сарбеўскага, – эпічная паэзія. Яна робіць магчымым мастацкае пранікненне ў сутнасць рэчаў[50].

**Крыніцы**

1. Прамова Івана Мялешкі // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 630 – 633.

2. Сарбеўскі, М. Багі язычнікаў / М. Сарбеўскі // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 81 – 90.

3. Полоцкий, Симеон. Вирши / Симеон Полоцкий; сост., подг текстов, вступ. ст. и комм. В. К. Былинина, Л. У. Звонаревой. – Минск : Мастацкая літаратура, 1990. – 447 с.

**Літаратура**

1. Конон, В. От Ренессанса к классицизму. Становление эстетической мысли Белоруссии в XVI – XVIII вв. / В. Конон. – Мінск : Наука и техника, 1978. – 158 с.

2. Мальдзіс, А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палова XVII – XVIII ст.) / А. І. Мальдзіс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 352 с.

[49] Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст. У 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII ст. / рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – С. 657 – 680.

[50] Конон, В. От Ренессанса к классицизму. Становление эстетической мысли Белоруссии в XVI – XVIII вв. / В. Конон. – Мінск : Наука и техника, 1978. – С. 56 – 64.

# ТЭМА 12. АСАБЛІВАСЦІ СТАНАЎЛЕННЯ ІДЭАЛОГІІ АСВЕТНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ

Тэрміны: *механіцызм, шубраўцы, рацыяналізм, сенсуалізм, эклектычная філасофія, эмпірызм.*

1. Характэрныя рысы новаеўрапейскай філасофіі.
2. Філасофскія погляды эклектыкаў.
3. Эпоха Асветніцтва на беларускіх землях..

## 12.1. Характэрныя рысы новаеўрапейскай філасофіі

XVII стагоддзе – перыяд фарміравання новай індустрыяльнай цывілізацыі. У гэты час зрабіліся запатрабаванымі тыя навуковыя дысцыпліны, якія забяспечвалі рашэнне практычных задач. Г. Галілей, Б. Паскаль, Р. Бойль стваралі доследна-эксперыментальнае матэматызаванае прыродазнаўства, аснову якога складала механіка. Змяняўся ідэал навуковага пазнання. Эксперымент, аналіз, класіфікацыя, абагульненне рабіліся асноўнымі прыёмамі навуковага даследавання. Узнік новы напрамак эксперыментальнай навукі – *эмпірызм.*

Эмпірызм абапіраецца на *сенсуалізм* (лац. *sensus* – пачуццё, адчуванне), які абсалютызаваў ролю пачуццяў у пазнанні. Метадалагічнай асновай эмпірызму з’яўляецца індукцыя. Гэты метад быў распрацаваны англійскім філосафам *Ф. Бэканам.* Ён лічыў, што свабодны розум прызнае толькі аўтарытэт факта. Пазнанне – гэта пераход ад аднаго факта да другога, адсячэнне выпадковага і фармулёўка агульнай высновы. Веды, атрыманыя такім чынам, могуць быць адноўлены і пацверджаны ў новым месцы. Ідэя эмпірызму, сфармуляваная Ф. Бэканам, развівалася на матэрыялістычнай аснове *Т. Гобсам* і *Дж. Локам,* а яе суб’ектыўна-ідэалістычная інтэрпрэтацыя была дадзена *Д. Юмам* і *Д. Берклі.*

Эмпірызм забяспечваў пазнанне тых уласцівасцей, якія ляжалі на паверхні. Аднак пэўныя глыбінныя ўласцівасці нельга вывесці з пачуццёвага вопыту. *Рацыяналізм* (лац. *ratio* – розум) аддаваў перавагу розуму як больш эфектыўнаму сродку пазнання. Пачынальнікам рацыяналістычнай традыцыі ў новаеўрапейскай філасофіі быў французскі філосаф *Р. Дэкарт.* Пачаткам усякага пазнання ён лічыў метадычны сумнеў. Кожную з’яву неабходна падвергнуць сумненню, з дапамогай аналізу пад кантролем розуму ўпэўніцца ў іх ідавочнасці і толькі тады ўключаць у сферу пазнання. Навуковы пошук павінен разгортвацца ад агульных паняццяў да вывядзення

усіх магчымых відавочных уяўленняў. Р. Дэкарт у тэорыі пазнання аддаваў перавагу дэдуктыўнаму метаду. Прадаўжальнікамі рацыяналістычнай традыцыі былі *Б. Спіноза* і *Г. Лейбніц.* Яны апісалі фактычныя спосабы функцыянавання чалавечых пазнавальных здольнасцей.

## 12.2. Філасофскія погляды эклектыкаў

У станаўленні эклектычнай філасофіі значную ролю адыгрываў Віленскі ўніверсітэт. Філасофія Новага часу аказала значны ўплыў на касмалагічныя, фізічныя і біялагічныя ўяўленні філосафаў-эклектыкаў. Гэта знайшло выяўленне ў прызнанні геліяцэнтрызму, атамізму, усеагульнага значэння законаў механікі. Аднак самі эклектыкі падкрэслівалі, што яны не прымаюць цалкам ні адной з найноўшых філасофскіх сістэм. У эклектыкаў прыкметны крытычныя адносіны да картэзіянства. Аднак у разважаннях аб метадзе ў А. Скарульскага, Б. Дабшэвіча, К. Нарбута заўважны ўплыў ідэй Р. Дэкарта. У творах С. Шадурскага, Б. Дабшэвіча, К. Нарбута выявілася імкненне выявіць узаемасувязі паміж філасофіяй, прыродазнаўствам і тэалогіяй. С. Шадурскі і Б. Дабшэвіч вымушана заяўлялі аб прызнанні арыстоцелеўскага вучэння аб матэрыі і форме, але фактычна з'яўляліся прыхільнікамі атамістычных уяўленняў. Крытэрыем ісціны следам за Лейбніцам яны прызнавалі відавочнасць, якая складалася з трох відаў: рацыянальнай, пачуццёвай, маральнай. Адной з цэнтральных праблем натуральнай тэалогіі і псіхалогіі ў першай палове XVIII ст. становіцца праблема чалавечай душы. Крытыкуюцца спробы паказаць узаемасувязь псіхікі чалавека і жывёл. Як душа размешчана ў целе, ці раўнамерна разліта яна па ўсіх частках, ці засяроджана ў якойсьці частцы, а таксама як душа ўплывае на цела, а цела на душу – гэта асноўныя пытанні, якія цікавілі тагачасных мысліцеляў.

*Антоні Скарульскі* (1715 – 1780) выкладаў паэтыку, рыторыку, тэалогію, філасофію, гісторыю, матэматыку ў розных навучальных установах ВКЛ. Быў рэктарам калегіумаў у Наваградку і Вільні. У 1772 – 1774 гг. – рэктар Віленскай акадэміі, з 1774 г. – дэкан тэалагічнага факультэта.

*Станіслаў Шадурскі* (1726 – 1789) – філосаф, педагог, прадстаўнік натурфіласофіі другой паловы XVIII стагоддзя ў ВКЛ. Атрымаў адукацыю ў езуіцкіх калегіумах Вільні і Оршы. Выкладаў філасофію ў Варшаве, Вільні, Гродне, Наваградку. Аўтар трактатаў «Прынцыпы філасофіі мыслення і адчуванняў» (1758), «Зачаткі разважанняў у розных дыялогах, а таксама практыкаванняў па логіцы, этыцы і метафізіцы» (1760), «Філасофскія азначэнні агульнай фізікі, выказаныя публічна аўтарам» (1761), «Фізіка, або Філасофія прыроды» (не апублікавана). У яго тэарэтычнай спадчыне адлю-

страваўся працэс распаду схаластычнай філасофіі і станаўлення філасофскай і прыродазнаўчай думкі Новага часу. С. Шадурскі выступаў супраць атэізму, пантэізму і скептыцызму, звяртаў увагу на «недахопы» ў сістэмах Эпікура і Гасендзі. Не ва ўсім яго задавальняла і вучэнне Р. Дэкарта, але ў касмалогіі ён заставаўся прыхільнікам дэкартаўскага варыянта тэорыі М. Каперніка[51].

*Бенядзікт Дабшэвіч* (1722 – 1794) – дэкан тэалагічнага факультэта Віленскай акадэміі. Аўтар работ «Погляды новых філосафаў...» (1760) і «Лекцыі па логіцы» (1761). Адным з першых прызнаў тэорыю Каперніка. Філосаф спрабаваў прымірыць эксперыментальную навуку з тэалогіяй. Пры разглядзе паняццяў матэрыі і формы Б. Дабшэвіч прытрымліваўся атамізму. Згаджаючыся ў цэлым з арыстоцелеўскай фізікай, Б. Дабшэвіч уводзіў у яе ўяўленні аб карпускулярнай будове матэрыі. У яго працах атамізм выступаў «агульным прынцыпам» тлумачэння прыродных працэсаў, неабходнай рабочай гіпотэзай даследавання[52].

*Казімір Нарбут* (1738 – 1807) здолеў выйсці за межы эклектычных уяўленняў. У пачатку 70-х гг. XVIII ст. К. Нарбут заяўляў аб прызнанні геліяцэнтрызму. Ён працаваў у Адукацыйнай камісіі, у «Таварыстве па складанні элементарных кніг». У 1777 г. быў прызначаны інспектарам школ ВКЛ. К. Нарбут адным з першых зрабіў прадметам філасофскага аналізу заганы грамадства ВКЛ. У К. Нарбута разважанні аб натуральным праве звязваюцца з ідэяй прававога грамадства. У кнізе «Логіка, альбо Навука разважанняў...» філосаф ставіць пытанне аб межах чалавечага розуму і чалавечага пазнання[53].

## 12.3. Эпоха Асветніцтва на беларускіх землях

*Асветніцтва* – гэта грамадска-палітычная плынь, прадстаўнікі якой прапаведавалі прыярытэт навукі і розуму ў палітычным і культурным развіцці грамадства, развівалі ідэю суверэнітэту народа на аснове «грамадскага дагавору». Найбольшае пашырэнне Асветніцтва мела ў XVIII ст. у Францыі (Вальтэр, Ж.-Ж. Русо, П. Гольбах, Ж. Ламетры, Д. Дзідро, К. Гельвецый). Ідэі Асветніцтва ў заходнееўрапейскіх краінах развівалі Дж. Лок, Ф. Бэкан, Дж. Свіфт, Д. Дэфо (Англія), У. Акоста, Б. Спіноза (Галандыя), Г. Э. Лесінг, Ф. Шылер, І. В. Гётэ (Германія). Этычныя і эстэтычныя ідэі эпохі знайшлі адлюстраванне ў творах літаратуры і выяўленчага мастацтва.

---

[51] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X – XIX ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 329 – 330.
[52] Тамсама. – С. 205 – 208.
[53] Тамсама. – С. 264 – 265.

З пранікненнем на беларускія землі ў XVIII ст. асветніцкай ідэалогіі адбываўся паступовы пераход ад схаластыкі да спроб асэнсавання сутнасці чалавека і асноў грамадскага ўладкавання. Паводле асветніцкага ідэалу, годнасць чалавека павінна вызначацца яго ведамі, а не паходжаннем. Лічылася, што сама прырода надзяліла чалавека «натуральным правам» на свабоду, роўнасць і справядлівасць.Назіралася спроба ўзняць маральны ідэал над рэлігійнай і саслоўнай ідэалогіяй. Сцвярджалася, што месца чалавека ў грамадстве вызначае не яго саслоўна-карпаратыўны статус, а сукупнасць асабістых якасцей і заслуг перад чалавечай супольнасцю[54].

У Беларусі ідэйныя вытокі Асветніцтва бяруць пачатак у творчасці мысліцеляў канца XVII – пачатку XVIII стст.: К. Лышчынскага, Сімяона Полацкага, І. Капіевіча, Ф. Пракаповіча. Прадстаўнікамі ранняга перыяду Асветніцтва з’яўляліся выкладчыкі езуіцкіх і піярскіх калегіумаў Б. Дабшэвіч, К. Нарбут, М. Пачобут-Адляніцкі. Галоўную ролю ў гістарычным працэсе адводзіў розуму гісторык-езуіт А. Нарушэвіч. Праваслаўны асветнік Г. Каніскі прапагандаваў неабходнасць усталявання законнасці ў Рэчы Паспалітай, асуджаў рэлігійную неталерантнасць польскіх улад, выказваўся за рэфармаванне праваслаўнай сістэмы адукацыі. Грамадска-палітычны дзеяч М. Матушэвіч у сваіх мемуарах асуджаў самавольства пануючых класаў. Фізіякраты М. Страйноўскі і І. Храптовіч згаджаліся з меркаваннем, што прычынай бедстваў дзяржавы з’яўляецца адыход грамадства ад натуральных законаў. П. Бжастоўскі, М. Карповіч, І. Яленскі падзялялі прынцыпы прыродазнаўчага матэрыялізму. Для пашырэння ідэй Асветніцтва шмат зрабіла *Камісія народнай адукацыі Рэчы Паспалітай* (Адукацыйная камісія) – па сутнасці, першае ва Усходняй Еўропе міністэрства асветы. Утварэнне Адукацыйнай камісіі (1773), на рахунак якой была перададзена маёмасць ліквідаванага за год да гэтага ордэна езуітаў, абумовіла пачатак станаўлення ў Рэчы Паспалітай свецкай вышэйшай адукацыі[55].

***Шубраўцы.*** У 1816 – 1822 гг. у Вільні выдавалася сатырычная газета *«Wiadomości Brukowe»* («Вулічныя навіны»), орган таварыства *шубраўцаў* (1817 – 1822). Рэдактарам газеты быў Андрэй Снядэцкі. У 1830 – 1836 гг. выданню спрабаваў наследаваць штотыднёвік *«Bałamut Petersburski»*. Асветніцкія публікацыі з’яўляліся таксама на старонках «Dziennika Wileńskiego», «Dziejów Dobroczynności» і «Tygodnika Wileńskiego».

---

[54] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X – XIX ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 313 – 314.

[55] Чалавек і грамадства: Энцыкл. даведнік / У. Л. Абушэнка [і інш.]; гал. рэд. Г. П. Пашкоў. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1998. – С. 15 – 18.

Назву «шубравец» можна перакласці як «свавольнік». У склад таварыства ўваходзілі выкладчыкі і студэнты Віленскага ўніверсітэта М. Балінскі, Л. Бароўскі, А. Гарэцкі, Т. Зан, К. Кантрым, А. Марціноўскі, М. Ромер, І. Сянькоўскі, А. Снядэцкі, І. Ходзька, Я. Ходзька, І. Шыдлоўскі, Я. Шымкевіч, С. Юндзіл і інш. Шубраўцы ставілі сваёй мэтай барацьбу з клерыкалізмам і «сармацкай» шляхецкай ідэалогіяй, крытыкавалі маральныя заганы шляхты – фанабэрыю, цемрашальства, п'янства, гультайства. Аўтары газеты рэгулярна звярталі ўвагу чытачоў на выключна цяжкое становішча прыгоннага сялянства. Шубраўцы выказваліся за частковыя сацыяльныя рэформы, падтрымлівалі сувязі з масонамі і таемнымі маладзёжнымі арганізацыямі Вільні, спрачаліся з полацкімі езуітамі. У 30 – 40-я гады XIX стагоддзя былыя шубраўцы адыходзілі ад дэмакратычных ідэалаў сваёй маладосці, што ў найбольшай ступені выяўляецца ў матэрыялах часопіса Ігната Шыдлоўскага «Wizerunki i Roztrząsania Naukowe» (1834 – 1843)[56].

**Крыніцы**

1. Дабшэвіч, Б. Погляды новых філосафаў / Б. Дабшэвіч // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 247 – 273.

2. Нарбут, К. Логіка, альбо Навука аб роздуме і развазе. Выбраныя развагі з філасофіі / К. Нарбут // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 291 – 319.

3. Скарульскі, А. Каментары па філасофіі альбо логіцы... / А. Скарульскі // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 206 – 227.

4. Шадурскі, С. Філасофскія палажэнні з агульнай фізікі / С. Шадурскі // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII века / ред. А. С. Майхрович [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 228 – 246.

**Літаратура**

1. Бирало, А. А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII – середине XVIII в. / А. А. Бирало. – Минск : изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1971. – 180 с.

2. Дубровский, В. В. Казимир Нарбут / В. В. Дубровский. – Минск : Наука и техника, 1979. – 136 с.

3. Цукерман, А. Я. Философская мысль в Белоруссии середины XVIII века / А. Я. Цукерман / Минск : Наука и техника, 1980. – 111 с.

---

[56] Хаўстовіч, М. В. Гісторыя беларускай літаратуры 30 – 40-х гг. XIX ст. / М. В. Хаўстовіч. – Мінск : БДУ, 2001. – С. 25 – 26.

# ТЭМА 13. ФІЛАСОФСКІЯ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ ФІЗІЯКРАТАЎ У БЕЛАРУСІ

Тэрміны: *натуральнае права*, *фізіякраты*.

1. Школа фізіякратыі ў ВКЛ.
2. Асветнікі-рэфарматары А. Тызенгаўз і П. Бжастоўскі.

## 13.1. Школа фізіякратыі ў ВКЛ

*Фізіякратыя* – французская школа эканамістаў другой паловы XVIII стагоддзя, якая была заснавана каля 1750 г. Франсуа Кенэ. Прадстаўнікі дадзенай школы лічылі адзіным самастойным фактарам вытворчасці зямлю. Яны з'яўляліся таксама прыхільнікамі «натуральнага парадку» ў гаспадарчым жыцці – ідэі, якая была блізкай паняццю натуральнага права. Тэрмін «фізіякраты» ўвайшоў у зварот толькі ў XIX ст., самі прадстаўнікі школы называлі сябе «эканамістамі», а прадмет – «палітычнай эканоміяй». Фізіякраты заклікалі абмежаваць умяшанне дзяржаўнай улады ў эканамічныя адносіны. Яны аддавалі перавагу сельскай гаспадарцы перад гандлем і апрацоўчай прамысловасцю як адзінаму занятку, што дае лішак валавога прыбытку над выдаткамі вытворчасці. Адсюль у іх тэорыі зямля з'яўляецца адзіным фактарам вытворчасці. У ВКЛ існавалі тры асноўныя цэнтры развіцця тэорыі фізіякратыі: Адукацыйная камісія (1773 – 1794), Гурток альбо Салон фізіякратаў у Віленскім універсітэце (1774 – 1806) і Таварыства сяброў навук (1800 – 1812). З 1783 г. тэорыя фізіякратыі пачала выкладацца ў Віленскім універсітэце. Тэорыю фізіякратыі чыталі Г. Страйноўскі (да 1799 г.) і С. Малеўскі (да 1811 г.). Г. Страйноўскі з'яўляўся аўтарам падручніка «Навука прыроднага і палітычнага права, палітычнай эканоміі і права народаў» (Вільня, 1785). У 1811 г. пад назвай «палітэканомія» Я. Зноскам, аўтарам падручніка «Навука палітычнай эканоміі паводле ўкладу Адама Сміта», выкладалася ўжо вучэнне А. Сміта. Аднак і пазней пад рознымі назвамі элементы курса тэорыі фізіякратаў чыталіся ў Віленскім універсітэце.

*Іахім Храптовіч* (1729 – 1812) – прадстаўнік школы фізіякратызму ў ВКЛ, адзін з заснавальнікаў Варшаўскага «Таварыства сяброў навук». У сваім маёнтку Шчорсы сабраў адну з багацейшых ва Усходняй Еўропе бібліятэк. Адзін са стваральнікаў (1773) і больш за 20 гадоў член Адукацыйнай камісіі. У сваіх родавых маёнтках Шчорсы (Навагрудскі павет) і Вішнёва (Ашмянскі павет) замяніў паншчыну чыншам. Гэтыя спробы зводзі-

ліся да пошукаў аптымальнага варыянту вядзення гаспадаркі ва ўмовах развіцця таварна-грашовых адносін і без карэннай ломкі прыгоннай сістэмы. І. Храптовіч выдаў два эканамічныя трактаты: «Пра штогадовае аднаўленне краіны» і «Пра натуральнае права»[57].

*Іеранім Страйноўскі* (1752 – 1815) – першы рэктар Віленскага ўніверсітэта. Рабіў спробы выбудаваць на базе фізіякратызму ўласную філасофскую сістэму, якая аб'яднала б анталагічныя, антрапалагічныя і метадалагічныя пытанні. Аўтар працы «Навука аб натуральным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў» (Вільня, 1781). Прынцыпы натуральнага права І. Страйноўскі разглядаў у якасці крытэрыяў «існасці» таго ці іншага сацыяльна-палітычнага ладу. Ён лічыў, што дзяржаўная сістэма Рэчы Паспалітай не адпавядае патрабаванням натуральнага права. І. Страйноўскі абгрунтоўваў залежнасць шчасця народа і разумнага грамадскага ўпарадкавання ад узроўню пашырэння ведаў аб прыродзе і грамадстве. Для ажыццяўлення плана асветы насельніцтва, на яго думку, неабходна стварыць дасканалую сістэму навучання юнацтва, садзейнічаць развіццю навукі і папулярызаваць яе праз выданне кніг[58].

*Канстанцін Багуслаўскі* (1754 – 1819) – грамадскі дзеяч, філосаф, правазнавец, тэолаг. Прафесар Галоўнай школы ВКЛ, член Адукацыйнай камісіі. Уступіў у ордэн піяраў і быў выкладчыкам у іх школах на Валыні і ў Варшаве. У 1790 г. прызначаны прафесарам багаслоўя ў Віленскі ўніверсітэт, у якім з 1804 па 1812 г. быў дэканам факультэта багаслоўскіх і маральных навук. Перайшоў па дазволе папы ў свецкае духавенства. Склаў зборнік біяграфій дзяржаўных дзеячаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай (Вільня, 1814). Аўтар кнігі «Пра дасканалае заканадаўства» (1786), у якой побач з натуральным правам як асновай справядлівага заканадаўства разглядаў чалавека як адзінства дзвюх субстанцый – матэрыяльнай і духоўнай. Падзяляў асветніцкае палажэнне пра рашаючую ролю адукацыі і навукі ў жыцці грамадства, абгрунтоўваў неабходнасць канстытуцыйных форм кіравання, крытыкаваў самадзяржаўе і арыстакратычную алігархію[59].

*Ян-Баптыст-Уладзіслаў Снядэцкі* (1756 – 1830) – астраном, матэматык, філосаф, рэктар Віленскага ўніверсітэта. З 1806 г. з'яўляўся прафесарам Віленскага ўніверсітэта, у 1807 – 1814 гг. – рэктарам. Таксама быў дырэктарам Віленскай астранамічнай абсерваторыі. Адным з першых у Рэчы Паспалітай выкладаў сістэму фізіякратаў (Кракаўскі калегіум, 1776).

[57] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X – XIX ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 326 – 328.
[58] Тамсама. – С. 318 – 319.
[59] Тамсама. – С. 176 – 177.

Сістэматычна праводзіў назіранні за малымі планетамі, сонечнымі і месячнымі зацьменнямі. Яму належаць разлікі месцазнаходжання Сонца, Месяца і планет. У 1802 г. незалежна ад Генрыха Ольберса адкрыў астэроід Палада. У галіне матэматыкі дзейнасць Я. Снядэцкага амаль не выходзіла за межы напісання школьных падручнікаў, большасць яго матэматычных прац насіла папулярны характар. Галоўнай працай Я. Снядэцкага, якая прынесла яму вядомасць, была біяграфія Мікалая Каперніка (Варшава, 1802). Іншымі папулярнымі даследаваннямі з'яўляліся біяграфіі астранома Віленскага ўніверсітэта Марціна Пачобут-Адляніцкага (Вільня, 1810) і польскага асветніка Гуга Калантая (Вільня, 1814). Я. Снядэцкі заклаў асновы польскамоўнай матэматычнай тэрміналогіі. Яму належыць таксама прапанова ўвесці аднастайную сістэму вылічэння фізічных велічынь[60].

*Андрэй Снядэцкі* (1768 – 1838), брат Я. Снядэцкага, – хімік, лекар і філосаф-асветнік, прафесар Віленскага ўніверсітэта. У сваёй галоўнай працы «Тэорыя арганічных істот» (т. 1 – 2, 1804 – 1811) развіў ідэю эпігенезу. Прапагандаваў прынцыпы сацыяльнай гігіены. Аўтар першага падручніка хіміі на польскай мове (1800). У 1805 – 1806 гг. рэдагаваў часопіс «Dzennik Wileński», у 1816 – 1822 гг. – газету асветніцкага накірунку «Wiadomości Brukowe».

*Антоній Тызенгаўз* (1733 – 1785) – рэфарматар, кіраўнік каралеўскіх эканомій у Беларусі. Заснаваў у Гродне Медыцынскую школу і Інстытут павівальнага майстэрства, на чале якіх стаў французскі вучоны Жан Эмануэль Жылібер. Пасля адкрыў бухгалтарскую, землямерскую і будаўнічую школы, наладзіў у Гродне выданне першай у межах сучаснай Беларусі штотыднёвай газеты («Гродзенская газета»). Яе першы нумар выйшаў з друку у маі 1776 г. На яе старонках асвятляліся палітычныя і прававыя ідэі.

## 13.2. Асветнікі-рэфарматары А. Тызенгаўз і П. Бжастоўскі

У апошняй чвэрці XVIII ст. у ВКЛ рабіліся спробы правядзення рэформ паводле тэорыі фізіякратыі. З прыватнаўласніцкіх рэформ варта адзначыць праекты Паўла Бжастоўскага, Яўхіма Храптовіча, Міхала Карповіча, Францішка Карпінскага. На дзяржаўным узроўні пераўтварэнні праводзілі Антоній Тызенгаўз і Франц Нарвойш на Гарадзеншчыне, Мацей Бутрымовіч і Міхал Казімір Агінскі на Піншчыне. Найбольш паказальнымі

[60] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X – XIX ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 314 – 317.

прыкладамі гэтых пераўтварэнняў з'яўляюцца рэформы, праведзеныя А. Тызенгаўзам і П. Бжастоўскім[61].

*Антоній Тызенгаўз* (1733 – 1785) – падскарбі надворны літоўскі (1765 – 1780), гродзенскі стараста, мецэнат. Заснаваў у ВКЛ шэраг мануфактур: суконную, палатняную, зброевую, панчошную, карэтную. Адкрыў у Гродне тэатр, кадэцкі корпус, гандлёвую, землямерную, медыцынскую школы. Каб падняць узровень жывёлагадоўлі, набываў пародзістыя віды жывёл. Аграрныя эксперыменты А. Тызенгаўза, праведзеныя ім у Шавельскай эканоміі, грунтаваліся ў першую чаргу на ўзмацненні паншчыны, што выклікала рэзкае пагаршэнне ўмоў жыцця сялянства. У 1769 г. гэта прывяло да сялянскага паўстання. Няўдалая сельскагаспадарчая палітыка, нерэнтабельнасць многіх адкрытых мануфактур, нерэалістычныя праекты сталі нагодай для адхілення ў 1780 г. А. Тызенгаўза ад кіравання эканоміяй[62].

*Павел Ксаверый Бжастоўскі* (1739 – 1827) – грамадскі і дзяржаўны дзеяч ВКЛ. У сваім маёнтку Мерач на Віленшчыне вызваліў сялян ад паншчыны, увёў сялянскае самакіраванне (1767 – 1794). Зямля была падзелена паміж сялянскімі сем'ямі. Рэфарматар ствараў сялянам умовы для заняткаў рамёствамі і гандлем. У маёнтку было ўласнае заканадаўства, сістэма аховы здароўя і грамадскай бяспекі, судовая і крэдытная сістэмы. П. Бжастоўскі кіраваўся ў сваіх дзеяннях не дабрачыннасцю, а разлікамі выгады ад рэфармавання маёнтка. Вынікі рэалізацыі праекта П. Бжастоўскага выклікалі цікавасць сярод навуковай грамадскасці. Ён быў абраны ганаровым сябрам Віленскага ўніверсітэта. П. Бжастоўскі праводзіў навуковае апісанне свайго праекта[63].

**Крыніцы**

1. Снядэцкі, Я. Прадпісанне, паводле якога павінны знаходзіцца пад публічным і хатнім наглядам вучні мінскай гімназіі Вінцэсь і Юзеф Тышкевічы / Я. Снядэцкі // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 638 – 639.

**Літаратура**

1. Бабкоў, І. М. Філасофія Яна Снядэцкага / І. М. Бабкоў. – Мінск : Логвінаў, 2002. – 135 с.

---

[61] Акуліч, У. А. Беларуская школа фізіякратыі: спроба рэканструкцыі / У. А. Акуліч // Управление в социальных и экономических системах: Материалылы XV международной научно-практической конференции. – Минск, 6 июня 2006 г. – Минск : изд-во МИУ, 2006. – С. 98 – 101.

[62] Тамсама. – С. 321 – 324.

[63] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X – XIX ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 181.

# ТЭМА 14. КРЫТЫКА ФЕАДАЛЬНАГА ЛАДУ І СПРОБЫ ПАЛІТЫЧНЫХ РЭФОРМ У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVIII СТ.

Тэрміны: *«патрыятычная партыя», Таргавіцкая канфедэрацыя.*

1. Грамадска-палітычныя ідэі Канстытуцыі Рэчы Паспалітай ад 3 мая 1791 г.
2. Гістарыяграфія падзення Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.
3. Грамадска-палітычныя погляды Г. Каніскага і С. Маймана.

## 14.1. Грамадска-палітычныя ідэі Канстытуцыі Рэчы Паспалітай ад 3 мая 1791 г.

Блок радыкальнай часткі шляхты і буржуазіі ВКЛ атрымаў назву *«патрыятычная партыя»*. Пачатак яго дзейнасці быў пакладзены на Чатырохгадовым сейме 1788 – 1792 гг. Сейм аб'явіў сябе канфедэрацыяй, каб выключыць прымяненне свабоднага вета. На актывізацыю дэпутатаў-рэфарматараў аказвалі ўплыў рэвалюцыйныя падзеі ў Францыі.

У студзені 1791 г. асноўныя прынцыпы канстытуцыйнага права былі замацаваны ў «Кардынальных правах». У іх абвяшчалася дамінаванне каталіцкай рэлігіі. Пераход з каталіцкай веры ў іншую разглядаўся як крымінальнае злачынства. Дэкларавалася вечная унія Польшчы і ВКЛ. Рэч Паспалітая аб'яўлялася прававой дзяржавай, у якой вяршэнства належыць толькі закону, прынятаму сеймам. Абвяшчалася свабода слова і друку, за выключэннем пытанняў, што датычаць каталіцкай веры, у інтарэсах якой магла быць устаноўлена цэнзура.

У законе ад 24 сакавіка 1791 г. беззямельная шляхта пазбаўлялася права ўдзельнічаць у павятовых сейміках і прымаць удзел у выбарах дэпутатаў на агульны сейм.

Закон «Гарады нашы каралеўскія свабодныя ў дзяржавах Рэчы Паспалітай», які быў прыняты ў красавіку 1791 г., надаваў мяшчанам права асабістай недатыкальнасці, якім карысталася раней толькі шляхта. Забаранялася знявольваць падазраванага да судовага разбіральніцтва, за выключэннем выпадкаў затрымання на месцы злачынства, фальшывых банкрутаў, якія не прадставілі дастатковага залогу ў судзе. Мяшчанам дазвалялася набываць маёнткі, населеныя залежнымі сялянамі, а ўласнікі маёнткаў коштам звыш 2000 злотых атрымалі права ўзводзіцца сеймам у шляхецкае званне. Акрамя таго, на кожным сейме па 30 мяшчан, якія мелі нерухомую маёмасць у гарадах, маглі аб'яўляцца шляхтай. Мяшчане, якія даслужыліся ў арміі да званняў штабс-капітана, капітана і ротмістра, разам са сваімі нашчадкамі станавіліся шляхціцамі. Мяшчанам дазвалялася займаць ніжэй-

шыя пасады ў дзяржаўных установах, быць адвакатамі. Мяшчане атрымалі права прадстаўляць свае інтарэсы ў сеймавых камісіях пры разглядзе пытанняў, што датычыліся гарадоў. Закон аб гарадах стварыў спрыяльныя ўмовы для зближэння мяшчан са шляхтай, што дазволіла ўмацаваць палітычныя пазіцыі шляхецка-буржуазнага блока[64].

3 мая 1791 г. быў прыняты Закон аб урадзе, які яшчэ называюць Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай 3 мая. Рэфарматары пачалі сесію сейма, калі пераважная частка дэпутатаў не вярнулася з велікодных канікулаў. На сесіі прысутнічала толькі адна трэцяя частка агульнага саставу сейма. 3 мая 1791 г. ля каралеўскага замка ў Варшаве, дзе засядаў сейм, былі выстаўлены вайсковыя часці путчыстаў, якія падтрымалі незаконныя дзеянні рэфарматараў.

Канстытуцыя 3 мая складалася з прэамбулы і 11 раздзелаў. У прэамбуле ад імя караля Станіслава Аўгуста гаварылася, што, імкнучыся дасягнуць знешняй незалежнасці і ўнутранай свабоды народа, для агульнага дабрабыту і захавання дзяржавы і яе граніц зацвярджаецца гэтая Канстытуцыя.

У 1 раздзеле пануючай у дзяржаве аб’яўлялася «святая рымская каталіцкая» рэлігія. Пераход з каталіцкай веры ў іншую караўся дзяржавай. У 2 раздзеле шляхта прызнавалася роўнай між сабой, дэкларавалася, што яна ў роўнай ступені магла карыстацца ўсімі прывілеямі асабістай бяспекі, свабоды, правоў уласнасці. У 3 раздзеле пацвярджаўся закон аб гарадах, ён аб’яўляўся часткай Канстытуцыі. 4 раздзел змяшчаў новыя нормы аб сялянах, які насіў дэкларатыўны характар. Асабістая залежнасць сялян ад паноў не адмянялася. У 5 раздзеле замацоўваўся падзел улады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. У 6 раздзеле вызначалася структура і паўнамоцтвы сейма, які складаўся з дзвюх палат: палаты дэпутатаў (паслоў) і палаты сенатараў пад старшынствам караля. У палату паслоў павінны былі ўваходзіць 204 дэпутаты, абавязкам якіх было абмеркаванне ўсіх законапраектаў. Сенат, які складаўся з каталіцкіх епіскапаў, ваяводаў, кашталянаў і міністраў пад старшынствам караля, налічваў 132 чалавекі. Адмянялася свабоднае вета, забараняліся канфедэрацыі. Устанаўлівалася, што Канстытуцыя падлягае перагляду праз 25 гадоў. У 7 раздзеле вызначалася дзеянне ўрада. Ва ўрад уваходзілі кароль як старшыня, кіраўнік каталіцкай царквы – прымас – як старшыня камісіі народнай асветы, пяць міністраў: паліцыі, унутраных спраў, замежных спраў, ваенны міністр, міністр фінансаў. Прызначаліся два сакратары, з якіх адзін вёў справаводства, другі – замежныя справы. Міністраў прызначаў кароль. Адмяняўся прынцып выбарнасці караля, устанаўлівалася спадчыннасць трону. Кароль прызнаваўся

[64] Юхо, Я. Кароткі нарыс гісторыі, дзяржавы і права Беларусі / Я. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – С. 219 – 220.

вышэйшым камандуючым узброеных сіл, прызначаў службовых асоб, епіскапаў, сенатараў. Прадугледжвалася стварэнне пры ўрадзе пастаянных камісій, якія выбіраліся сеймам. 8 раздзел абвяшчаў прынцып ажыццяўлення правасуддзя толькі судом. Канстытуцыяй прадпісвалася выдаць новы кодэкс па грамадзянскіх і крымінальных справах. У 9 раздзеле вызначаўся парадак прызначэння рэгента на выпадак хваробы, палону або непаўналецця караля. 10 раздзел датычыўся вучобы дзяцей караля і нагляду за іх выхаваннем. Апошні раздзел Канстытуцыі быў прысвечаны ўзброеным сілам дзяржавы. Побач са шляхецкім апалчэннем стваралася рэкруцкая армія з сялян. Армія павінна была прыносіць прысягу на вернасць грамадзянам, каралю і Канстытуцыі[65].

***Значэнне Канстытуцыі 3 мая.*** Канстытуцыя з’явілася вынікам кампрамісу паміж панамі-землеўладальнікамі і польскай гарадской буржуазіяй. Яна захоўвала феадальна-прыгонніцкі лад і адначасова стварала пэўныя ўмовы для развіцця мануфактурнай вытворчасці і гандлю, надзяляла больш шырокімі правамі мяшчан. Аднак шляхта заставалася прывілеяваным саслоўем. Яе выключнае становішча ў дзяржаве тлумачылася ўжо тым, што яна выконвае функцыю абаронцы «свабоды і Канстытуцыі». Канстытуцыя не прынесла змен у прававым становішчы сялян Рэчы Паспалітай, адной з самых прыгнечаных сацыяльных катэгорый у тагачаснай Еўропе. Усе суды па-ранейшаму заставаліся саслоўнымі, залежных сялян працягвалі судзіць іх паны. Стварэнне адзінага ўрада для ўсёй Рэчы Паспалітай ператварала федэрацыю Польшчы і ВКЛ ва ўнітарную польскую дзяржаву. Канстытуцыя стварала перадумовы для перараджэння Рэчы Паспалітай у клерыкальную каталіцкую дзяржаву.

Вясной 1792 г. акт Таргавіцкай канфедэрацыі аб’явіў незаконнай дзейнасць Чатырохгадовага сейма. Канфедэрацыя была створана ў імя абароны каталіцкай рэлігіі, захавання цэласнасці Рэчы Паспалітай і «залатых вольнасцяў» шляхты. Таргавічане звярнуліся да кіраўніцтва Расійскай імперыі з просьбай дапамагчы захаваць дзяржаўныя традыцыі Рэчы Паспалітай. Расійскі ўрад, як афіцыйны гарант грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай, пайшоў насустрач іх просьбам, што абумовіла перамогу таргавічан. Выклікаўшы ваенны разгром рэфарматараў-радыкалаў, яны садзейнічалі другому падзелу Рэчы Паспалітай[66].

---

[65] Юхо, Я. Кароткі нарыс гісторыі, дзяржавы і права Беларусі / Я. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – С. 220 – 225.

[66] Юхо, Я. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. У 2 ч. Ч. 1 / Я. Юхо. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – С. 288 – 296.

## 14.2. Гістарыяграфія падзення Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

*Гуга Калантай* (1750 – 1812) – палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, філосаф, педагог, гісторык. Аўтар прац «Да Станіслава Малахоўскага... некалькі лістоў Ананіма» (1788 – 1889), «Палітычнае права польскага народа» (1790), «Пра ўзнікненне і заняпад Канстытуцыі 3 мая» (1793, разам з І. Патоцкім і Ф. Дмахоўскім), «Стан асветы ў Польшчы ў апошнія гады панавання Аўгуста ІІІ» (1841), «Крытычны агляд асноў гісторыі пра пачаткі чалавечага роду» (1842). Г. Калантай аналізаваў прычыны заняпаду Рэчы Паспалітай, крытыкаваў сістэму шляхецкай дэмакратыі і цемрашальства шляхты.

*Станіслаў Сташыц* (1755 – 1826) – філосаф, гісторык, публіцыст. Сваю канцэпцыю гістарычнага працэсу абгрунтаваў у работах «Заўвагі аб жыцці Яна Замойскага» (1787), «Папярэджанне Польшчы» (1790), «Чалавечы род» (1819 – 1820). Гістарыясофскія ўяўленні С. Сташыца грунтаваліся на асветніцкай мадэлі грамадства. Грамадскае развіццё С. Сташыц разглядаў як аб’ектыўны працэс барацьбы прагрэсіўнага з рэакцыйным супраць прыгнёту, які ўсталяваўся са з’яўленнем прыватнай уласнасці на зямлю. С. Сташыц паслядоўна выступаў супраць ідэалізацыі шляхецкай дэмакратыі.

*Адам Станіслаў Нарушэвіч* (1733 – 1796) – прафесар Віленскага ўніверсітэта, езуіт, аўтар сямітомнай работы «Гісторыя народа польскага» (1780 – 1786). Прадстаўнік манархічнага лагера, А. Нарушэвіч вылучаў унутраныя прычыны заняпаду Рэчы Паспалітай, негатыўныя сацыяльныя рысы шляхецтва ён тлумачыў вынікам нямецкага ўплыву. Пад уздзеяннем ідэй А. Нарушэвіча сфарміравалася асобная школа, прадстаўнікі якой выступалі за моцную манархічную польскую дзяржаву[67].

## 14.3. Грамадска-палітычныя погляды Г. Каніскага і С. Маймана

*Грыгорый Іосіфавіч Каніскі* (архіепіскап Георгій; 1717 – 1795) – архіепіскап Магілёўскі, Мсціслаўскі і Аршанскі, філосаф, грамадска-палітычны дзеяч. Аўтар каля 80 прамоў і пропаведзяў («слоў»).

Г. Каніскі распаўсюджваў ідэі кіева-магілянскіх асветнікаў, імкнуўся да захавання традыцый праваслаўнай культуры на Беларусі, выступаў супраць Брэсцкай уніі 1596 г. і каталіцкай рэакцыі, прапагандаваў ідэю саюзу беларускага народа з рускім і ўкраінскім народамі.

---

[67] Белазаровіч, В. А. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі / В. А. Белазаровіч. – Гродна : ГрДУ, 2006. – С. 70 – 74.

Г. Каніскі ведаў і з павагай выказваўся аб вучэнні М. Каперніка і Г. Галілея. У яго этыцы знайшлі адлюстраванне рысы народнага светапогляду. Г. Каніскі – аўтар курсаў паэтыкі і філасофіі, гісторыі Магілёўскай епархіі, «слоў», прамоў, інтэрмедый, вершаў. У трагікамедыі «Уваскрасенне мёртвых...» (1746) раскрыў вострую сацыяльную тэму жорсткай эксплуатацыі сялян у ВКЛ. У сваіх творах заклікаў трымацца традыцый продкаў, іх праваслаўнай веры, выказваўся аб неабходнасці абмежавання злачыннага свавольства польска-літоўскай шляхты і паляпшэння ўмоў жыцця сялянства. Адстойваў правы на асвету сялянства. Адкрыў у Магілёве вучылішча на ўзор Кіеўскай акадэміі, заснаваў некалькі школ і семінарый[68].

*Саламон Майман* (1753 або 1754 – 1800) – філосаф, асветнік. Ва ўзросце каля 25 гадоў выехаў у Германію вывучаць медыцыну, філасофію, фізіку, матэматыку. Каб атрымаць матэрыяльную падтрымку, перайшоў у хрысціянства. Пераклаў «Ранішнія часы» Мендэльсона, напісаў «Дапаможнік да прыродазнаўства і пачаткаў Ньютана». У 1790 г. выдаў сваю першую філасофскую працу «Спроба трансцэндэнтальнай філасофіі» на нямецкай мове. Творы С. Маймана высока ацэньвалі Кант, Гётэ, Шылер, Гумбальт, Фіхтэ. У сваёй «Аўтабіяграфіі» (1791) адлюстраваў праблемы сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця грамадства ВКЛ. С. Майман указваў на цемрашальства большасці прадстаўнікоў польскай і літоўскай шляхты, што праводзілі сваё жыццё ў распусце і гнюсных захапленнях, якія аплачваліся жыццём соцень тысяч прыгонных. «Яны, – пісаў С. Майман, – ганарацца тытуламі і ордэнамі, якія знеслаўляюць сваімі дзеяннямі, валодаюць велізарнымі маёнткамі, якімі не ўмеюць кіраваць, пастаянна вядуць паміж сабой сваркі, у выніку чаго дзяржава непазбежна становіцца здабычай суседзяў». С. Майман прыводзіў дзесяткі фактаў, што ілюстравалі нялюдскую жорсткасць польска-літоўскай шляхты і магнатэрыі, у тым ліку Радзівілаў. Плённай асветніцкай дзейнасцю пазначаны другі перыяд жыцця С. Маймана, які пачаўся з другога наведвання Берліна (1780). Вырашальны ўплыў на яго зрабілі філасофскія погляды І. Канта. Спачатку С. Майман падрыхтаваў заўвагі да «Крытыкі чыстага розуму» Канта, потым на аснове гэтых матэрыялаў падрыхтаваў фундаментальную працу «Спроба трансцэндэнтальнай філасофіі», у якой найбольш поўна і грунтоўна выкладзены яго філасофскія погляды. Праца Маймана была высока ацэнена Кантам. С. Майман надаваў асабліва вялікае значэнне асветніцтву ў вырашэнні надзённых праблем грамадства, рэфармаванні сістэмы ўлады і грамадскіх адносін[69].

---

[68] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Х – XIX ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 218 – 220.
[69] Тамсама. – С. 249 – 253.

### Крыніцы

1. Из автобиографии Соломона Маймона: Отрывки // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI – начала XIX в. – Минск : изд-во АН БССР, 1962.

2. Из книги «Опыт трансцендентальной философии» // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI – начала XIX в. – Минск : изд-во АН БССР, 1962.

### Літаратура

1. Кашуба, М. В. Георгий Конисский / М. В. Кашуба. – М. : Мысль, 1979. – 173 с.

## ТЭМА 15. ЭСТЭТЫЧНЫЯ ІДЭІ ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ

1. Ідэі рацыяналізму ў асвятленні эстэтычнага вопыту Яна Снядэцкага.
2. Трактаты па рыторыцы і паэтыцы.

### 15.1. Ідэі рацыяналізму ў асвятленні эстэтычнага вопыту Яна Снядэцкага

*Ян Снядэцкі* (1756 – 1830) прысвяціў некалькі работ тэарэтычным праблемам мастацтва («Аб літаратуры», «Аб творах класіцызму і рамантызму»). Яго філасофска-эстэтычныя погляды блізкія да французскага матэрыялізму XVIII ст. Я. Снядэцкі разглядаў такія духоўныя здольнасці, як уяўленне, фантазія, густ, пачуццё прыгожага. Пісьменнік сцвярджаў, што адчуванне – першая прыступка ўсіх чалавечых ведаў. Сувязь эмацыйнага і інтэлектуальнага, паводле Я. Снядэцкага, – умова навуковага ўспрымання свету. Фантазію і ўяўленне філосаф разглядае як важныя ўласцівасці, неабходныя ў навуцы і мастацтве. Я. Снядэцкі лічыў, што памяць, розум, уяўленне і фантазія знаходзяцца ва ўзаемадзеянні. Творчасць чалавека – вынік усіх гэтых здольнасцяў. Слабасць розуму вядзе да хімерычных фантазій, але фантазія адыгрывае важную ролю ў навуковай і мастацкай творчасці. Прыгожае ў мастацтве, па яго перакананні, ёсць адлюстраванне прыгожага ў жыцці. Наяўнасць праўды ў мастацкім творы Снядэцкі лічыў галоўнай прыкметай таленавітасці. Спавяданне жыццёвай праўды патрабуе адзінства пачуццёвага і рацыянальнага. Пісьменнік схіляўся да атаясамлення законаў мастацтва з індывідуальнымі прыёмамі творчасці генія. У дыскусіі «рамантыкаў» і «класікаў» Я. Снядэцкі падтрымліваў апошніх. Ён лічыў, што рамантыкі ігнаруюць ролю рацыянальнага моманту ў мастацкай

творчасці, захапляюцца містычным. У эстэтычных поглядах Я. Снядэцкага адлюстраваліся схемы класіцызму. Так, ён лічыў, што У. Шэкспіру бракуе рацыяналізму, што некаторыя яго трагедыі складаюцца з урыўкаў «непрыемных і нават агідных». Расін і Карнель, наадварот, з’яўляліся для пісьменніка ўзорам гарманічнага злучэння розуму і пачуццяў, выдатнага і высакароднага ў мастацтве. Я. Снядэцкі клапаціўся аб выхаванні патрыётаў Польшчы, з гэтай задачай ён звязваў і асноўную мэту мясцовага мастацтва[70].

## 15.2. Трактаты па рыторыцы і паэтыцы

У канцы XVIII стагоддзя ў трактатах па рыторыцы і паэтыцы ўжо адчуваўся ўплыў асветніцкіх ідэй. На тэрыторыі ВКЛ тэрмін «эстэтыка» ўпершыню ўводзіць у курс лекцый па паэтыцы і рыторыцы Е. Славацкі.

Новыя веянні ў рыторыцы і паэтыцы выяўляюцца ў Ф. Голанскага, па меркаванні якога выхаванне густу грунтуецца на развіцці эстэтычнага ў сэрцы і розуме, у пачуццях і ўяўленні, прычым любоў да прыгожага павінна ўзбуджаць спагаду да іншых людзей. Прыгожае звязваецца з дабрачыннасцю. Ф. Голанскі лічыць найбольш узнёслым жанрам паэзіі эпапею, спасылаючыся на творы Гамера, Вяргілія, Арыёста, Мільтана і Вальтэра. Ён выказвае думку аб тым, што мастацкай прозе генетычна папярэднічала паэзія. Мастацкая літаратура дапамагае засваенню красамоўства і вольных мастацтваў – жывапісу, скульптуры і механікі.

*Анёл Доўгірд* (1776 – 1835) – філосаф, логік і псіхолаг, ураджэнец Магілёўшчыны. З 1818 г. выкладаў у Віленскім універсітэце логіку і псіхалогію, з 1821 г. – курс тэарэтычнай і практычнай філасофіі. Аўтар твора «Разбор твора пад назвай "Аб філасофіі" Фелікса Яроньскага» (1817), дзе выступіў з крытыкай філасофіі Канта, даклада «Аб логіцы, метафізіцы і маральнай філасофіі» (1821), трактатаў «Логіка тэарэтычная і практычная» (Полацк, 1829), «Даклад, маючы за мэты давесці рэчаіснасць чалавечага пазнання» (1839). У рукапісах засталіся «Разбор філасофіі Канта», «Курс гісторыі філасофіі», «Маральная філасофія», «Развагі аб псіхалогіі», курсы па логіцы, эпістэмалогіі. У эстэтычных поглядах А. Доўгірда спалучаліся асветніцтва і элементы рамантызму. Ён называў эстэтыку «навукай меркавання аб прыгажосці» і адной з найважнейшых састаўных частак філасофіі, лічыў адчуванні першасным актам пазнання, адзначаў вялікае значэнне мастацтва ў жыцці грамадства. На думку філосафа, у розных відах і жанрах

---

[70] Дорошевич, Э. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э Дорошевич, В. Конон. – М. : Искусство, 1972. – С. 120 – 125.

мастацтва існуюць неаднолькавыя магчымасці для фантазіі. Найменшыя – у жывапісца і скульптара. Яны маюць у сваім распараджэнні толькі тое, што дадзена зрокаваму ўспрыманню. Музычныя творы з'яўляюцца імпульсам для ўзнікнення ўзнёслых пачуццяў, але думкі яны растлумачыць не могуць. У архітэктуры творца не можа ставіць перад сабой іншай мэты, акрамя «стварэння гарманічных формаў». Вышэйшым відам мастацтва, паводле А. Доўгірда, з'яўляецца паэзія, якая валодае здольнасцю кранаць тое, што складае шчасце чалавека і з'яўляецца крыніцай прыемнага. Паэзія, на яго думку, з'явілася важным фактарам цывілізацыі і гуманізацыі грамадства[71].

У мастацтве «рэчаіснасцю» з'яўляецца свет, створаны мастаком. «Сапраўднае» ў вонкавым свеце служыць будаўнічым матэрыялам для «сапраўднага» ў мастацтве. Мастак стварае новы свет. Значныя вынікі ў мастацтве, па меркаванні А. Доўгірда, прыходзяць з набыццём пэўнага аўтаматызму ў навыках і адчуваннях. Індывідуальнае развіццё мастацкага ўяўлення, паводле А. Доўгірда, працэс складаны, які залежыць ад узроўню асветы ў грамадстве. Мастак атрымлівае ў спадчыну ад грамадства пэўныя мастацкія вобразы. Напрыклад, у старажытным свеце велізарную ролю ў сістэме вобразаў мелі міфы, у Новы час – навука[72].

Асветнікі бачылі эстэтычнае ў навуковым пазнанні. Гэта прыводзіла да эстэтызацыі навукі, у прыватнасці астраноміі, якую лічылі найбольш узнёслай сярод іншых навук. У кнізе У. Карчэўскага «Астраномія» апісанне нябесных цел, іх руху, спалучаецца з паэтычнымі фрагментамі аб прыгожым у касмічных з'явах. У самім працэсе пазнання эстэтычныя адзнакі зліваліся з прыродазнаўчымі. Прыгажосць станавілася арыенцірам, напрыклад, у назіранні зорак.

**Крыніцы**


1. Доўгірд, А. Разгляд кнігі Фелікса Яроньскага «Пра філасофію», «Пра логіку, метафізіку і маральную філасофію», «Трактат аб правілах мыслення, альбо Логіка тэарэтычная і практычная», «Рэальнасць чалавечых ведаў» / А. Доўгірд // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI – начала XIX в. – Минск : изд-во АН БССР, 1962. – С. 417 – 462.

2. Маймон, С. З аўтабіяграфіі. Спроба трансцэндэнтальнай філасофіі / С. Маймон // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI – начала XIX в. – Минск : изд-во АН БССР, 1962. – С. 377 – 397.


[71] Дорошевич, Э. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э Дорошевич, В. Конон. – М. : Искусство, 1972. – С. 126 – 130.

[72] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X – XIX ст. : Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 413 – 416.

**Літаратура**

1. Бирало, А. А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII – середине XVIII в. / А. А. Бирало. – Минск : изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1971. – 180 с.
2. Дорошевич, Э. К. Аниол Довгирд – мыслитель эпохи Просвещения / Э. К. Дорошевич. – Минск : Наука и техника, 1967. – 253 с.
3. Дорошевич, Э. К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии / Э. К. Дорошевич. – Минск : Наука и техника, 1971. – 246 с.
4. Цукерман, А. Я. Философская мысль в Белоруссии середины XVIII века / А. Я. Цукерман. – Минск : Наука и техника, 1980. – 111 с.

# ТЭМА 16. ФІЛАСОФСКАЯ СПАДЧЫНА ПОЛАЦКАЙ ЕЗУІЦКАЙ АКАДЭМІІ

1. Падручнік філасофіі і логікі Джузэпэ Анджыёліні.
2. Навукова-асветніцкая і літаратурная дзейнасць выкладчыкаў Полацкай езуіцкай акадэміі.

## 16.1. Падручнік філасофіі і логікі Джузэпэ Анджыёліні

Полацкі калегіум езуітаў быў адкрыты ў 1580 г. па ініцыятыве польскага караля Стэфана Баторыя. Першым кіраўніком калегіума быў багаслоў Пётр Скарга. Праграма навучання ў Полацку з'яўлялася традыцыйнай для езуіцкіх школ ВКЛ. З другой паловы XVIII стагоддзя адбыліся пэўныя змены ў навучальным працэсе пад уплывам ідэй рускага Асветніцтва. У 1784 г. расійская імператрыца Кацярына II, якая дазволіла знаходжанне езуітаў на тэрыторыі імперыі, загадала ім увесці ў сваіх школах энцыклапедычную сістэму навук. У выніку разам з філасофіяй (яе складалі курсы анталогіі, этыялогіі, псіхалогіі, касмалогіі), якая выкладалася ў VI класе, на факультэце вольных навук выкладалася астраномія, оптыка, эксперыментальная фізіка і вышэйшая матэматыка. У калегіуме выкладаліся таксама класічныя мовы, агульная гісторыя, геаграфія і арыфметыка, тэарэтычная і практычная механіка, цывільная і вайсковая архітэктура, балістыка, піратэхніка, гідраўліка, тэорыя рамёстваў, сталярства і жывапіс. Аднак на радыкальную мадэрнізацыю вучэбных праграм, якую праводзіла Віленская акадэмія, полацкія езуіты не згадзіліся, што прывяло да працяглага канфлікту паміж віленскай і полацкай школамі. Каб быць незалежнымі ад Віленскага ўніверсітэта, які меў права кантролю над школамі заходніх правінцый імперыі, езуіты вырашылі падняць статус калегіума да рангу акадэміі, які ён атрымаў 1 сакавіка 1812 г. За восем гадоў дзейнасці акадэмія

выпусціла больш за 100 дактароў. Полацкай акадэміі падпарадкаваліся ўсе езуіцкія школы на тэрыторыі Расійскай імперыі[73].

У Полацкай акадэміі выдаваліся падручнікі. Падручнікі філасофіі і логікі напісаў прафесар філасофіі і матэматыкі *Джузэпэ Анджыёліні*. Філасофія ў гэтым падручніку была падзелена на тры часткі: рацыянальная (логіка), натуральная (метафізіка) і маральная (этыка). Падручнік логікі Дж. Анджыёліні быў далёкі ад асветніцкіх тэндэнцый. Падручнік філасофіі Полацкай акадэміі езуітаў ставіў філасофію на другое месца пасля тэалогіі. Метафізіка ў падручніку была падзелена на тры часткі: анталогія, этыялогія і касмалогія. У першай частцы падручніка логікі прысутнічае агульнае азначэнне дадзенай навукі, апісанне яе мэт і задач. У другой частцы падручніка разглядаюцца ідэі Платона і Дэкарта ў сувязі з вучэннем пра прыроджаныя ідэі. У апошнім раздзеле падручніка логікі аўтар бароніць рэлігійныя ўяўленні, спасылаючыся на Арыстоцеля.

## 16.2. Навукова-асветніцкая і літаратурная дзейнасць выкладчыкаў Полацкай езуіцкай акадэміі

*Вінцэнт Бучынскі* (1789 – 1853) – тэолаг, філосаф, крытык, выпускнік і выкладчык Полацкага езуіцкага калегіума. Удзельнічаў у палеміцы паміж прафесарамі Віленскага ўніверсітэта і Полацкай езуіцкай акадэміі вакол паэмы Н. Мусніцкага «Палтава» (Полацк, 1803). Выказаў цікавыя рацыянальныя заўвагі, якія былі ананімна выдадзены ў 1818 г. у Полацку. Надрукаваў свой артыкул «Гістарычнае даследаванне аб слушнасці прысуду, паводле якога быў распушчаны ордэн тампліераў». Пасля закрыцця Полацкай езуіцкай акадэміі выкладаў філасофію і тэалогію ў каталіцкіх навучальных установах Аўстрыйскай імперыі. Аўтар трохтомніка «Філасофскія разважанні» (Вена, 1843 – 1844). З 1848 г. жыў і выкладаў у Лувенскім універсітэце Бельгіі, дзе і памёр.

У Полацку В. Бучынскі стварыў першы ў Беларусі літаратурна-навуковы часопіс «Месячнік Полацкі» і ўвесь час быў яго рэдактарам, друкаваў у часопісе гістарычныя матэрыялы пра Полацк і Полаччыну. На працягу 1818 – 1820 гг. выйшла чатырнаццаць нумароў літаратурна-навуковага часопіса Полацкай езуіцкай акадэміі «Месячнік Полацкі». У часопісе было шэсць аддзелаў: літаратуры і вольных навук, маральна-філасофскі, фізічна-матэматычны, гістарычны, крытыкі і аддзел літаратурных навін. У першым нумары В. Бучынскі вызначыў мэты выдання: «Месячнік» мусіў асвятляць

[73] Серабракоў, Д. Філязофія акадэміі езуітаў у Полацку / Д. Серабракоў // Фрагмэнты. – 2000. – № 3 – 4. [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://old.knihi.com/frahmenty/frahmenty9.htm. – Дата доступа: 09.08.2011.

пытанні літаратуры, філасофіі, маралі, гісторыі, а таксама дакладных навук. Асаблівая ўвага надавалася пытанням хрысціянскага веравызнання і філасофіі. Часопіс актыўна рэагаваў на публікацыі, якія з'яўляліся ў віленскіх, варшаўскіх і рускіх часопісах. Аўтары часопіса спрачаліся з ідэямі вальнадумцаў, востра крытыкавалі філасофію Канта. Часопіс друкаваў працы не толькі вядомых аўтараў, але і вучняў акадэміі[74].

*Нікадзім Мусніцкі* (1765 – 1805) – паэт і лінгвіст, выкладчык Полацкай езуіцкай акадэміі, аўтар польскамоўнай паэмы «Палтава» (Полацк, 1803), якая выклікала дыскусію ў мясцовых выданнях. У паэме праслаўлялася перамога рускіх войскаў над шведамі. Такая трактоўка гістарычных падзей выклікала ў 1817 – 1818 гг. вострую крытыку з боку віленскіх прыхільнікаў асветніцкай ідэалогіі. Па сутнасці, крытыка была выклікана ідэямі неабходнасці збліжэння Беларусі з Расіяй, якія выказаў Н. Мусніцкі[75].

**Літаратура**

1. Блинова, Т. Б. Иезуиты в Белоруссии (Их роль в организации образования и просвещения) / Т. Б. Блинова. – Гродно : ГрГУ, 2003. – 425 с.

2. Мараш, Я. Н. Очерки истории экспансии католической церкви в Белоруссии XVIII века / Я. Н. Мараш. – Минск : Вышэйшая школа, 1974. – 288 с.

3. Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт: вытокі, гісторыя станаўлення і дзейнасць (да 40-годдзя заснавання). – Наваполацк : ПДУ, 2008. – С. 20 – 24

4. Сапунов, А. П. Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке / А. П. Сапунов // Иезуиты в Полоцке: 1580 – 1820 гг. У 2 ч. Ч. 2. – Полоцк, изд. А. И. Судник, 2005. – С. 7 – 40.

# ТЭМА 17. САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ І ІДЭАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА РУХУ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ХІХ СТ.

1. Тэорыя нацыі ў гуманітарнай навуцы.
2. Феномен «шляхецкага народа» і «тутэйшасці».
3. Арганізацыя навуковага вывучэння беларускай культуры ў Расійскай імперыі.

## 17.1. Тэорыя нацыі ў гуманітарнай навуцы

Навуковая цікавасць да феномена нацыі была справакавана Вялікай французскай рэвалюцыяй (1789) і ўздымам нацыянальна-вызваленчага руху сярод народаў Еўропы. Першымі тэарэтыкамі пытання былі Дэні Дзі-

[74] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Х – ХІХ ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 376.
[75] Тамсама. – С. 261 – 262.

дро, Іаган Готфрыд Гердэр, Жан-Жак Русо, Іаган Готліб Фіхтэ. Д. Дзідро ў сваёй «Энцыклапедыі» вызначыў нацыю як супольнасць людзей, якія жывуць на пэўнай тэрыторыі і падпарадкоўваюцца аднаму ўраду. І. Г. Гердэр у канцы XVIII стагоддзя прапанаваў лічыць племя працягам сям'і, нацыю – прадаўжэннем племені, а дзяржаву, у сваю чаргу, – нацыі. Тэорыя І. Г. Гердэра ўзнікла ў межах інтэлектуальнага руху нямецкага рамантызму, які бунтаваў супраць ідэалогіі Асветніцтва з яго канцэпцыяй грамадскай дамовы. Адным з першых, хто прапанаваў вызначаць межы нацыі з дапамогай распаўсюджвання нацыянальнай мовы, быў І. Г. Фіхтэ. У сваёй працы «Прамовы да нямецкай нацыі» (1808) філосаф вызначае нацыю як калектыўную асобу. І. Г. Фіхтэ з'явіўся адным з першых ідэолагаў нямецкага нацыяналізму. Ён сцвярджаў агульначалавечую місію нямецкай філасофіі. У Ж.-Ж. Русо паняцце «нацыя» выступае як сінонім тэрміна «дзяржава». Пад нацыяй, галоўным чынам, разумеецца народ, які мае канстытуцыю.

У канцы XVIII стагоддзя барацьба за пашырэнне паняцця «нацыя» прывяла да распаўсюджання яго на непрывілеяваныя класы, чаго не было раней. У часы Вялікай французскай рэвалюцыі радыкалы нават адмаўлялі дваранству ў праве ўваходзіць у склад нацыянальнай супольнасці.

Такім чынам, ужо ў канцы XVIII ст. вызначыліся два падыходы да разумення паняцця «нацыя»: «нямецкі», які разумеў нацыю як моўна-культурную супольнасць, і «французскі», у якім нацыя разумелася як грамадзянская супольнасць пэўнай суверэннай дзяржавы.

## 17.2. Феномен «шляхецкага народа» і «тутэйшасці»

У феадальных грамадствах пад «народам», «нацыяй» разумелася сукупнасць разнастайных груп прывілеяванага саслоўя, часта этнічна неаднастайная. Рэч Паспалітую складалі дзве палітычныя нацыі – прывілеяванае саслоўе Польскага каралеўства і прывілеяванае саслоўе ВКЛ. Шляхта была дзяржаватворчай «нацыяй» Рэчы Паспалітай: «права яе продкаў не прызнавала ні пана, ні мужыка, ні мешчаніна, а толькі шляхціца» (У. Сыракомля). Для азначэння падатковага насельніцтва на землях колішняй Рэчы Паспалітай выкарыстоўвалася назва «люд». У XVIII стагоддзі ў шляхецтва і святарства Рэчы Паспалітай сфарміравалася шматузроўневая ідэнтычнасць. Першы ўзровень ахопліваў усіх прывілеяваных грамадзян Рэчы Паспалітай, якія называліся «палякамі», другі ўзровень вызначаў сярод іх «каронных» (жыхароў Польскага каралеўства) і «літвінаў» (ураджэнцаў ВКЛ). Адзін чалавек мог адначасова (сама)характарызавацца як беларус (паводле рэгіянальнага паходжання), русін (паводле прыналежнасці да праваслаўнай –

«рускай» – канфесіі), літвін (выхадзец з тэрыторыі ВКЛ) і паляк (грамадзянін Рэчы Паспалітай, шляхціц).[76]

Ліцвінская шляхта мела ўласную этнагенетычную міфалогію (Я. Длугаш, М. Стрыйкоўскі, М. Літвін) і падкрэслівала сваё адрозненне ад «кароннікаў». Але ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай была ліквідавана аўтаномія ВКЛ, а разам з тым і кансалідуючы фактар у фарміраванні Natio Lithuanus – ліцвінскай шляхты, надэтнічнай прывілеяванай супольнасці, значную частку якой складалі нашчадкі «русінаў» (праваслаўнага беларуска-ўкраінскага насельніцтва ВКЛ). На працягу XIX стагоддзя літвіны былі вымушаны змяніць сваю гістарычную форму самавызначэння. У гэты перыяд сярод літвінаў у шырокім сэнсе пачалі вылучаць этнічных літоўцаў ці летувісаў (саманазва – «lietùvisė») і беларусаў. На пачатку XIX стагоддзя ўзнікалі праекты аднаўлення ВКЛ. Але ў здзяйсненні гэтых планаў іх аўтары бачылі толькі прамежкавы этап перад вяртаннем польскай улады. Праект М. К. Агінскага прадугледжваў, напрыклад, увядзенне «пальшчызны» як мовы справаводства ў адноўленым ВКЛ. У XIX стагоддзі свядомасць мясцовага набілітэту з'яўлялася полем змагання польскай і рускай нацыянальных ідэй. Формай пазбягання падобнага выбару быў зварот да «тутэйшасці» – культывавання мясцовага рэгіянальнага патрыятызму, які бліжэй да сярэдзіны XIX стагоддзя ўсё часцей вызначаўся тэрмінам «беларускі»[77].

## 17.3. Арганізацыя навуковага вывучэння беларускай культуры ў Расійскай імперыі

З'яўленню беларускай нацыянальнай ідэі папярэднічала «адкрыццё» беларускага этнасу, якое адбывалася пры ўдзеле палітычных і навуковых колаў суседніх народаў. Прыкладам такой дзейнасці з'яўлялася праца навуковага гуртка пад кіраўніцтвам расійскага арыстакрата М. П. Румянцава, Рускага геаграфічнага таварыства, афіцэраў Генеральнага Штаба расійскай арміі, губернскіх статыстычных камітэтаў, Варшаўскага таварыства сяброў навукі. Пад «адкрыццём» разумеецца шэраг навуковых і грамадска-палітычных прэцэдэнтаў – прызнанне моўнай самабытнасці беларускага сялянства, вызначэнне пераемнасці гісторыі беларускага народу з дзяржаўнай спадчынай полацкіх крывічоў, апазнанне канфесійнай гетэрагеннасці бела-

[76] Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бардах; пер. з пол. М. Раманоўскага і А. Істоміна. – Мінск : Бібліятэка часопіса «Беларускі Гістарычны Агляд», 2002. – С. 34.
[77] Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795 – 1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – С. 122.

рускага этнасу, геаграфічная лакалізацыя тэрміна «Беларусь», высвятленне генетычнай сувязі беларускай гутарковай мовы з мовай афіцыйнага справаводства ў ВКЛ.

Згаданыя крокі не праводзіліся сістэмна з мэтай інспірацыі беларускага нацыянальнага руху, але зрабілі магчымым яго з'яўленне. «Адкрыццё» спрыяла аб'ектыўнаму выяўленню самабытных рысаў беларускага этнасу і адначасова прычынілася да канструявання дадзенай супольнасці, падзеленай на той час на саслоўныя, канфесійныя і рэгіянальныя групы, якім бракавала пачуцця агульнай тоеснасці. Найбольш падрыхтаванымі да ўспрымання беларускай нацыянальнай ідэі з'яўляліся выхадцы з уніяцкага і праваслаўнага святарскага асяроддзя. Але пасля 1839 г. уніяцкія асяродкі былі дэзарганізаваны, а праваслаўныя знаходзіліся ў інтэлектуальнай стагнацыі. Прадстаўнікі дробнага шляхецтва амаль не адрозніваліся ад сялян адукаванасцю і маёмасцю. Арыстакратыя, у сваю чаргу, выхоўвалася ў касмапалітычнай атмасферы і не была адпаведна шчыльна заангажаваная ў нацыянальныя рухі. Канфесійная пярэстасць, рэгіяналізм як частка свядомасці прывілеяваных станаў, ідэалогія шляхецкай выключнасці таксама стрымлівалі фарміраванне надсаслоўнай этнакультурнай беларускай ідэнтычнасці. У такіх умовах нават непаслядоўныя захады расійскай адміністрацыі па вывучэнні «Паўночна-Заходняга краю» дапамагалі беларускаму этнічнаму самавызначэнню[78].

**Літаратура**

1. Куль-Сяльверстава, С. Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гады) / С. Я. Куль-Сяльверстава. – Мінск : БДУ, 2000. – 260 с.

2. Латышонак, А. Палямон. Коды легенды / А. Латышонак // Наша Ніва. – 2006. [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://www.nn.by/index.php?c=ar&i=255. – Дата доступа: 09.08.2011.

3. Чаквін, І. У. Нацыя ліцвінаў у этнагенезе беларусаў: Параўнальна-тыпалагічны і гістарычны аспекты / І. У. Чаквін // Беларусіка = Albaruthenica. – Кн. 6. Ч. I: Беларусь паміж Усходам і Захадам. / рэд. У. Конан [і інш.]. – Мінск : Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, 1997. – С. 37 – 42.

[78] Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795 – 1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – С. 107.

# ТЭМА 18. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І ФІЛАСОФСКАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.

Тэрміны: *арганічныя асновы, грамадскі арганізм, кансерватызм, пецярбургская катэрыя.*

1. Грамадска-палітычная дзейнасць канспіратыўных арганізацый.
2. Узмацненне кансерватыўнага напрамку ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі ў 40-х гадах XIX ст.
3. Гегельянства ў філасофскай думцы Беларусі.

## 18.1. Грамадска-палітычная дзейнасць канспіратыўных арганізацый

***Масонства на беларускіх землях.*** Першыя масонскія ложы ў Рэчы Паспалітай узніклі падчас праўлення караля Аўгуста Панятоўскага (1736 – 1763). У 1784 г. польскія ложы аб’ядналіся ў «Вялікі Усход Польскі», якому падпарадкоўваліся і ложы на тэрыторыі Беларусі. У Расійскай імперыі масонскія ложы (каля 130) узніклі таксама ў канцы XVIII стагоддзя. У Расіі існавалі як прыхільнікі англійскага масонства першых трох ступеняў, так і паслядоўнікі шведскай сістэмы і разенкрэйцэрства. У 1813 г. у найбольш уплывовай віленскай ложы «Руплівы літвін» налічвалася 23 чалавекі, сярод іх 3 універсітэцкія прафесары і 6 духоўных асоб. У ложу таксама ўступіў віленскі грамадзянскі губернатар А. Лавінскі. У 1816 г. была адкрыта ложа ў Мінску. Яе ўзначаліў Я. Ходзька. У сярэдзіне 1821 г. ложы існавалі ва ўсіх губернскіх гарадах Беларусі. Яны аб’ядноўвалі каля 800 чалавек. Большасць сярод мясцовых масонаў складалі буйныя землеўладальнікі. У склад ложаў уваходзілі таксама выкладчыкі, адвакаты, лекары, чыноўнікі. У масоны ўступалі як па ідэалагічных матывах, так і з-за кар’ерных гледзішчаў. Аднымі з асноўных накірункаў актыўнасці масонаў была дзейнасць па прапагандзе этыка-палітычных ідэй і дабрачыннасць[79].

**Дзейнасць таемных маладзёжных арганізацый.** Развіццё асветы і ідэалы, якія прапагандаваліся многімі выкладчыкамі гімназій і Віленскага ўніверсітэта, стымулявалі стварэнне арганізацый сярод навучэнцаў. У 1809 – 1810 гг. існавала падлеткавая ваенна-спартыўная арганізацыя павятовай школы ў Наваградку «Корпус вучняў», у 1813 – 1815 гг. – «Войска Марса і Апалона» ў гімназіі Маладзечна. Удзельнікі гэтай арганізацыі не толькі займаліся спортам, але і ставілі перад сабой мэты самавыхавання і літаратурнай адукацыі. Арганізатарамі былі Т. Зан і Л. Ходзька.

---

[79] Швед, В. В. Масоны і ложы на землях Беларусі (канец XVIII – першая чвэрць XIX ст.) / В. В. Швед. – Гродна : ГрДУ імя Я. Купалы, 2007. – С. 5 – 8.

Пераважная колькасць маладзёжных змоўніцкіх арганізацый з'явілася паміж 1815 і 1820 гг.: таварыства шубраўцаў (1817 – 1822), таварыства філаматаў (1817 – 1823), таварыства думаючай моладзі (1817 – 1820), Віленскае літаратурнае таварыства (1819 – 1820), антыпрамяністыя (1820), гурток у віленскай гімназіі (1819 – 1821), навуковае таварыства ў Свіслацкай гімназіі (1819 – 1824), Маральнае таварыства ў Свіслачы (1819 – 1820), Віленскае друкарскае таварыства (1818), Звяз годных мужоў у Вільні (1820). Гэтыя суполкі ахапілі працай у асноўным толькі шляхецкую моладзь. Адметнай рысай канспіратыўных маладзёжных арганізацый з'яўлялася ідэалогія польскага нацыяналізму. Групоўкі актыўна палемізавалі паміж сабой: шубраўцы з антышубраўцамі, прамяністыя з антыпрамяністымі. Змоўніцкія маладзёжныя арганізацыі хутка эвалюцыяніравалі ад асветніцка-рацыяналістычнай арыентацыі да рамантычна-ліберальнай і кансерватыўна-легітымісцкай[80].

Мода на канспірацыю ў першай палове XIX ст. аказвала значны ўплыў на сацыяльныя паводзіны ў маладзёжных асяродках. Гэтая тэндэнцыя была народжана агульнай палітызаванай атмасферай у еўрапейскіх дзяржавах паміж напалеонаўскімі войнамі і французскай рэвалюцыяй 1848 г. Палітычная канспірацыя прыўнесла элементы новай маралі ў адносіны прадстаўнікоў прывілеяванага грамадства. Побач з сямейнымі, сяброўскімі і суседскімі формамі ўзаемадзеяння, заснаванымі на рыцарскіх і хрысціянскіх каштоўнасцях, з'явіліся згуртаванні, якія падпарадкоўваліся дысцыпліне, клятве, аўтарытэту кіраўніка. Таталітарныя прынцыпы самаарганізацыі таемных таварыстваў відавочна адрозніваліся ад індывідуалістычнага дваранскага этасу. Шпегаванне і боязь шпіёнаў, містыфікаванне свайго асяроддзя, тэатралізацыя паводзін, экзальтацыя, арыентацыя на гвалтоўныя неправавыя формы вырашэння сацыяльных канфліктаў, амбівалентная мараль, дэмагагічнасць і, разам з тым, ідэйнасць, дэмакратызм, самаахвярнасць – усе гэтыя рысы субкультуры таемных таварыстваў стваралі новы кантэкст грамадска-палітычнага жыцця Беларусі першай паловы XIX стагоддзя[81].

У першай палове XIX стагоддзя сярод радыкальнай моладзі Беларусі сталі распаўсюджвацца ідэі хрысціянскага сацыялізму (Ф. Ламенэ). Да канца 40-х гг. XIX ст. усе грамадскія пытанні зводзіліся да патрабавання канстытуцыі і аднаўлення Рэчы Паспалітай. Надзея на ажыццяўленне «польскага паўстання», на якую накладваліся паведамленні пра рэвалюцыйныя

---

[80] Соколова, М. Общественные объединения и движения как факторы формирования гражданского общества в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / М. Соколова // [Электронный ресурс] – 21 декабря 2011. – Режим доступа: http://old.kamunikat.org/knihi.html?pubid=12687.

[81] Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795 – 1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – С. 87.

падзеі ў Еўропе, адсоўвалі на задні план сацыяльныя праграмы. Уся палітычная канспіратыўная работа зводзілася да традыцыйных форм падрыхтоўкі паўстання за аднаўленне Рэчы Паспалітай.

***Дэмакратычнае таварыства***. У 1836 г. сярод студэнтаў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі ўтварылася «Дэмакратычнае таварыства», лідарам якога зрабіўся студэнт *Франц Савіч* (1815 – 1845). Акрамя студэнтаў, у суполку ўваходзілі прадстаўнікі разначыннай інтэлігенцыі і дробнай шляхты. Ф. Савіч прытрымліваўся радыкальных дэмакратычных поглядаў, крытычна ацэньваў дзейнасць шляхецкіх рэвалюцыянераў у 1830 – 1831 гг. Удзельнікі таварыства выступалі за вызваленне сялянства, прапагандавалі рэспубліканскі лад. У 1837 г. «Дэмакратычнае таварыства» стала часткай нелегальнай падпольнай сеткі радыкала Ш. Канарскага «Садружнасць польскага народа», вядомай яшчэ пад назвай «Маладая Польшча». У чэрвені 1838 г. улады выкрылі змову, у выніку пацярпелі многія беларускія гурткі, якія паспяшаліся ўвайсці ў арганізацыю Ш. Канарскага. Не стала выключэннем і «Дэмакратычнае таварыства», яго актыўныя члены былі сасланы салдатамі ў дзеючую армію[82].

*Юльян Бакшанскі*. За сувязь з тайнымі студэнцкімі гурткамі і захоўванне забароненых кніг у 1842 г. Ю. Бакшанскі (1824 – 1863) быў сасланы ў Разанскую губерню. У 1846 г. ён вярнуўся з выгнання і ў сакавіку 1847 г. напісаў «Адозву да смаргонскіх сялян», у якой заклікаў аб’яднацца з мяшчанамі і салдатамі і выступіць супраць памешчыкаў. Ю. Бакшанскі разглядаў народнае паўстанне як асноўны сродак вырашэння сацыяльных і нацыянальных праблем. Быў ізноў арыштаваны і засуджаны на 12 гадоў катаргі, якую адбываў у Нерчынску да 1858 г. У 1863 г. на радзіме арганізаваў і ўзначаліў атрад паўстанцаў і ў сутычцы з урадавымі войскамі загінуў у в. Свечкі.

## 18.2. Узмацненне кансерватыўнага напрамку ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі ў 40-х гадах ХІХ ст.

Пасля арышту ў 1838 г. эмісара польскіх эмігрантаў-радыкалаў Шымона Канарскага і раскрыцця нелегальных студэнцкіх гурткоў у грамадстве сфарміравалася насцярожанае стаўленне да рэвалюцыйнай канспірацыі. Розныя па сваёй ідэалогіі плыні пачалі яднацца вакол ідэі захавання «*арганічных асноў*» грамадства пры правядзенні асцярожных рэформ. Гэтая класічная кансерватыўная пазіцыя ўзыходзіць да ідэй кнігі «Разважанні

---

[82] Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X – XIX ст.: Энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – С. 541 – 544.

аб рэвалюцыі ў Францыі» (1790) Э. Бэрка (1729 – 1797). Э. Бэрк разглядаў грамадства як арганічнае цэлае, у якім індывіды выконваюць розныя ролі і функцыі. На яго думку, сацыяльная арганізацыя засноўваецца на іерархіі. Кіраваць павінна натуральная эліта, якая вылучаецца па паходжанні, багацці або адукацыі. Грамадства аб'ядноўваюць старажытныя традыцыі. Змены могуць адбывацца толькі тады, калі яны маюць усеагульную падтрымку. Сацыяльны працэс – вынік індывідуальнага для кожнай нацыі вопыту спроб і памылак, увасобленага ў інстытутах і каштоўнасцях. Само паняцце «*грамадскі арганізм*», уведзенае Э. Бэркам, падкрэслівала немагчымасць пераносу палітычных дактрын адной нацыі на іншую. Кансерватыўныя тэндэнцыі выяўляліся ў гарадзенскай «Ундзіне» і віленскіх «Павучальных запісках». Аднак на старонках гэтых выданняў знаходзілі месца і ідэі постасветніцкага эклектызму. Канчатковае вызначэнне пазіцый публіцыстаў наступіла пасля падзей 1846 – 1848 гг. З аднаго боку барыкад апынуліся эклектычныя раней «Athenaeum» і «Rubon», а з іншага – таксама эклектычныя да гэтага «Gwiazda» і «Літаратурны штогоднік»[83].

*Генрых Ржавускі.* У 1841 г. выйшаў першы том «Змешвання звычаяў» Генрыха Ржавускага (1791 – 1866). Лейтматывам працы з'яўлялася ўслаўленне польскай арыстакратыі, каталіцызму, езуітаў. Аўтар выказваў пагарду да народа, які ён называў «арганізмам, што жыве раслінным жыццём».

У чацвёртым томе часопіса «Athenaeum» Ю. Крашэўскага быў надрукаваны артыкул Г. Ржавускага «Аб законах цывілізацыі народаў», у якім аўтар прапагандаваў ідэі Ж. дэ Мэстра аб ролі боскага промыслу ў развіцці цывілізацыі, крытыкаваў тэорыі прагрэсу. У работах «Інтэлектуальныя шпацыры» і «Змешванне звычаяў» Г. Ржавускі крытыкаваў ідэю дэмакратыі і даў вызначэнне паняцця «свабода». З пункту гледжання Г. Ржавускага, асабістая свабода можа існаваць толькі пад патранатам манархіі. Нежаданне падпарадкоўвацца іерархіі парушае гэтую свабоду. На думку Г. Ржавускага, свабода – гэта прывілей, якім можа карыстацца толькі арыстакратыя.

*Канстанцін Буйніцкі.* Кансерватыўныя публіцысты аб'ядноўваліся таксама вакол часопіса «Rubon», рэдактарам якога быў К. Буйніцкі (1788 – 1879). Богабаязнасць, павага да закона і мясцовых улад, любоў да радзімы, патрыярхальная прастата – каштоўнасці, якія прапагандаваў часопіс. К. Буйніцкі захапляўся езуітамі, якія стаялі на варце старапольскіх звычаяў. Ідэі К. Буйніцкага ў сваім супрацьпастаўленні славянскага і заходнееўрапейскага сусветаў збліжалі яго са славянафіламі.

---

[83] Соколова, М. Общественные объединения и движения как факторы формирования гражданского общества в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / М. Соколова // [Электронный ресурс]. – 21 декабря 2011. – Режим доступа: http://old.kamunikat.org/knihi.html?pubid=12687.

***Пецярбургская катэрыя.*** Польскія кансерватыўна-клерыкальныя публіцысты, якія звычайна друкаваліся ў пецярбургскай польскамоўнай газеце «Tygodnik Petersburski», аб'ядналіся ў так званую «пецярбургскую катэрыю», або «пентархію» (М. Грабоўскі, І. Галавінскі, Г. Ржавускі, Ю. Крашэўскі, К. Падвысоцкі, А. Пшаздзецкі, Л. Штырмер, Ю. Працлаўскі). Сябры «катэрыі» імкнуліся нейтралізаваць ліберальныя ідэі ў польскамоўным грамадстве. Пецярбургская катэрыя выкарыстоўвала палітычныя даносы ў барацьбе са сваімі ідэйнымі праціўнікамі з альманаха «Gwiazda». Сябры «катэрыі» асудзілі польскую шляхецкую рэвалюцыю 1831 г., захоўвалі лаяльнасць царскаму ўраду, аднак выказваліся за пашырэнне польскай эканамічнай і культурнай экспансіі на землях Беларусі, Украіны і Літвы. Беларуская народная творчасць разглядалася сябрамі групоўкі толькі як чарнавы матэрыял для польскага мастацтва[84].

## 18.3. Гегельянства ў філасофскай думцы Беларусі

*Юзаф Быхавец* (1778 – 1845) – філосаф, пісьменнік. Першы польскі перакладчык работ Э. Канта. У 1799 г. паступіў у Кёнігсбергскі ўніверсітэт, дзе асабіста пазнаёміўся з Э. Кантам. У Кёнігсбергу Ю. Быхавец атрымаў ступень доктара філасофіі. У 1806 г. уступіў у войска Напалеона. У 1808 г. у Мінску напісаў філасофскую паэму «Вайна розуму з воляй...», у 1809 г. – «Ліст аб прызначэнні жаўнера...». У 1816 г. напісаў у якасці конкурснай працы «Слова пра філасофію...». Працаваў прыватным настаўнікам, перакладчыкам, працягваў пісаць філасофскія творы. Пазней знаходзіўся пад уплывам ідэй Гегеля. Пераклаў твор Гердэра «Ідэі да філасофіі гісторыі чалавека» (1835)[85].

*Фларыян Бохвіц* (1799 – 1856) – філосаф, пісьменнік. Вучыўся на юрыдычным факультэце Кіеўскага ўніверсітэта. Увесь свой вольны час аддаваў філасофскім разважанням, літаратуры. У 1838 г. выдаў кнігу «Форма майго мыслення». Пазней выйшлі працы «Сутнасць маёй думкі...» (ч. 1 – 2, 1838 – 1841), «Асновы маіх думак і пачуццяў» (1842), «Думкі аб выхаванні чалавека» (1847). Са сваіх пазіцый Бохвіц імкнуўся прымірыць філасофію і багасловуе, рэлігію з навукай. Праграму навучання ён грунтаваў адначасова на прынцыпах асветніцтва і рэлігійнай маралі. Разглядаў прагрэс як дыялектычны працэс, разважаў аб карысці сацыяльнага прагрэсу, выступаў супраць рэвалюцыйных змен[86].

---

[84] Хаўстовіч, М. В. Гісторыя беларускай літаратуры 30 – 40-х гг. XIX ст. / М. В. Хаўстовіч. – Мінск : БДУ, 2001. – С. 24 – 25.
[85] Бортнік, І. А. Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік / І. А. Бортнік. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – С. 74.
[86] Тамсама. – С. 75.

**Літаратура**

1. Вольныя муляры ў беларускай гісторыі. Канец XVIII – пачатак XX ст. / пад рэд. А. Ф. Смаленчука. – Вільня : Gudas, 2005. – 280 с.

2. Куль-Сяльверстава, С. Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гады) / С. Я. Куль-Сяльверстава. – Мінск : БДУ, 2000. – 260 с.

3. Мохнач, Н. Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30 – 40-е годы XIX в. / Н. Н. Мохнач. – Минск : Наука и техника, 1971. – 157 с.

4. Мохнач, Н. Н. От просвещения к революционному демократизму: Общественно-политическая и философская мысль Белоруссии конца 10-х – начала 50-х годов XIX в. / Н. Н. Мохнач. – Минск : Наука и техника, 1976. – 184 с.

# ТЭМА 19. ЭСТЭТЫЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ПРАДСТАЎНІКОЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.

Тэрміны: *нацыяналізм, рамантызм, польскі месіянізм, шавінізм.*

1. Рамантызм і яго сувязь з нацыянальна-вызваленчым рухам.
2. Ідэя народнасці ў філаматаў.
3. Эстэтычныя погляды Л. Бароўскага.

## 19.1. Рамантызм і яго сувязь з нацыянальна-вызваленчым рухам

Рамантызму ад пачатку яго фарміравання быў уласцівы нацыяналізм – ідэалізацыя гістарычнага мінулага, як правіла, сярэднявечча, і традыцыйнай народнай культуры. Адсюль, напрыклад, цікавасць В. Скота да народнай шатландскай балады і нараджэнне жанра гістарычнага рамана. Перыяд шчыльнага ўзаемадзеяння рамантычнай эстэтыкі і нацыянальна-вызваленчага руху еўрапейскіх народаў доўжыўся з канца напалеонаўскіх войнаў (1814) да пачатку Першай сусветнай вайны (1914). Найбольш відавочна гэты альянс палітыкі і мастацтва выявіўся ў Германіі, Італіі, Грэцыі і краінах Усходняй Еўропы (Беларусь, Польшча, Украіна, Літва).

Гістарычныя раманы Генрыха Ржавускага («Успаміны Сапліцы»), Ігнація Ходзькі («Успаміны квестара»), эпічная паэма Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш», балады Уладзіслава Сыракомлі абуджалі ў шляхецкім грамадстве цікавасць да вытокаў польскай дзяржаўнасці. У гэтым жа рэчышчы развіваўся як празаік і Ян Баршчэўскі. Сярод рускамоўных чытачоў найбольшай папулярнасцю карысталіся белетрыстычныя творы з гістарычным сюжэтам Фадзея Булгарына. Як правіла, раманістаў гэтага накірунку прываблівалі гістарычныя перыяды, калі нацыя знаходзілася на вяршыні ма-

гутнасці. Для польскамоўных літаратараў такой эпохай лічыліся часы шляхецкай «залатой вольнасці», якую яны рупліва міфалагізавалі.

Яшчэ адным вектарам актыўнасці рамантычна настроенай інтэлігенцыі з'яўлялася вывучэнне народных гаворак. Складаліся слоўнікі народнай мовы (І. Насовіч, Я. Чачот). Праводзілася збіранне і публікацыя фальклорных тэкстаў. Нараджалася рамантычная белетрызаваная гістарыяграфія, якая ідэалізавала мінулае, ішла часам на міфалагізацыю падзей і фальсіфікацыю крыніц (Т. Нарбут, І. Лялевель). У мастацтве ўводзіўся культ «вялікіх людзей» і «вялікіх падзей», такіх як Грунвальдская бітва (Я. Матэйка «Грунвальдская бітва»). Назіраўся росквіт гістарычнага жывапісу на нацыянальныя тэмы. На землях былой Рэчы Паспалітай зрабіўся папулярным стыль неаготыкі. Цікавасць да народнай музыкі надавала нацыянальную афарбоўку музыцы прафесійных кампазітараў (С. Манюшка).

Прапагандаваўся тэзіс пра ўнікальны характар палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай. Галоўным яе здабыткам лічылася палітычная свабода, якой карысталіся грамадзяне шляхецкай дзяржавы; апошняй супрацьпастаўляліся дэспатычныя рэжымы ў суседніх краінах. Аднак не ўдакладняўся саслоўны характар рэчпаспалітаўскай дэмакратыі. На стыку сеймікавых традыцый і застольнай тоставай практыкі сфарміравалася любоў да патрыятычнай фразы. Шляхціц-патрыёт паўставаў перадусім абаронцам інтарэсаў шляхецкага саслоўя – «залатой вольнасці», сістэмы шляхецкіх прывілеяў. Атаясамленне саслоўных інтарэсаў з нацыянальнымі – выразная рыса шляхецкай ментальнасці. Вобраз Айчыны асацыіраваўся ў рамантычнай публіцыстыцы з правам, юрыдычным парадкам, што гарантаваў шляхце яе выключны сацыяльны статус. Шляхецкаму саслоўю было ўласціва адчуванне ўнікальнасці сваёй місіі – быць абаронцамі і распаўсюджвальнікамі заходніх хрысціянскіх каштоўнасцяў.

*Юзаф Галухоўскі* (1797 – 1858) – педагог, публіцыст. У 1823 – 1824 гг. надзвычай папулярны прафесар філасофіі ў Віленскім універсітэце. Напісаў некалькі твораў па аграноміі і медыцыне. Аўтар працы «Філасофія ў яе адносінах да жыцця ўсяго чалавецтва і кожнага чалавека паасобку» (1822), у якой развіваў і прапагандаваў ідэі Ф. Шэлінга. Паводле яго сцверджанняў, філасофія дае грунт усім грамадскім і прыватным адносінам, а таму павінна быць прадметам апекі з боку дзяржавы. У 1861 г. выйшла галоўная філасофская работа Ю. Галухоўскага – «Разважанні над найгалоўнейшымі праблемамі чалавека...» (т. 1 – 2, 1861), у якой ён выступіў праціўнікам матэрыялізму. Аўтар прыйшоў да пераканання, што розум не здольны вырашаць самыя важныя пытанні. Паводле Ю. Галухоўскага, вышэйшым органам пазнання з'яўляецца пачуццё. Навукі імкнуцца да пазнання прыватных ісцін пры дапамозе розуму, а філасофія імкнецца да су-

зірання ўсіх ісцін у Богу. Чым мацнейшая любоў да Бога, тым лепш дасягаецца мэта філасофскага аналізу. Ю. Галухоўскі падтрымліваў прыгон і быў праціўнікам вызвалення сялянства. Аказаў значны ўплыў на фарміраванне грамадска-палітычных поглядаў філаматаў і прадстаўнікоў іншых польскіх таемных таварыстваў у Беларусі.

## 19.2. Ідэя народнасці ў філаматаў

Погляды філаматаў адлюстроўвалі ўласцівую шляхце саслоўную абмежаванасць у разуменні паняцця «нацыянальнае» і «народнае». Пад народам – нацыяй – філаматы разумелі выключна шляхту. Праграмы паляпшэння становішча краю, якія абмяркоўваліся ў віленскіх студэнцкіх асяродках, мелі на ўвазе захады на карысць толькі дробнашляхецкага грамадства. Філаматы не ўсведамлялі ўсяго цяжару сацыяльнага становішча беларускага селяніна. Спосаб паляпшэння становішча сялянства бачыўся філаматам пераважна ў плоскасці маральнага самаўдасканалення як самога сялянства, так і паноў. У мясцовай шляхецкай інтэлігенцыі імкненне да асветы і прагрэсу адначасова спалучалася з бесчалавечнасцю ў адносінах да прыгонных. Пад паняцце «цывілізаваны чалавек» падпадаў той, хто чытаў па-французску, любіў літаратуру і філасофскія развагі. Яго адносіны з уласнымі сялянамі іншых не цікавілі.

Замест крытычнага аналізу сітуацыі з боку шляхецкай інтэлігенцыі рабіліся спробы перакласці з сябе палітычную адказнасць за гаротнае становішча ў беларускай вёсцы на ўрад. Існавала дыстанцыя, якая дазваляла захоўваць сантымент да селяніна, але выключала магчымасць агульнанацыянальнай салідарызацыі. Нават абмежаваныя захады ў паляпшэнні сялянскага побыту сярод прадстаўнікоў тутэйшага шляхецтва звычайна кваліфікаваліся зневажальным азначэннем «хлапаманства»[87].

*Адам Міцкевіч* (1798 – 1855) – польскі паэт і публіцыст, грамадска-палітычны дзеяч. Аўтар драматычнай паэмы «Дзяды» (1820 – 1832), трактата «Кнігі польскага народа і польскага пілігрымства» (1832), эпічнай паэмы «Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве» (1834), «Лекцый аб славянскай літаратуры» (1840 – 1844) і інш. Захапляўся міфалогіяй балтаў, паэтызаваў вобраз Літвы. Апошнюю ён разглядаў як неаддзельную ад Польшчы гістарычную правінцыю Рэчы Паспалітай. Літва, у разуменні А. Міцкевіча, – гэта не толькі этнічныя балцкія землі, але і сучасная Гродзеншчына і значная частка Міншчыны.

---

[87] Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795 – 1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – С. 133.

А. Міцкевіч пры жыцці зрабіўся сімвалам польскага нацыянальнага руху. Узмацненне ў асяроддзі шляхецкай інтэлігенцыі месіянскіх настрояў у першай палове XIX стагоддзя, эксцэсы шавінізму, звязаныя са складаным працэсам станаўлення польскай нацыянальнай свядомасці, – усё гэта знайшло адлюстраванне ў творчасці паэта, у прыватнасці, у «Кнігах польскага народа і польскага пілігрымства». Польская месіянская ідэя, якую развіваў А. Міцкевіч, заключалася ў атаясамленні Польшчы з Ісусам Хрыстом. Гісторыя Польшчы ўяўлялася як беспрэцэдэнтна пакутлівая і ключавая па сваёй важнасці для самога існавання чалавечай цывілізацыі. Як Хрыстос пакутаваў дзеля выратавання людзей, гэтак і Польшча сваімі «пакутамі» выкупае грахі чалавецтва.

А. Міцкевіч падзяляў «сармацкія» стэрэатыпы дробнашляхецкага асяроддзя. Паэма А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш» – гэта гімн польскай арыстакратыі. На старонках паэмы няма ніводнага выразнага сялянскага вобразу. Беларускі край паўстае ў паэме А. Міцкевіча канфедэрацыяй шляхецкіх маёнткаў, атачоных сацыяльна чужым асяроддзем, дзе, як прыдатак пейзажа, зрэдку сустракаецца «селянін-іншаверац»[88].

## 19.3. Эстэтычныя погляды Л. Бароўскага

*Лявон Бароўскі* (1784 – 1846) – філолаг, гісторык і тэарэтык літаратуры, прафесар Віленскага ўніверсітэта. Аказаў уплыў на творчае станаўленне польскай літаратурнай моладзі генерацыі філаматаў (А. Міцкевіча, А. Чачота, А. Адынца). Л. Бароўскі намагаўся прымірыць класіцызм з эстэтыкай рамантызму. У творы «Заўвагі аб паэзіі і красамоўстве з пункта гледжання іх адрознення і падабенства» ён разглядае гістарычнае развіццё паэзіі і красамоўства. На думку Л. Бароўскага, на першапачатковых этапах развіцця чалавецтва пераважала паэзія. На пачатку чалавечай гісторыі людзі больш адчуваюць, чым думаюць і размаўляюць, – гэты стан грамадства і ёсць уласна паэтычны. Аднак паступова чалавецтва цывілізуецца, што прыводзіць да змены мовы. Яна ўзбагачаецца новай, больш дакладнай тэрміналогіяй. Паэты ператвараюцца ў прафесіяналаў-рамеснікаў. Больш шырокую сферу выяўлення набывае красамоўства. Па меркаванні Л. Бароўскага, у розныя перыяды гісторыі і ў розных краінах адбываецца перавага або паэзіі, або красамоўства. Напрыклад, у Грэцыі панавала паэзія, а ў Рыме – красамоўства[89].

[88] Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795 – 1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – С. 123.

[89] Конан, У. М. Бароўскі Лявон // Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. даведнік / гал. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995. – С. 364 – 366.

**Крыніцы**

1. Баршчэўскі, Я. Нарысы паўночнае Беларусі / Я. Баршчэўскі // Выбраныя творы / укл., пер. з пол. М. Хаўстовіча. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. – С. 82 – 89.

2. Булгарин, Ф. Воспоминания Фаддея Булгарина. Отрывки из виденного, слышанного и испытанного в жизни / Ф. Булгарын // Выбранае / укл. А. Фядуты. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. – (Беларускі кнігазбор; Сер. II. Гісторыка-літаратурныя помнікі) – С. 49 – 170.

3. Пачынальнікі: З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / уклад. Г. В. Кісялёў. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 549 с.

4. Ходзька, І. Успаміны квестара / І. Ходзька; пер. с польск. М. В. Хаўстовіча // XIX стагоддзе: Навукова-літ. альманах. – Кн. 1. – Мінск : БДУ, 1999. – С. 79 – 126.

5. Чачот, Я. Думкі для ніжэйшага класа / Я. Чачот // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 642 – 644.

6. Чачот, Я. Думкі, якія павінен пашыраць вышэйшы клас / Я. Чачот // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 644 – 646.

**Літаратура**

1. Куль-Сяльверстава, С. Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гады) / С. Я. Куль-Сяльверстава. – Мінск : БДУ, 2000. — 260 с.

2. Шыдлоўскі, С. А. Шляхецкі саслоўны ідэал у творах Яна Баршчэўскага / С. А. Шыдлоўскі // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А: Гуманитарные науки. – 2005. – № 7. – С. 128 – 134.

3. Шыдлоўскі, С. А. Шляхецкі этас у творах А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш» і Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня» / С. А. Шыдлоўскі // Acta albaruthenica: Навуковы зборнік / пад агул. рэд. М. Хаўстовіча [і інш.]. – Выпуск пяты. – Мінск : Права і эканоміка, 2005. – С. 177 – 181.

4. Хаўстовіч, М. В. Гісторыя беларускай літаратуры 30 – 40-х гг. XIX ст. / М. В. Хаўстовіч. – Мінск : БДУ, 2001. – 171 с.

# ТЭМА 20. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.

Тэрміны: *«арганічная праца», лібералізм, «праца ля асноў», тэорыя малых спраў.*

1. Ліберальна-дваранская грамадска-палітычная думка.
2. Лева-рэвалюцыйны рух.

## 20.1. Ліберальна-дваранская грамадска-палітычная думка

60-я гады XIX стагоддзя з'яўляліся часам росквіту лібералізму ў сферы эканамічнай палітыкі ў Заходняй Еўропе. Грамадскасць Беларусі знаё-

мілася з ліберальнымі тэндэнцыямі дзякуючы рускаму часопісу «Вестник Европы», варшаўскім выданням «Ekonomista» («Эканаміст»), «Gazeta Handlowa» («Гандлёвая газета»), «Przegland Tygodniowy» («Штотыднёвы агляд»). У парэформенны перыяд у Беларусі распаўсюджваўся лібералізм пазітывісцкага накірунку, які прыняў у якасці праграмы ліберальныя варыянты тэорыі «*арганічнай працы*» – «працы ля асноў» і «ліберальнага індустрыялізму». Мэтай арганічнай працы з'яўлялася стварэнне эканамічна незалежнага ад расійскай дзяржавы, палітычна ўплывовага польскага грамадства. Падобная дзейнасць разглядалася як альтэрнатыва шляхецкай рэвалюцыйнай канспірацыі, якая, як лічылі лібералы, прыносіла палякам больш шкоды, чым рэальна служыла вызваленню Польшчы. «Арганічная праца» ўяўляла сабой дзейнасць прыватных асоб у прыватных інтарэсах, але з карысцю для развіцця грамадства. Разнастайныя асацыяцыі выхоўвалі ў сваіх членаў звычку ўдзельнічаць у грамадскіх справах. Лічылася, што падобная «арганічная праца» з'яўляецца адзіна магчымай формай легальнай дзейнасці ў краіне, эканамічная сфера важнейшая за сферу палітыкі і заўсёды застанецца вобласцю вольнай індывідуальнай дзейнасці[90].

У серыі артыкулаў А. Свентахоўскага і Л. Мікульскага «Праца ля асноў», якая публікавалася ў «Штотыднёвым аглядзе» (1874), ставілася задача ператварэння пасіўнага народа ў актыўных грамадзян, развіцця мясцовага самакіравання, арганізацыі пачатковых школ, бібліятэк, ашчадных кас. 2 мая 1876 г. А. Свентахоўскі надрукаваў у «Штотыднёвым аглядзе» праграмны артыкул польскага памяркоўнага лібералізму.

«Веснік Еўропы» (К. Арсеньеў, А. Пыпін) прапаведаваў тэорыю «малых спраў»: у якім бы становішчы ні знаходзілася грамадства, заўсёды знойдзецца сфера, у якой яно можа працаваць сабе на карысць. Нават сярод радыкалаў з'яўляліся «рэалісты», якія лічылі, што няма неабходнасці імкнуцца да стварэння рэвалюцыйнай партыі. Замест гэтага трэба весці падрыхтоўчую працу ў розных формах, легальных і нелегальных, пераважна сярод моладзі і рабочых.

Да канца 70-х гг. XIX ст. у асяроддзі пазітывістаў у сувязі з рознай ацэнкай ролі дзяржавы ў жыцці грамадства сфармаваліся радыкальны (А. Свентахоўскі) і ўмераны (Э. Пільц, В. Спасовіч) накірункі. Калі ў дактрынах радыкальных пазітывістаў дзяржаве адводзілася сціплая роля, то ўмераныя прызнавалі, што дзяржава з'яўляецца цэнтральным інстытутам грамадства. Памяркоўная ліберальная платформа лягла ў аснову праграмы

[90] Соколова, М. Общественные объединения и движения как факторы формирования гражданского общества в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / М. Соколова // [Электронный ресурс]. – 21 декабря 2011. – Режим доступа: http://old.kamunikat.org/knihi.html?pubid=12687.

штотыднёвіка «Kraj», які выдаваўся з 1882 г. у Пецярбургу Э. Пільцам пры ўдзеле В. Спасовіча. На тых жа пазіцыях стаяла і рэдакцыя «Мінскага лістка» (1886 – 1902) – першай прыватнай газеты Беларусі. Патрабаванні пашырэння земскай рэформы на Паўночна-Заходні край, ліквідацыі саслоўных прывілеяў, галоснасці і незалежнасці прэсы – асноўныя тэмы «Мінскага лістка». У 1894 – 1897 гг. на старонках газеты змяшчаліся артыкулы сацыялістаў, шмат увагі надавалася асвятленню цяжкага становішча сялян, рамеснікаў, крытыкавалася дзейнасць гарадской думы.

Пастунова сярод лібералаў сцвярджалася меркаванне, што таемныя таварыствы шкодныя для палітычнага выхавання народа. У якасці спосабаў барацьбы прапанавалася падаваць петыцыі, праводзіць мірныя дэманстрацыі, заахвочваць людзей да легальнага руху. Сутнасць ліберальнай праграмы гэтага перыяду палягала ў стварэнні вакол урада «атмасферы ліберальных ідэй». У 80-х гг. XIX ст. лібералы змагаліся супраць зачынення «перадавых часопісаў», спынення дзейнасці жаночых курсаў, новага ўніверсітэцкага статуту, перадачы народных школ у рукі духавенства. У другой палове XIX стагоддзя ў ліберальным грамадскім руху пачалі вылучацца нацыянальныя плыні. Яўрэі выступалі пераважна за ўсеагульнае выбарчае права, палякі ставілі на першае месца ідэю ўмацавання польскага грамадства на беларускіх і літоўскіх землях. У Віцебскай губерні беларускія памешчыкі распрацавалі праект адрасу на імя цара, у якім прасілі ўвесці ў заходніх губернях земства. Лідары ліберальнай апазіцыі Беларусі – І. Віткевіч. І. Метлін, А. Аляксандраў – увайшлі ў склад Партыі народнай волі. Ліберальную праграму падтрымлівалі таксама Яўрэйскі саюз раўнапраўя і Польская нацыянальна-дэмакратычная партыя[91].

## 20.2. Лева-рэвалюцыйны рух

**Канстанцін Каліноўскі.** Адным з найбольш яркіх прадстаўнікоў кола шляхецкіх рэвалюцыянераў у Беларусі быў *Кастанцін Вікенцій Каліноўскі* (1838 – 1864). У 1862 г. К. Каліноўскі разам з Ф. Ражанскім, С. Сангіным і В. Урублеўскім пачаў выпуск «Мужыцкай праўды» – першай газеты на беларускай мове (выйшла 7 нумароў). Яна крытыкавала палітыку царскіх улад і маніфест аб скасаванні прыгону, заклікала сялян да бунту. Мэтай выдання газеты з’яўлялася антыўрадавая агітацыя сярод сялянства напярэдадні плануемага шляхецкага паўстання. У 1862 г. К. Каліноўскі ўваходзіў

[91] Соколова, М. Общественные объединения и движения как факторы формирования гражданского общества в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / М. Соколова // [Электронный ресурс]. – 21 декабря 2011. – Режим доступа: http://old.kamunikat.org/knihi.html?pubid=12687.

у склад Літоўскага правінцыйнага камітэту (ЛПК) – цэнтральнага органа падрыхтоўкі паўстання на землях былога ВКЛ. К. Каліноўскі стаяў на чале радыкальных рэвалюцыянераў, якіх, у адрозненне ад лібералаў – «белых», называлі «чырвонымі». Гэты накірунак меў на мэце стварэнне дэмакратычнай рэспублікі, перадачу зямлі сялянам, аднаўленне ВКЛ і грэка-каталіцкай царквы.

Пачатак пашырэння сацыялістычных ідэй у асяроддзі радыкальнай апазіцыі Беларусі звязана з дзейнасцю маскоўскага гуртка «чайкоўцаў» на мяжы 60 – 70-х гг. ХІХ ст. (лідар – М. В. Чайкоўскі). Асноўнай задачай «чайкоўцы» лічылі знішчэнне эканамічнага прыгнёту і сучаснага дзяржаўнага ладу шляхам сацыяльнай рэвалюцыі. Рыхтаваць рэвалюцыйны пераварот, на іх думку, неабходна было ў асяроддзі сялянства і рабочых. Дзякуючы «чайкоўцам», творы М. Чарнышэўскага, А. Дабралюбава, Д. Міля, Г. Бокля, Л. Блана, Ф. Ласаля, К. Маркса сталі распаўсюджвацца ў Беларусі. Да 1875 г. гурткі самаадукацыі, якія працавалі па праграме «чайкоўцаў», існавалі амаль ва ўсіх гарадах Беларусі. Гурткоўцы чыталі творы Ласаля, Маркса, Дарвіна, Прудона, але адначасова працягвалі марыць пра аўтаномію Польшчы і выступалі супраць распаўсюджання рускай культуры. Пашыраным відам дзейнасці гурткоў была арганізацыя арцеляў, бібліятэк, сумеснае чытанне і абмеркаванне літаратуры. Актывісты-радыкалы бралі ўдзел і ў «хаджэнні ў народ», займаліся «лятучай прапагандай». Гэты рух не меў поспеху, сяляне не жадалі прыслухоўвацца да сацыялістычнай прапаганды. Тады было вырашана жыць сярод народа, выяўляць народныя патрэбы. Толькі некаторыя нелегальныя гурткі ў Беларусі выразна вызначалі свае ідэйныя пазіцыі. Так, удзельнікі гуртка А. Багдановіча ў Мінску (80-я гг. ХІХ ст.) знаёміліся з «Маніфестам камуністычнай партыі», гісторыяй рэвалюцыйнага руху і класавай барацьбы, лічылі сябе нарадавольцамі, але сувязяў з гэтай арганізацыяй не мелі[92].

***Народнікі і марксісты.*** У першай палове 80-х гг. ХІХ ст. актыўную дзейнасць на тэрыторыі Беларусі разгарнулі «Чорны перадзел», а затым Паўночна-Заходняя арганізацыя «Народнай волі» і польская партыя «Пралетарыят». Сацыялісты Беларусі былі недастаткова знаёмы з марксісцкай літаратурай. Іх светапогляд абмяжоўваўся ў філасофскім плане матэрыялізмам і атэізмам, у палітычным – анархізмам. Дзякуючы дзейнасці расійскіх сацыял-дэмакратаў («Вызваленне працы») і марксістаў, большасць сацыялістычна-арыентаваных груп Беларусі перайшлі ў канцы 80-х гг. на

[92] Соколова, М. Общественные объединения и движения как факторы формирования гражданского общества в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / М. Соколова // [Электронный ресурс]. – 21 декабря 2011. – Режим доступа: http://old.kamunikat.org/knihi.html?pubid=12687.

сацыял-дэмакратычныя пазіцыі. Структура сацыял-дэмакратычных груп адрознівалася цвёрдай цэнтралізацыяй; у межах сацыял-дэмакратычных аб'яднанняў ствараліся дапаможныя структуры (асветніцка-культурныя, узаемадапамогі), усталёўваліся кантакты з прафсаюзамі. Так узнікаў абсалютна новы тып аб'яднанняў – нацыянальныя палітычныя партыі (БУНД, РСДРП, БСГ)[93].

**Крыніцы**

1. Каліноўскі, К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / К. Каліноўскі; уклад., прадм., паслясл., пер. і камент. Г. Кісялёва. – Мінск : Міжнародны фонд «Беларускі кнігазбор», 1999. – 459 с.

**Літаратура**

1. Кісялёў, Г. В. Сейбіты вечнага / Г. В. Кісялёў. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1963. – 303 с.
2. Кісялёў, Г. В. З думай пра Беларусь: Даследаванні і знаходкі з гісторыі беларускай літаратуры і рэвалюцыйнага руху другой паловы XIX стагоддзя / Г. В. Кісялёў. – Мінск : Беларусь, 1966. – 320 с.
3. Кісялёў, Г. В. Паплечнік Каліноўскага: Валерый Урублеўскі / Г. В. Кісялёў. – Мінск : Народная асвета, 1976. – 80 с.

## ТЭМА 21. ЗАХОДНЕРУСІЗМ ЯК ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ПЛЫНЬ БЕЛАРУСКАЙ ДУМКІ

1. Уклад прадстаўнікоў заходнерусізму ў развіццё беларускай навукі і культуры.
2. Грамадска-палітычная дзейнасць І. Сямашкі.
3. Навуковая і грамадска-палітычная дзейнасць М. В. Каяловіча.

### 21.1. Уклад прадстаўнікоў заходнерусізму ў развіццё беларускай навукі і культуры

З канца XVIII стагоддзя сярод часткі айчыннай уніяцкай і праваслаўнай інтэлігенцыі развіваўся працэс усведамлення самабытнасці Беларусі як Заходняй Русі – унікальнага рэгіёна ўсходнеславянскай цывілізацыі. Адбывалася абуджэнне цікавасці да гісторыка-культурных традыцый Полацкага княства і народнай сялянскай культуры. Гэтыя тэндэнцыі развіваліся ў кан-

[93] Соколова, М. Общественные объединения и движения как факторы формирования гражданского общества в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / М. Соколова // [Электронный ресурс]. – 21 декабря 2011. – Режим доступа: http://old.kamunikat.org/knihi.html?pubid=12687.

тэксце барацьбы за вызваленне ад польскай каталіцкай гегемоніі. Прадстаўнікоў заходнерусізму А. Цвікевіч назваў «беларусафіламі ў рускай культуры». Многія «заходнерусы» паходзілі з духоўнага саслоўя, займалі дзяржаўныя і вайсковыя пасады. Літаратурныя і публіцыстычныя творы пісаліся па-руску і па-беларуску[94].

У 1793 г. у Магілёве была выдадзена гістарычная праца «Аб Заходняй Расіі» магілёўскага каталіцкага архіепіскапа *Станіслава Богуш-Сестранцэвіча* (1731 – 1826), які даводзіў гістарычныя правы Расіі на валоданне беларускімі землямі. Адным з яго аргументаў быў тэзіс пра гістарычнае адзінства рускіх, беларусаў і ўкраінцаў. Ёсць пэўныя згадкі таго, што С. Богуш-Сестранцэвіч мог з'яўляцца аўтарам першай «Беларускай граматыкі».

Адным з ранніх прадстаўнікоў заходнерусізму быў *Міхаіл Кірылавіч Баброўскі* (1784 або 1785 – 1848), прафесар Віленскага ўніверсітэта, даследчык царкоўнай і палітычнай гісторыі ВКЛ. Яму належыць меркаванне аб усходнеславянскім характары «Літоўскай Русі». Гэтыя погляды ў агульных рысах падзялялі калегі М. Баброўскага – Іван Лабойка, Іосіф Ярашэвіч, Ігнат Даніловіч, Антон Марціноўскі, Ігнат Анацэвіч[95].

У першай палове XIX стагоддзя цэнтрам беларускага культурнага і навуковага жыцця зрабіўся Гомель. Тут пры падтрымцы расійскага магната графа *Мікалая Пятровіча Румянцава* (1754 – 1826) пачалася вялікая навуковая праца па вывучэнні беларускай гісторыі, культуры, мовы. Пры ўдзеле мецэната разгортвалася навуковая праца заснавальніка беларускай археаграфіі *Івана Грыгаровіча* (1792 – 1862). У 20 – 40-я гг. XIX ст. ён падрыхтаваў да друку і выдаў пяцітомны збор «Актов Западной России». Гэтыя археаграфічныя зборнікі паспрыялі распрацоўцы ўласна беларускай гістарычнай навукі.

Усведамленню гістарычнай самабытнасці беларусаў і Беларусі спрыялі гістарычныя працы М. Без-Карніловіча («Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся») і В. Турчыновіча («Обозреніе исторіи Белоруссии с древнейших времен»). М. Без-Карніловіч лічыў беларусаў нашчадкамі крывічоў і радзімічаў, высока ацэньваў дзяржаўна-культурную спадчыну Полацкай зямлі. В. Турчыновіч першым пачаў разглядаць гісторыю Беларусі як самастойны прадмет даследавання.

---

[94] Смалянчук, А. Ліцвінства, заходнерусізм і беларуская ідэя. XIX – пачатак XX ст. / А. Смалянчук // Камунікат [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://w.kamunikat.org/7983.html. – Дата доступа: 24.12.2011.

[95] Тамсама.

*Іван Іванавіч Насовіч* (1788 – 1877) – мовазнавец-лексікограф, фальклярыст, этнограф. Аўтар першага гістарычнага слоўніка беларускай мовы «Алфавітны ўказальнік старажытных беларускіх слоў, выбраных з Актаў, што адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі» (Увараўская прэмія 1865 г.). Асноўная навуковая праца І. І. Насовіча – «Слоўнік беларускай мовы» (1870, Дзямідаўская прэмія 1865 г.), у які ўвайшло больш за 30 000 слоў, запісаных у Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, а таксама выбраных са старабеларускіх пісьмовых помнікаў. У 1881 г. быў выдадзены «Дадатак да беларускага слоўніка І. І. Насовіча» (каля 1000 слоў). Слоўнік І. І. Насовіча да нашага часу застаецца адным з найбольш каштоўных збораў беларускай лексікаграфіі. Значны след пакінулі ў беларускай навуцы і іншыя фальклорна-этнаграфічныя працы І. І. Насовіча: «Зборнік беларускіх прыказак» (1867 г., залаты медаль Рускага геаграфічнага таварыства), які змяшчае каля 3500 прыказак, прымавак, прыгаворак, праклёнаў, «Беларускія прыказкі і прымаўкі» (1868), «Беларускія прыказкі і загадкі» (1868), «Беларускія песні» (1873, больш за 350 тэкстаў), рукапіс зборніка «Легенды, паданні, быліны, байкі, анекдоты». І. І. Насовіч з’яўляецца таксама аўтарам гістарычна-лінгвістычнага нарыса «Аб плямёнах да часоў Рурыка, што засялялі беларускую тэрыторыю», у якім даводзіцца, што назвы плямёнаў «дрыгавічы», «радзімічы», «крывічы» паходзяць ад беларускіх народных слоў. Даследчык таксама пакінуў аб’ёмную гісторыка-мемуарную працу «Успамінаў майго жыцця», якая не друкавалася.

*Ксенафонт Антонавіч Гаворскі.* Пэўная роля ў развіцці айчыннага беларусазнаўства належыць Ксенафонту Антонавічу Гаворскаму (каля 1811 – 1871) – беларускаму грамадскаму дзеячу, археолагу, гісторыку, журналісту і выдаўцу. К. А. Гаворскі выкладаў у Полацкай духоўнай семінарыі, на пачатку 50-х гадоў XIX стагоддзя займаўся археалагічнымі раскопкамі на Полаччыне. Полацкай гісторыі прысвечаны публікацыі К. А. Гаворскага «Гістарычныя звесткі пра полацкі Сафійскі сабор», «Наведванне Пятром Вялікім Сафійскага сабора», «Пра пачатак хрысціянства ў былым Полацкім княстве», «Пра ўводзіны, распаўсюджванне і лёс кальвінізму ў Беларусі». К. А. Гаворскім таксама была падрыхтавана праца «Гісторыя Полацкай епархіі». У 1857 – 1858 гг. К. А. Гаворскі рэдагаваў «Віцебскія губернскія ведамасці». З 1 ліпеня 1862 г. ён выдаваў часопіс «Веснік Паўднёва-Заходняй і Заходняй Расіі» (з 1864 па 1871 г. – «Веснік Заходняй Расіі»). У часопісе надавалася шмат увагі актуальным пытанням беларускай гісторыі. «Веснік Заходняй Расіі» – адзін з першых айчынных грамадска-палітычных і гісторыка-папулярных часопісаў, які адлюстроўваў ідэйныя пошукі беларускай праваслаўнай інтэлігенцыі.

*Павел Міхайлавіч Шпілеўскі*. Першыя буйныя публікацыі, прысвечаныя Беларусі, якія з'явіліся ў расійскім друку ў 50-х гг. XIX ст., належалі Паўлу Міхайлавічу Шпілеўскаму (1823 – 1861), журналісту, этнографу, папулярызатару народнай беларускай культуры, інтэлігенту праваслаўнай культурнай арыентацыі. П. М. Шпілеўскі лічыў Беларусь асобным этнаграфічным рэгіёнам усходняга славянства. Ён з вялікай прыязнасцю пісаў аб беларускім сялянстве, падкрэсліваў, што, жывучы сярод народа, які гаворыць на беларускай мове, адчуваў сваё падабенства, пародненасць з ім. У 1845 г. ён склаў «Слоўнік караняслоў беларускай гаворкі», а праз год падрыхтаваў да друку «Кароткую граматыку беларускай мовы». Яго аўтарству належыць таксама праца «Заўвагі беларусца аб беларускай мове». Найбольш адметным творам П. М. Шпілеўскага з'яўляецца кніга літаратурна-этнаграфічных нарысаў «*Падарожжа па Палессі і беларускім краі*» (1853). У кнізе аўтар апісвае побыт сялян, яўрэяў і дробнай шляхты, вопратку, звычаі, забабоны, заняткі, сферу адпачынку беларускага народа, характарызуе міжсаслоўныя адносіны. Пісьменніку належаць таксама работы «Мазыршчына» (1859), «Заходнерускія нататкі» (1858 – 1859), «Паездка ў заходнія губерні» (1860), якія друкаваліся ў перыядычных расійскіх выданнях. Падарожныя нататкі П. М. Шпілеўскага спрыялі пашырэнню геаграфічнага паняцця «Беларусь» на тэрыторыю Мінскай і Гарадзенскай губерняў. У «*Беларускіх народных паданнях*» (1846) П. М. Шпілеўскі (пад псеўданімам П. Драўлянскі) зрабіў амбітную спробу рэканструкцыі беларускай народнай міфалогіі на падставе як казачных тэкстаў, так і прымавак, прыказак, устойлівых выразаў, слоў незразумелай этымалогіі. Дадзеная рэканструкцыя насіла хутчэй мастацкі, аўтарскі характар і выклікала вострую крытыку навуковых колаў. Аднак гэтая праца мае культурную каштоўнасць. Спроба П. М. Шпілеўскага рэканструяваць беларускую народную міфалогію належыць да таго ж вектару высілкаў рамантычнай творчай інтэлігенцыі, які прывёў да стварэння «Паэм Асіяна», «Калевалы» і «Песні аб Гайаваце».

*Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі* (1845 – 1910) – выдатны беларускі этнограф, публіцыст. Апублікаваў каля 20 навуковых прац, найбольш значныя з якіх – «Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Беларуси и описание предметов обиходности» (1895), «Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах» (1897), «Странички из недавней старины города Витебска» (1899), «Нечистики: свод простонародных в Витебской Беларуси сказаний о нечистой силе» (1907).

*Еўдакім Раманавіч Раманаў* (1855 – 1922) – этнограф, фалькларыст і археолаг. Вывучаў беларускую традыцыйную культуру. Вынікам яго працы з'яўляюцца дзевяць выпускаў «Белорусского сборника» (1886 – 1912) – своеасаблівая энцыклапедыя беларускай традыцыйнай духоўнай культуры. Гісторыі і этнаграфіі Магілёўшчыны прысвечаны зборнік «Могилевская старина» (Магілёў, 1900 – 1903, вып. 1 – 3). Е. Р. Раманаў выдаў таксама два выпускі «Матэрыялаў па этнаграфіі Гродзенскай губерні» (1911, 1912), адзін выпуск «Крыніц для гісторыі Магілёўскага краю» (1916).

*Аляксей Парфёнавіч Сапуноў* (1851 – 1924) – грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, археограф, краязнавец. З'яўляўся сакратаром Віцебскага губернскага статыстычнага камітэту. У 1893 г. удзельнічаў у стварэнні Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея, у 1909 г. – Віцебскай навуковай архіўнай камісіі. Адзін з ініцыятараў адкрыцця Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута. Дэпутат III Дзяржаўнай Думы ад Віцебскай губерні, уваходзіў у фракцыю «Саюз 17 кастрычніка». Асноўныя працы А. П. Сапунова – «Витебская старина» (т. I, 1883; т. IV, 1885; т. V, 1888), «Река Западная Двина» (1893).

*Яўхім Фёдаравіч Карскі* (1861 – 1931) – філолаг-славіст, заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, фалькларыст, палеограф. Акадэмік Пецярбургскай Акадэміі навук (1916). Галоўнай працай Я. Ф. Карскага з'яўляецца шматтомнае даследаванне «Беларусы» (т. 1 – 3, 1903 – 1922, у 7 выпусках), якое часам называюць «энцыклапедыяй беларусазнаўства».

*Лук'ян Міхайлавіч Саланевіч* (1866 – 1938) – грамадскі дзеяч, журналіст, выдавец, краязнавец. У 1905 – 1908 гг. – рэдактар газеты «Гродненские губернские ведомости». Пісаў на тэмы краязнаўства, адукацыі, культуры. Член Гродзенскага праваслаўнага Сафійскага брацтва, Гродзенскага царкоўна-археалагічнага камітэта. У 1908 г. – сузаснавальнік «Беларускага таварыства». Прыхільнік гістарычных поглядаў М. Каяловіча і палітыкі П. Сталыпіна. У 1909 г. пачаў выдаваць газету «Белорусская жизнь» (з 1911 г. – «Северо-Западная жизнь»).

## 21.2. Грамадска-палітычная дзейнасць І. Сямашкі

*Іосіф Іосіфавіч Сямашка* (1798 – 1868) – грамадска-палітычны і рэлігійны дзеяч, мемуарыст, мітрапаліт праваслаўнай расійскай царквы. Адыграў выдатную ролю ў падрыхтоўцы Полацкага царкоўнага сабора 1839 г., на якім уніяцкімі іерархамі быў прыняты акт аб далучэнні грэка-каталіцкіх епархій да праваслаўнай расійскай царквы. Уніяцкая царква арганізацыйна

з'яўлялася часткай каталіцкага касцёла, але знаходзілася ў матэрыяльна нездавальняючым становішчы. Уніяцкае духавенства адчувала дыскрымінацыю з боку католікаў; на яе аказваўся ціск з мэтай больш шырокага ўвядзення каталіцкіх элементаў у богаслужэнне. Гэта выклікала незадаволенасць шырокіх колаў уніяцкага духавенства, што і выкарыстаў І. Сямашка. У 1827 г. І. Сямашка падаў запіску Мікалаю І з прапановай аб далучэнні ўніяцкай царквы да праваслаўя. Запіска была ўхвалена імператарам. З 1829 г. І. Сямашка – старшыня кансісторыі Полацкай грэка-каталіцкай архіепархіі, з 1833 г. – кіруючы епіскап Літоўскай грэка-каталіцкай епархіі. На гэтай пасадзе вёў падрыхтоўчую работу па скасаванні уніі. У адпаведнасці з праваслаўнымі канонамі былі зменены іканастасы, з уніяцкіх цэркваў прыбіралі арганы, уводзіліся служэбнікі маскоўскага друку. Сямашка шмат зрабіў для развіцця прыхадскіх школ для сялянства. Ён быў ініцыятарам і актыўным удзельнікам Полацкага царкоўнага сабора 12 лютага 1839 г., на якім быў прыняты гістарычны акт аб уз'яднанні «заходнерускай грэка-каталіцкай царквы» з праваслаўнай расійскай царквой. 30 сакавіка 1839 г. Святы Сінод Расійскай праваслаўнай царквы прыняў пастанову аб далучэнні грэка-католікаў да праваслаўя.

## 21.3. Навуковая і грамадска-палітычная дзейнасць М. В. Каяловіча

*Міхаіл Восіпавіч Каяловіч* (1828 – 1891) – грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, публіцыст. Адным з першых у рускай гістарыяграфіі М. Каяловіч вылучыў як асобны прадмет даследавання гісторыю Беларусі і Украіны – «Заходняй Расіі». Ён быў аўтарам першай у рускай гістарыяграфіі працы, прысвечанай Люблінскай уніі. Навуковыя даследаванні М. В. Каяловіча былі прысвечаны гісторыі грэка-каталіцкай уніі, царкоўнай і агульнай гісторыі Беларусі, гісторыі рускай самасвядомасці, гістарыяграфіі. М. В. Каяловіч абгрунтоўваў пункт гледжання, паводле якога беларусы з'яўляюцца самабытнай часткай трыадзінага рускага народа разам з велікарусамі і маларусамі.

М. В. Каяловіч паходзіў з сям'і грэка-каталіцкага святара, добра ведаў праблемы і настроі ўніяцкай інтэлігенцыі Беларусі і з'яўляўся выразнікам яе духоўных пошукаў. Адным з першых у гістарычнай навуцы звярнуў увагу на эвалюцыю уніі ў бок паступовай лацінізацыі. Ён паказаў кіруючую ролю базыльянскага ордэна ў гэтым працэсе, падкрэсліў незваротнасць выцяснення ва ўніяцкай царкве праваслаўных абрадаў каталіцкімі. М. В. Каяловіч выявіў ва ўніяцкай царкве ўнутраны рух да «вяртання чыстаты», які падрыхтаваў з'яўленне дзеячаў кола І. Сямашкі. Для М. В. Кая-

ловіча царкоўная унія азначала пачатак дзяржаўнага і культурнага заняпаду Беларусі, разрыў гістарычных сувязяў паміж усходнеславянскімі землямі, страту самабытнасці беларускай культуры, узмацненне культурнай і палітычнай гегемоніі каталіцкай Польшчы. Пытанню царкоўнай уніі прысвечаны манаграфіі М. В. Каяловіча: «Літоўская царкоўная унія» (у 2 т., 1859 – 1862) і «Гісторыя ўз’яднання заходнерускіх уніятаў старых часоў (да 1800 года)» (1873).

Падчас паўстання 1863 – 1864 гг. гісторык актыўна выступаў на старонках агульнарасійскай прэсы з асветніцкімі па сваёй сутнасці артыкуламі па гісторыі Беларусі. М. В. Каяловіч заклікаў расійскую інтэлігенцыю звярнуць увагу на становішча беларускага сялянства, указваў на маральны заняпад сярод мясцовага праваслаўнага духавенства, крытыкаваў расійскіх чыноўнікаў у Беларусі. М. В. Каяловіч падрыхтаваў серыю публікацый дакументальных матэрыялаў па гісторыі Беларусі: «Дакументы, якія тлумачаць гісторыю Заходняй Расіі і яе адносіны да Польшчы» (1865), «Летапіс аблогі Пскова Стэфанам Баторыем» (1867), «Дзённік Люблінскага сейма 1569 г.» з перакладам на рускую мову (1869). У «Лекцыях па гісторыі Заходняй Расіі» (1864) М. В. Каяловіч разглядзеў гістарычны шлях беларусаў і ўкраінцаў. Гісторык лічыў, што беларуская народнасць склалася ў Х – ХІ стст. на аснове плямён крывічоў і дрыгавічоў. Беларусы, на думку Каяловіча, пазбаўлены належнай упэўненасці і энергіі. Прычыну гэтага аўтар бачыў у прыродна-кліматычных асаблівасцях краіны. Зыходзячы з гэтага, М. В. Каяловіч лічыў, што шлях Беларусі – адзіны з Расіяй, бо тут «никакой сепаратизм не может иметь силы»[96]. М. В. Каяловіч прапаноўваў увесці беларускую мову ў дзяржаўныя школы і ўрадавыя ўстановы Беларусі, каб выціснуць з ужытку польскую мову. Ён выступаў таксама за правядзенне радыкальнай аграрнай рэформы і перадачу зямлі на льготных умовах беларускім сялянам, каб пазбавіць польскі шляхецкі элемент палітычнага і эканамічнага ўплыву. Палякамі М. В. Каяловіч лічыў каталіцкую шляхту. На яго думку, этнічныя беларусы, якія перайшлі ў каталіцызм, здрадзілі сваёй нацыянальнасці і сталі палякамі[97].

Дзейнасць М. В. Каяловіча аказала ўплыў на станаўленне шэрагу гісторыкаў: Е. Ф. Арлоўскага, А. С. Будзіловіча, А. Б. Бялецкага, П. М. Жуковіча, І. А. Катовіча, Г. Я. Кіпрыяновіча, Л. С. Паеўскага, Л. М. Саланевіча, М. І. Тэадаровіча, К. В. Харламповіча, Г. І. Шавельскага, А. В. Ярушэвіча.

[96] Коялович, М. О. Лекции по истории Западной России / М. О. Коялович. – СПб., 1864. – С. 27.
[97] Теплова, В. А. М. О. Коялович и православная историческая школа Белоруссии / В. А. Теплова // Sobor.by [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: sobor.by/kojal.htm. – Дата доступа: 24.12.2011.

Публічныя выступы М. В. Каяловіча прыцягнулі да Беларусі ўвагу расійскай інтэлігенцыі славянафільскага кола. Асветніцкую ролю публікацый М. В. Каяловіча адзначаў, у прыватнасці, вядомы расійскі публіцыст І. С. Аксакаў.

Такім чынам, заходнерускі накірунак айчыннай грамадска-палітычнай думкі з'яўляўся вынікам арганічнага развіцця візантыйска-праваслаўнай спадчыны, якая ляжыць у аснове культурнай традыцыі Полацкага і Турава-Пінскага княстваў. Заходнеруская інтэлігенцыя не канфліктавала з расійскай афіцыйнай ідэалогіяй. На пачатку 60-х гг. XIX ст. афіцыйныя колы Расіі пачалі схіляцца да думкі аб мэтазгоднасці выдання беларускамоўнай урадавай газеты, каб вывесці беларускі народ з-пад уплыву польскага нацыяналізму. Папячыцель Віленскай навучальнай акругі П. Шырынскі-Шахматаў прапаноўваў план выкладання Закона Божага ў беларускіх губернях па-беларуску. Аднак гэтыя планы не рэалізаваліся.

Пасля падаўлення шляхецкага паўстання 1863 г. «заходнерускі» рух па прычыне сваёй радыкальнай антышляхецкай арыентацыі выглядаў для расійскай арыстакратыі ледзь не сацыялістычным і быў адхілены ад магчымасці ўплываць на грамадска-палітычную думку краю. Аднак «заходнерусізм» выяўляў інтарэсы праваслаўнага сялянска-разначыннага насельніцтва Беларусі і таму здолеў захавацца і развівацца далей, аказаўшы значны ўплыў на фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэалогіі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя.

**Крыніцы**

1. Антоний (Зубко), архиеп. О Греко-Униатской Церкви в Западном крае России // Сборник статей, изданных Св. Синодом по поводу 50-летия воссоединения с Православной Церковью западно-русских униатов. – СПб., 1889. – С. 38 – 76.

2. Записки Василия Лужинского, архиепископа Полоцкого. – Казань : Духов. Акад. – 1885. – 312 с.

3. Записки Иосифа митрополита Литовского, изданные Императорскою Академиею Наук по завещанию автора. В 3 частях / Митрополит Иосиф (Семашко). – Санкт-Петербург : Типография Императорской Академии наук, 1883. – Т. 1. – 745 с.; Т. 2. – 786 с.; Т. 3. – 1042 с.

4. Коялович, М. О. История воссоединения западнорусских униатов / М. О. Коялович. – Минск : Лучи Софии, 1998. – 400 с.

5. Коялович, М. И. Чтения по истории западной России / М. И. Коялович. – Минск : БелЭн, 2006. – 480 с.

6. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский; предисл., состав. С. А. Кузняева. – 2-е изд. – Минск : Полымя, 2004. – 251 с.

7. Шпілеўскі, П. М. Беларусь у абрадах і казках / П. М. Шпілеўскі; пер. на бел. мову А. Вашчанкі. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 304 с.

**Літаратура**


1. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Мінск : Беларуская навука, 1996. – 206 с.

2. Асветнікі зямлі Беларускай X – пач. XX ст.: энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – 490 с.

3. Бандарчык, В. К. Беларусы: Гісторыя этналагічнага вывучэння / В. К. Бандарчык // Беларусы / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Т. 3. – Мінск : Бел. навука, 1999. – 365 с.

4. Беларуская фальклярыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. / Г. А. Пятроўская [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 333 с.

5. Васілевіч, У. А. Збіральнікі / У. А. Васілевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 187 с.

6. Каханоўскі, Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 118 с.

7. Латышонак, А. Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі / А. Латышонак // Спадчына. – 1992. – № 1. – С. 9 – 14.


# ТЭМА 22. ІДЭЙНА-ЭСТЭТЫЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ПРАДСТАЎНІКОЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.

1. Сялянскі дэмакратызм, рэалізм і народнасць творчасці Ф. Багушэвіча.
2. Сацыяльныя ідэі ў творчасці А. Гурыновіча.
3. Ідэйна-эстэтычная пазіцыя Я. Лучыны.

## 22.1. Сялянскі дэмакратызм, рэалізм і народнасць творчасці Ф. Багушэвіча

*Францішак Багушэвіч* (1840 – 1900) – выдатны беларускі паэт, празаік, публіцыст, перакладчык, пачынальнік новай беларускай літаратурнай традыцыі. Пры жыцці паэта былі надрукаваны кнігі вершаў «Дудка беларуская» (Кракаў, 1891) і «Смык беларускі» (Познань, 1894), а таксама апавяданне «Тралялёначка» (Кракаў, 1892).

Творчасць Ф. Багушэвіча была адрасавана беларускаму сялянству; паэт намагаўся адлюстроўваць сацыяльныя патрэбы гэтай групы насельніцтва. Сялянства ўяўляецца Ф. Багушэвічу сапраўдным беларускім народам. Паэт ведаў і выкарыстоўваў прыёмы беларускай народнай песні, насычаў яе сацыяльна-філасофскім зместам. Грамадска-палітычная ідэя паэта выказана ў прадмове да зборніка «Дудка беларуская». Багушэвіч вылучыў пытанне мовы як асноўнага элементу нацыянальнага жыцця і фундаментальнай формы выяўлення духоўнасці, найбольш устойлівай прыкметы на-

цыі. Па ўяўленні Ф. Багушэвіча, мова дадзена ад Бога і з'яўляецца святыняй. Паэт заклікаў берагчы родную мову, «каб не ўмерлі». У прадмове да зборніка «Дудка беларуская» дадзены кароткі змест гісторыі Беларусі з часоў ВКЛ, пададзены звесткі аб тэрыторыі рассялення беларусаў: «ад Вільні да Мазыра, ад Віцебска за малым не да Чарнігава, дзе Гродна, Мінск, Магілёў, Вільня і шмат іншых мястэчак і вёсак…»). Ідэі, выказаныя ў нешматлікіх прыжыццёвых выданнях паэта, дазваляюць лічыць яго адным з першых ідэолагаў беларускага нацыянальнага абуджэння[98].

## 22.2. Сацыяльныя ідэі ў творчасці А. Гурыновіча

*Адам Гурыновіч* (1869 – 1894) – паэт, фалькларыст, рэвалюцыянер. Займаўся збіраннем фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў. У 1893 г. у Кракаве былі выдадзены фальклорныя зборы А. Гурыновіча. У 1889 г. ён стварыў нелегальны «Гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларасійскай». На фарміраванне светапогляду Гурыновіча зрабіў уплыў марксізм, а таксама ідэі шляхецкіх рэвалюцыянераў і народнікаў. Гурыновіч пісаў вершы сацыяльнага зместу на беларускай, польскай і рускай мовах, перакладаў творы польскай, рускай і ўкраінскай літаратуры. А. Гурыновіч адным з першых у беларускай літаратуры выказаў тэзіс пра агульнасць інтарэсаў рабочых і сялян. Паэт лічыў, што літаратура павінна «будзіць у сэрцы думку аб лепшай долі, якой мы не знalі дагэтуль ніколі». У паэзіі з'яўляўся паслядоўнікам Ф. Багушэвіча і выступаў з пазіцый рэалізму. На творчасць А. Гурыновіча паўплывала таксама руская паэзія (М. А. Някрасаў, А. В. Кальцоў). Паэт намагаўся пашырыць сацыяльна-палітычны кругагляд беларускага селяніна, абудзіць класавую і нацыянальную свядомасць. Беларускамоўная паэзія для А. Гурыновіча – сродак палітычнай прапаганды, яна мае пераважна дыдактычны характар[99].

## 22.3. Ідэйна-эстэтычная пазіцыя Я. Лучыны

*Янка Лучына* (Іван Неслухоўскі, 1851 – 1897) – паэт, аўтар кнігі вершаў «Вязынка» (1903), паэм «Паляўнічыя акварэлі з Палесся», «Віялета», «Ганупя», «Андрэй», заснавальнік філасофскай плыні ў беларускай лірыцы. Пісаў на польскай, беларускай і рускай мовах.

---

[98] Конан, У. Беларуская ідэя і місія Беларусі / У. Конан // Беларуская думка. – 1992. – № 11 – 12.

[99] Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст. У 2 т. Т. 2: Новая літаратура: другая палова XVIII – XIX ст. / рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – С. 432 – 440.

У яго творах адлюстравана вясковае жыццё, раскрываецца вобраз беларускага селяніна. У творчасці Я. Лучыны прасочваецца спалучэнне рэалістычнага і рамантычнага бачання рэчаіснасці, дэмакратызм. Беларускамоўная паэзія Я. Лучыны звернута да чытача з народа. Інтэлігент-гараджанін, якім з'яўляўся паэт, здолеў знайсці шчырыя і адэкватныя інтанацыі для падобнага дыялогу. Адметнай рысай твораў Я. Лучыны з'яўляюцца беларускія фальклорныя матывы. У вершах Я. Лучыны гучыць непакой з прычыны бурнага развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, у прыватнасці, прыходу ў беларускую глыбінку чыгуначнага транспарту. Сацыяльнае пытанне прысутнічае ў паэзіі Я. Лучыны, аднак яно закранута ўскосна, пададзена праз унутраныя перажыванні лірычных герояў. Амаль не знойдзеш у творах Я. Лучыны побытавых дэталяў, герой існуе ў пэўным рамантызаваным асяроддзі. У гэтым заключаецца непадабенства дэмакратызму Я. Лучыны з народніцтвам Ф. Багушэвіча. На творчасць Я. Лучыны і яго грамадзянскую пазіцыю ў значнай ступені паўплываў польскі паэт У. Сыракомля. У нарысе «З крывавых дзён» (1889) Я. Лучына на аснове згадак відавочцаў узнаўляе эпізоды шляхецкага паўстання 1863 – 1864 гг. на Міншчыне і ў Ігуменскім павеце. Я. Лучына таксама перакладаў з польскай і рускай мовы[100].

**Крыніцы**

1. Багушэвіч, Ф. Прадмова да «Дудкі беларускай» / Ф. Багушэвіч // Творы. – 2-е выд. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. – С. 21 – 22.

2. Пачынальнікі: З гісторыка-літарараатурных матэрыялаў XIX ст. / уклад. Г. В. Кісялёў. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 549 с.

**Літаратура**

1. Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў. У 2 т. Т. 2: Новая літаратура: другая палова XVIII – XIX стагоддзе / рэд. У. І. Мархель, В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – 582 с.

[100] Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст. У 2 т. Т. 2: Новая літаратура: другая палова XVIII – XIX ст. / рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – С. 416 – 430.

# ТЭМА 23. СТАНАЎЛЕННЕ РЭВАЛЮЦЫЙНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ПЛЫНІ Ў ГРАМАДСКАЙ ДУМЦЫ ПАЧАТКУ XX СТ.

1. Часопіс «Гоман» і праграма федэратыўнай аўтаноміі Беларусі.
2. Спалучэнне ідэі народніцкага сацыялізму з патрабаваннем нацыянальнага адраджэння ў праграме БСГ.
3. Уздым нацыянальнага беларускага руху ў час першай рускай рэвалюцыі (1905 – 1907).

## 23.1. Часопіс «Гоман» і праграма федэратыўнай аўтаноміі Беларусі

На пачатку 80-х гг. XIX ст. беларускія студэнты, якія вучыліся ў Пецярбургу, заснавалі некалькі народніцкіх гурткоў. У 1883 – 1884 гг. пецярбургскія студэнты выпусцілі некалькі адозваў на рускай мове, адрасаваных жыхарам Беларусі («Да беларускай моладзі», «Да беларускай інтэлігенцыі», «Пасланне да землякоў-беларусаў»). Аўтары гэтых публікацый сцвярджалі, што Беларусь мае этнічныя асаблівасці. У адозве «Да беларускай інтэлігенцыі» (1883) адзначалася, што народ, які страціў сваю эліту, але здолеў вытрымаць паланізацыю і русіфікацыю, заслугоўвае таго, каб стаць свабодным ад чужых паноў. У народніцкіх выданнях («Пісьмы пра Беларусь. Пісьмо першае» Данілы Баравіка, «Пасланне да землякоў-беларусаў» Шчырага беларуса, два нумары гектаграфічнага часопіса «Гоман») адзначаліся спецыфічныя кліматычныя, прыродна-геаграфічныя, гістарычныя і этнаграфічныя ўмовы, якія адрознівалі Беларусь ад Расіі і Польшчы. Падкрэслівалася адметнасць беларускай мовы. Народнікі сцвярджалі, што беларускі народ адчувае сваё арганічнае адзінства і адрознівае свае інтарэсы ад польскіх і велікарускіх. Беларускі этнас успрымаўся гоманаўцамі як выключна сялянскі. У выдадзеных у 1884 г. двух нумарах часопіса «Гоман» беларускімі народнікамі была сфармулявана іх палітычная платформа. Будучыню Беларусі яны бачылі ў федэратыўных адносінах з дэмакратычнай Расіяй. Тэзіс аб аўтаноміі для Беларусі ў складзе расійскай дзяржаўнасці быў агучаны ўпершыню за ўсю гісторыю развіцця беларускага нацыянальнага руху[101].

## 23.2. Спалучэнне ідэі народніцкага сацыялізму з патрабаваннем нацыянальнага адраджэння ў праграме БСГ

Згодна з рашэннямі III з'езда Польскай сацыялістычнай партыі (ПСП) ад чэрвеня 1895 г., гэтая партыя збіралася падтрымліваць сепаратысцкія

[101] Мірановіч, Я. Навейшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч. – Беласток : Праграмная Рада Тыднёвіка Беларусаў у Польшчы Ніва, 1999. – С. 29 – 30.

рухі народаў, якія насялялі Расійскую імперыю. Менавіта пры дапамозе ПСП у Кракаве ў 1896 г. было выдадзена і перапраўлена кантрабандай у Беларусь другое выданне «Дудкі беларускай» Ф. Багушэвіча. На пачатку ХХ стагоддзя ў Пецярбургу з'явіліся групоўкі студэнтаў-каталікаў, якія арыентаваліся на ПСП. У 1902 г. па ініцыятыве *Вацлава Іваноўскага* была створана *Беларуская рэвалюцыйная партыя* (БРП). У адозве БРП «Да інтэлігенцыі» (восень 1902), выдадзенай на польскай мове, адной з галоўных задач партыі называецца прапаганда ідэй польскіх рэвалюцыянераў сярод беларускага сялянства. У 1903 г. сузаснавальнікі БРП, браты *Іван і Антон Луцкевічы*, стварылі новую арганізацыю – *Беларускую рэвалюцыйную грамаду* (БРГ)[102].

На І з'ездзе БРГ (снежань 1903 г., Вільня) была прынята праграма, у якой неакрэслена гаварылася аб неабходнасці свабоды для ўсіх народаў Расіі. Пытанне аб аўтаноміі для Беларусі да 1905 г. БРГ нават не разглядала. Арганізацыя залежала ў дадзеным пункце ад пазіцыі польскіх сацыялістаў, якія бачылі Беларусь рэгіёнам Польшчы і не ўзнімалі пытання аб зямельнай уласнасці ў Беларусі, каб не пашкодзіць інтарэсам польскіх памешчыкаў. Праграма Беларускай рэвалюцыйнай партыі па гэтым пытанні неакрэслена сцвярджала неабходнасць перадачы зямлі ў карыстанне асобным земляробам. Дакладны час перайменавання БРГ у Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ) не высветлены (па розных звестках, 1903 або 1906 г.). Падчас рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. грамадоўцы спрабавалі весці партыйную прапаганду сярод сялян і рабочых у Мінскай, Віленскай і Гродзенскай губернях. У 1905 г. БСГ ініцыявала стварэнне «Беларускага сялянскага саюза» і баявых дружын, выдаваліся адозвы на беларускай мове. На ІІ з'ездзе (студзень 1906 г., Мінск) была прынята новая праграма партыі. Канчатковай мэтай партыі была абвешчана змена капіталістычнага ладу сацыялістычным, бліжэйшай задачай – звяржэнне самадзяржаўя і ўтварэнне Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі. БРГ выказвалася за тэрытарыяльную аўтаномію для Беларусі з сеймам у Вільні, у аграрным пытанні патрабавала адчужэння памешчыцкай зямлі і надзялення сялян зямлёй на правах пажыццёвай арэнды. Ажыццяўленне ўсіх пераўтварэнняў з'езд звязваў са скліканнем Устаноўчага сейма Беларусі. Першым друкаваным органам БСГ і першым легальным перыядычным выданнем на беларускай мове стала газета «Наша доля» (было падрыхтавана шэсць нумароў). У лістападзе 1906 г. БСГ пачала выдаваць легальную газету на беларускай мове «Наша ніва»[103].

---

[102] Міраловіч, Я. Навейшая гісторыя Беларусі / Я. Міраловіч. – Беласток : Праграмная Рада Тыднёвіка Беларусаў у Польшчы Ніва, 1999. – С. 31 – 34.
[103] Тамсама. – С. 36 – 38.

## 23.3. Уздым нацыянальнага беларускага руху ў час першай рускай рэвалюцыі (1905 – 1907)

1 верасня 1906 г. з'явілася першая легальная беларуская газета «Наша доля». Яе рэдагавалі Іван і Антон Луцкевічы, Казімір Кастравіцкі (Карусь Каганец), Алаіза Пашкевіч (Цётка), Францішак Умястоўскі. Пасля закрыцця «Нашай долі» быў заснаваны новы легальны беларускі штотыднёвік «Наша ніва», накіраваны пераважна на асветніцкую працу з сялянствам. «Наша ніва» спрыяла станаўленню беларускамоўнай літаратуры. Да 1912 г. выданне друкавалася кірыліцай і лацініцай, пазней – кірыліцай. Пасля 1910 г. пачалі ўзнікаць іншыя беларускія перыядычныя выданні: «Пялун», «Крапіва», «Хатка». У 1913 г. быў заснаваны клерыкальны каталіцкі штотыднёвік «Беларус», які фінансава падтрымлівала княгіня Магдалена Радзівіл. У Пецярбургу, Вільні, Мінску ўзнікалі многія новыя беларускія культурна-асветніцкія арганізацыі. У 1907 г. былі створаны першыя прыватныя школкі, у якіх навучанне вялося на беларускай мове. Восенню 1907 г. адбыўся з'езд настаўнікаў гэтых школ, на якім быў заснаваны нелегальны *Беларускі настаўніцкі саюз*. Пачала дзейнічаць пецярбургская выдавецкая суполка *«Загляне сонца і ў нашаваконца»* (1906 – 1914). У Вільні ўзніклі новыя выдавецтвы – «Наша хатка», «Палачанін» і Беларускае выдавецкае таварыства (БВТ). БВТ, якое ўзначаліў Вацлаў Іваноўскі, мела ўласную кнігарню. У Мінску і Вільні выдаваліся рускамоўныя газеты «Белорусский вестник», «Минское слово», «Белорусская жизнь» (з 1911 г. «Северо-Западная жизнь»).

Падчас выбараў у расійскую Думу ў 1907 г. у Беларусі былі абраны прадстаўнікі «Саюза 17 кастрычніка» і «Рускага ўскраіннага таварыства» (партыя спавядала ў пэўнай форме ідэі заходнерусізму). Гэтыя партыі атрымалі ў Беларусі 36 дэпутацкіх мандатаў (80,5 %). Паражэнне пацярпеў блок сацыялістычных партый (БСГ, ПСП, Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз (Бунд) і Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя). Паражэнне на выбарах стала прычынай спынення дзейнасці Беларускай сацыялістычнай грамады. БСГ мела нязначную колькасць прыхільнікаў толькі сярод дробнашляхецкай каталіцкай інтэлігенцыі і чыноўніцкіх колаў. Большасць лідараў БСГ урэшце абмежавалі сферу сваёй дзейнасці культурна-асветніцкімі праектамі.

Беларускія нацыянальныя імкненні з варожасцю ўспрымаліся мясцовым польскім асяроддзем. «Кур'ер літэўскі» («Kurier Litewski»), «Пшэглёнд віленьскі» («Przegląd Wileński») і іншыя польскія перыядычныя

выданні пераконвалі сваіх чытачоў, што «Наша ніва» і кнігі на беларускай мове выдаюцца за дзяржаўныя грошы, а канчатковай мэтай гэтых намаганняў з'яўляецца русіфікацыя. Беларускую мову ў польскім віленскім друку называлі «грубай мовай», а яе распаўсюджванне – «адцягваннем простанароддзя ад польскасці». Польскія публіцысты лічылі беларусаў-католікаў палякамі. Сярод польскамоўнай шляхты было распаўсюджана меркаванне, што развіццё беларускага руху можа пагражаць польскай зямельнай уласнасці ў Беларусі[104].

**Крыніцы**

1. Беларуская думка ХХ стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура: Анталогія / уклад. Ю. Гарбінскі. – Варшава: ІС ПАН, 1998. – 741 с.

2. Луцкевіч, А. Дваццаць пяць гадоў (1903 – 1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада / А. Луцкевіч. – Мінск : БелСЭ, 1991. – С. 3 – 40.

3. Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы / А. Луцкевіч. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. – С. 5 – 177.

4. Наша доля: Першая беларуская газета для вясковага і местачковага рабочага люду. – №№ 1 – 6 (1 верасня 1906 г. – 1 снежня 1906 г.) // Факсімільнае выданне. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 48 с.

5. Наша Ніва: першая беларуская газета з рысункамі // Факсімільнае выданне. – Вып. 1 – 5. – Мінск, 1992 – 2009.

**Літаратура**

1. Сташкевіч, М. Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец ХІХ ст. – люты 1917 г.) / М. Сташкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 3. – С. 18 – 23; № 4. – С. 13 – 19.

2. Турук, Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. – М. : Государственное издательство, 1921.

3. Яцкевіч, І. ППС на Беларусі / І. Яцкевіч // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 4. – С. 18 – 22.

[104] Міранові́ч, Я. Навейшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч. – Беласток : Праграмная Рада Тыднёвіка Беларусаў у Польшчы Ніва, 1999. – С. 42 – 46.

# ТЭМА 24. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ РУХ «КРАЁЎЦАЎ»

Тэрміны: *краёўцы.*

1. «Краёвая плынь» як галіна польскага нацыянальнага руху.
2. Дзейнасць Р. Скірмунта, Э. Вайніловіча, М. Ромера.

## 24.1. «Краёвая плынь» як галіна польскага нацыянальнага руху

Краёўцы – накірунак польскага нацыянальнага руху пачатку XX стагоддзя ў Беларусі. Нацыянальную свядомасць краёўцаў можна акрэсліць формулай «літвін па паходжанні, паляк па нацыянальнасці». Падчас уздыму беларускага нацыянальнага руху яны выступалі за агульную аўтаномію Літвы і Беларусі ў складзе Расійскай імперыі, пры гэтым імкнучыся захаваць пазіцыі палякаў у краі. Сярод краёўцаў пераважалі прадстаўнікі кансерватыўнага кірунку: Э. Вайніловіч, Т. Дамбоўскі, І. Корвін-Мілеўскі, Э. Роп, Р. Скірмунт, якія выступалі за захаванне польскага памешчыцкага землеўладання. Краёўцы-лібералы (Л. Абрамовіч, Б. Крыжаноўскі, М. Ромер, Т. Урублеўскі) выступалі за адчужэнне памешчыцкай зямлі на карысць сялян. З краёўцаў-кансерватараў складаліся аб'яднанні дэпутатаў ад Беларусі і Літвы ў I – IV Дзяржаўных думах Расіі і ў Дзяржаўным савеце[105].

У 1907 г. палякі-памешчыкі стварылі «Краёвую партыю Літвы і Беларусі». 17 чэрвеня 1907 г. у Вільні адбыўся з'езд землеўладальнікаў шасці беларускіх губерняў, які прыняў рашэнне пра стварэнне *«Краёвай партыі Літвы і Беларусі»*. У сваёй праграме партыя выказвалася за аўтаномію краю, роўнасць усіх нацый, увядзенне адукацыі на роднай мове, за захаванне памешчыцкага землеўладання. Старшынёй рады партыі быў абраны Э. Вайніловіч, намеснікам – Я. Талочка. Друкаваны орган партыі – газета «Głos Polski» (1907). Прадстаўнікі Ковенскай губерні і Р. Скірмунт не ўвайшлі ў КПЛіБ, іх не задавальняла тое, што партыя ўзнікала як выключна польская. Р. Скірмунт імкнуўся стварыць партыю, якая мела б тры фракцыі – польскую, літоўскую і беларускую. У 1908 годзе партыя знікла з палітычнай арэны і зноў актывізавалася падчас Першай сусветнай вайны[106].

---

[105] Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. – С. 125 – 143.
[106] Смалянчук, А. Ф. «Краёвасць» у беларускай і літоўскай гісторыі. 1905 – 1940 г. / А. Ф. Смалянчук // Беларускі гістарычны архіў. – 1997. – Т. 4. – Сш. 1 – 2 [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://www.belhistory.eu/ales-smalyanchuk-krayovasc-u-belaruskaj-i-litoўskaj-gistoryi/. – Дата доступа: 24.12.2011.

## 24.2. Дзейнасць Р. Скірмунта, Э. Вайніловіча, М. Ромера

*Раман Аляксандравіч Скірмунт* (1868 – 1939) – грамадска-палітычны дзеяч, буйны землеўладальнік, ідэолаг краёўцаў. У лістападзе 1905 г. надрукаваў у газеце «Kurier Litewski» зварот «Краёвай партыі Літвы і Русі» (пазней «Краёвая партыя Белай Русі і Літвы»), дзе патрабаваў увядзення дэмакратычных свабод, роўнасці нацыянальнасцей, краёвага самакіравання, падкрэсліваў прынцып недатыкальнасці прыватнай уласнасці. З 1906 г. – дэпутат першай Дзяржаўнай думы Расіі, ініцыятар аб'яднання дэпутатаў-краёўцаў у «Групу заходніх ускраін». З кастрычніка 1910 г. да студзеня 1911 г. – член Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі. Уваходзіў ва ўправу Віленскага зямельнага банка. З 1911 г. – гласны Мінскага губернскага земства, з 1914 г. – член Мінскага губернскага камітэта Усерасійскага земскага саюза, у 1917 г. – загадчык Мінскага губернскага харчовага камітэта. У студзені 1917 г. узначаліў Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. З сакавіка 1917 г. – старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта ў Мінску. У красавіку 1917 г. узначаліў беларускую дэлегацыю да расійскага Часовага ўрада. Падчас германскай акупацыі Беларусі ўзначальваў «Мінскае беларускае прадстаўніцтва», ад якога ў красавіку 1918 г. увайшоў у Раду БНР, у маі 1918 г. яму даручана фарміраванне новага складу Народнага сакратарыяту Беларусі, з 9 ліпеня 1918 г. – прэм'ер урада БНР і сакратар міжнародных спраў. Выказваўся за памяркоўную аграрную рэформу. 20 ліпеня 1918 г. сышоў у адстаўку з пасады старшыні ўрада. Працаваў у міжнароднай камісіі Рады БНР, у лістападзе 1918 г. – у складзе надзвычайнай беларускай дэлегацыі быў у Германіі і Швейцарыі. У польска-савецкую вайну 1920 г. выказваўся за ўваходжанне Беларусі ў склад Другой Рэчы Паспалітай на ўмовах аўтаноміі. У 1930 г. абраны сенатарам Рэчы Паспалітай[107].

*Эдвард Антоні Вайніловіч* (1847 – 1928) – грамадска-палітычны дзеяч, прадпрымальнік, старшыня Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, старшыня Таварыства дабрачыннасці Слуцкага павета. Старшыня «Кола Польскага Каралеўства, Літвы і Русі» ў Дзяржаўным савеце Расійскай імперыі (1906). Пасля ўвядзення самакіравання ў Мінскай губерні (1911) дэпутат губернскай земскай управы ад «польскай» (каталіцкай) курыі Слуцкага павета. На працягу 35 гадоў ганаровы суддзя Слуцкага павета. У

---

[107] Скірмунт Раман // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. Кн. 1: Пузыны – Усая / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. – С. 321.

1917 г. працаваў у земскіх арганізацыях разам з А. Смолічам і Р. Скірмунтам, падтрымаў утварэнне БНР, але з асцярогай паставіўся да поўнай незалежнасці. У 1918 г., у час нямецкай акупацыі, ад імя мясцовых памешчыкаў выступіў з планам аднаўлення ВКЛ. Стварыў «Саюз памешчыкаў Мінскай губерні». У снежні 1918 г. выехаў у Варшаву, быў адным з арганізатараў «Саюза палякаў з беларускіх ускраін», які ў студзені 1919 г. прапаноўваў усталяваць мяжу Польшчы па Дняпры і Заходняй Дзвіне. У красавіку 1919 г. удзельнічаў у арганізацыі «Саюза памешчыкаў у Літве і Беларусі» ў Варшаве. У маі 1919 г. разам з В. і Л. Дубейкаўскімі стварыў у Варшаве «Польска-беларускае таварыства для культурнага і палітычнага супрацоўніцтва на Беларусі». Выступаў за саюз Беларусі з Польшчай. У слуцкім доме Вайніловіча 14 – 15 лістапада 1920 г. праходзіў Беларускі з’езд Случчыны, які ініцыяваў Слуцкае паўстанне[108].

*Міхал Піус Ромер* (1880 – 1945) – грамадска-палітычны дзеяч. У 1911 – 1915 гг. супрацоўнічаў з газетай «Наша Ніва», з’яўляўся сябрам рэдакцыі віленскай газеты «Kurier Krajowy» (1913). Узначальваў віленскую масонскую ложу «Літва», у якую ўваходзілі Антон Луцкевіч і Вацлаў Ластоўскі. У 1913 – 1915 гг. распрацаваў канцэпцыю Рэчы Паспалітай у выглядзе канфедэрацыі Польшчы і «гістарычнай Літвы». У 1915 г. далучыўся да легіёнаў Ю. Пілсудскага[109].

**Крыніцы**

1. Беларуская думка XX стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура: Анталогія / уклад. Ю. Гарбінскі. – Варшава : ІС ПАН, 1998. – 741 с.

**Літаратура**

1. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – СПб : Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.

2. Чаквін, І. У. Нацыя ліцвінаў у этнагенезе беларусаў: Параўнальна-тыпалагічны і гістарычны аспекты / І. У. Чаквін // Беларусіка – Albaruthenica. – Кн. 6. Ч. I: Беларусь паміж Усходам і Захадам / рэд. У. Конан [і інш.]. – Мінск : Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, 1997. – С. 37 – 42.

[108] Вайніловіч Эдвард // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 2: Беліцк – Гімн / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1994. – С. 202.

[109] Смалянчук, А. Ф. «Краёвасць» у беларускай і літоўскай гісторыі. 1905 – 1940 г. / А. Ф. Смалянчук // Беларускі гістарычны архіў. – 1997. – Т. 4. – Сш. 1 – 2 [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://www.belhistory.eu/ales-smalyanchuk-krayovasc-u-belaruskaj-i-litoўskaj-gistoryi/. – Дата доступа: 24.12.2011.

# ТЭМА 25. ЭСТЭТЫЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ПРАДСТАЎНІКОЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ «НАШАНІЎСКАЙ» ЭПОХІ

1. Творчасць М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага.
2. Культуралагічныя канцэпцыі І. Канчэўскага і В. Ластоўскага.

## 25.1. Творчасць М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага

*Максім Адамавіч Багдановіч* (1891 – 1917) – беларускі паэт, крытык, перакладчык, аўтар кнігі вершаў «Вянок», адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратурнай традыцыі. Беларускую мову М. Багдановіч вывучаў па запісах свайго бацькі – этнолага Адама Ягоравіча Багдановіча, аўтара выдатнай працы «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов» (Гродна, 1895), а таксама па слоўніках, галоўным чынам па «Словарю белорусского наречия» І. Насовіча. М. Багдановіч дэбютаваў у 1907 г. з апавяданнем «Музыка» (газета «Наша Ніва»). У 1914 г. у Вільні выйшаў яго адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок». Выхад кнігі падзяляе творчасць М. Багдановіча на два перыяды. Першы вызначаецца больш шырокімі культурна-асветніцкімі задачамі. М. Багдановіч выкарыстоўваў спадчыну сусветнай культуры дзеля ўзбагачэння айчыннай літаратуры новымі жанрамі і прыёмамі. Другі перыяд працякаў пад знакам фальклярызму ў межах беларускай літаратурнай і культурнай традыцыі. Паэт таксама звяртаўся да інтымнай і пейзажнай лірыкі, да вершаў сацыяльна-дэмакратычнага зместу.

*Янка Купала* (Іван Дамінікавіч Луцэвіч; 1882 – 1942) – паэт, публіцыст і драматург. Народны паэт Беларусі (1925). Беларускамоўны дэбют Янкі Купалы адбыўся ў 1905 г. з вершам «Мужык» (газета «Северо-Западный край»). У 1908 г. у пецярбургскім выдавецтве «Загляне сонца і ў наша ваконца» выйшаў першы зборнік паэта «Жалейка». Раннім вершам Янкі Купалы ўласцівы фальклорныя матывы, наследаванне Ф. Багушэвічу. Тэматыка ранніх твораў паэта – бяспраўнае жыццё беларускага селяніна, прыгажосць роднага краю і стваральнай працы. У позніх творах выяўляецца рамантычнае светаадчуванне, акрэсліваецца філасофскі лірычны настрой, паўстае рамантычны вобраз паэта як прарока, які спазнаў таямніцы свету і жадае данесці іх да людзей.

*Якуб Колас* (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч; 1882 – 1956) – паэт і празаік. Народны паэт Беларусі (1926). Паходзіў з беларускай сялянскай сям'і. Аўтар прызнанага шэдэўра беларускай літаратуры – эпічнай паэмы «Новая зямля» (1911 – 1923). Дэбютаваў з беларускамоўным вершам «Наш

родны край» (1906; газета «Наша доля»). У 1910 г. у Вільні выйшаў першы зборнік вершаў «Песні жальбы», у 1912 г. – кніга прозы «Апавяданні».

У першым зборніку вершаў Якуб Колас стварае рамантычны вобраз беларуса-селяніна, які і ў цяжкіх сацыяльных умовах застаецца аптымістам. У ранніх апавяданнях Коласа («Васіль Чурыла», «Чорт», «Кантракт», «Соцкі падвёў») пераважае бытавая тэматыка з сатырычнымі элементамі, скіраванымі супраць пануючай сацыяльна-палітычнай сістэмы і заган саміх беларусаў. У форме бытавога анекдота, этнаграфічнага нарыса, фальклярызаванага апавядання паказана гісторыя маленькага чалавека, які сваімі ўчынкамі даказвае права на годнае жыццё. У паэме «Новая зямля» створаны абагульнены вобраз Беларусі, яе прыроды, тыповых характараў, адлюстраваны сацыяльныя і нацыянальныя супярэчнасці канца XIX – пачатку XX ст. Трылогія «На ростанях» (1923 – 1954) – самы буйны празаічны твор Якуба Коласа. У ім раскрыты жыццёвыя лёсы і духоўныя пошукі прадстаўнікоў сялянскай інтэлігенцыі Беларусі пачатку XX стагоддзя. Твор напісаны на аўтабіяграфічным матэрыяле, у ім адлюстраваны побыт сялянства, інтэлігенцыі і дробнага чынавенства.

Творчасць Якуба Коласа спрыяла пашырэнню жанравых магчымасцяў беларускай літаратуры, узбагачэнню паэзіі філасофскай і пейзажнай лірыкай. Былі закладзены асновы беларускага рамана і дзіцячай літаратуры. У творчасці Коласа адбывалася філасофскае асэнсаванне рэчаіснасці, фарміраванне норм беларускай літаратурнай мовы.

*Максім Іванавіч Гарэцкі* (1893 – 1938) – празаік, літаратуразнавец, лексікограф, фальклярыст, грамадскі дзеяч. Паходзіў з беларускай сялянскай сям'і. Дэбютаваў пад псеўданімам Максім Беларус з апавяданнем «У лазні» (1913; «Наша ніва»). У 1914 годзе выйшаў першы празаічны зборнік «Рунь».

Творам М. Гарэцкага ўласцівы псіхалагізм, рэфлексіўнасць. Пісьменнік правёў глыбокі мастацкі аналіз праблемы ўзаемаадносін мясцовай інтэлігенцыі і беларускага сялянства (аповесць «Меланхолія», апавяданне «Фантазія»). Выступаў супраць правінцыйнай замкнёнасці маладой беларускай літаратуры, заклікаў беларускіх літаратараў адмовіцца ад дробных форм і бытапісання на карысць твораў, звернутых да аналізу сацыяльных праблем.

Самым вядомым творам пісьменніка з'яўляецца аповесць «На імперыялістычнай вайне» (1926), заснаваная на аўтабіяграфічным франтавым вопыце пісьменніка. Твор актыўна перакладаўся на замежныя мовы, высока ацэнены даследчыкамі, якія ставяць яго ў адзін шэраг з «Севастопальскімі апавяданнямі» Л. Талстога, раманам Э.-М. Рэмарка «На Заходнім фронце без змен» і іншымі выдатнымі творамі вайсковай прозы. Аповесці

«У чым яго крыўда?» і «Меланхолія» яднае вобраз героя Лявона Задумы – асобы, унутрана блізкай аўтару. Гэтыя аповесці не толькі прадэманстравалі высокае майстэрства М. Гарэцкага як аўтара сацыяльна-псіхалагічных твораў, але і засведчылі далейшае ўмацаванне эпічных асноў яго творчасці, імкненне стварыць шырокую панараму жыцця беларускага народа на вялікім гістарычным прамежку часу.

М. Гарэцкі – адзін са стваральнікаў жанра беларускага рэалістычнага рамана («Камароўская хроніка», «Віленскія камунары»). Тэме сталінскіх рэпрэсій прысвечаны творы «Скарбы жыцця» (1932 – 1935), «Лявоніус Задумекус» (другая палова 1931 – пачатак 1932) і «Кіпарысы» (1928)[110]. М. Гарэцкі таксама аўтар першай «Гісторыі беларускай літаратуры» (1920), якая не страціла дыдактычнай і навуковай актуальнасці да нашага часу. Яму належаць літаратурна-крытычная праца «Маладняк» за пяць гадоў. 1923 – 1928» (1928) і «Хрэстаматыя беларускае літаратуры. XI век – 1905 г.» (Вільня, 1922).

## 25.2. Культуралагічныя канцэпцыі І. Канчэўскага і В. Ластоўскага

*Ігнат Канчэўскі* (Ігнат Абдзіраловіч; 1896 – 1923) – беларускі паэт, публіцыст, эсэіст, аўтар філасофскага артыкула «Адвечным шляхам» (1921). У першым раздзеле працы «Адвечным шляхам» І. Канчэўскі разглядае праблему беларускай ідэнтычнасці, якая сфарміравалася, на думку аўтара, сітуацыяй культурнага памежжа «Захад – Усход». Беларусь цалкам, краіна і яе культура, падаецца як «граніца паміж Усходам і Захадам». Душа беларуса таксама падзелена гэтым цывілізацыйным разломам, беларуская ідэнтычнасць увабрала элементы і заходніх, і ўсходніх каштоўнасцяў. Адсюль, па меркаванні І. Канчэўскага, прычыны размытасці беларускай ідэнтычнасці. Другі раздзел эсэ прысвечаны аналізу цывілізацыйных знешніх форм культуры. Пісьменнік разважае над прычынамі трываласці «мёртвых», неадпаведных жыццёвым патрэбам форм і прапануе сваю ідэю «ліючайся» формы. У трэцім раздзеле аўтар аналізуе сучасныя яму палітычныя рухі ў кантэксце прынцыпу сацыяльнай творчасці і робіць выснову пра іх нятворчы характар. Чацвёрты раздзел паўстае як абагульненне, у якім аўтар сцвярджае неабходнасць пошуку непрымусовых культурных і сацыяльных форм[111].

---

[110] Мушынскі, М. Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – С. 436 – 448.

[111] Слінка, Т. Праблема беларускай ідэнтычнасці ў тэксце Ігната Абдзіраловіча / Т. Слінка // Беларускі Калегіюм [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://bk.baj.by/lekcyji/litaratura/slinka01.htm. – Дата доступа: 11.12.2011.

*Вацлаў Юстынавіч Ластоўскі* (1883 – 1938) – грамадска-палітычны дзеяч, пісьменнік. У 1902 г. уступіў у Польскую сацыялістычную партыю ў Літве. У 1906 – 1908 гг. член БСГ; у 1909 – 1914 гг. – рэдакцыйны сакратар газеты «Наша ніва». У лістападзе 1918 г. увайшоў у склад Літоўскай Тарыбы. У канцы 1918 г. узначаліў беларускае прадстаўніцтва пры Літоўскай Тарыбе, потым займаў пасаду беларускага аташэ пры літоўскім пасольстве ў Берліне. У снежні 1919 г. узначаліў Кабінет міністраў Народнай рады БНР. У красавіку 1927 г. пераехаў у БССР. З 1928 г. – акадэмік БелАН. Быў нязменным сакратаром Інбелкульта. 21 ліпеня 1930 г. арыштаваны ДПУ БССР па справе «Саюза вызвалення Беларусі». Паўторна асуджаны 20 жніўня 1937 г. 23 студзеня 1938 г. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР прыгавораны да расстрэлу.

У літаратурна-публіцыстычных артыкулах «Сплачвайце доўг» (1913), «Па свайму шляху!» (1914) выступаў супраць рэвалюцыйна-дэмакратычнага накірунку ў літаратуры. Адмаўляў канцэпцыю адзінства ўсходнеславянскіх народаў, міфалагізаваў гісторыю беларусаў. У 1910 г. выдаў «Кароткую гісторыю Беларусі», у якой спрабаваў абгрунтаваць беларускі характар ВКЛ. Выступаў супраць самой назвы «Беларусь», прапаноўваючы тэрмін «Крыўя»[112]. У 1923 – 1927 гг. выдаваў гісторыка-літаратурны часопіс «Крывіч». Каб аддаліць літаратурную беларускую мову ад рускай, прапаноўваў замяняць агульныя для ўсходніх славян словы неалагізмамі («Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік», 1924). У 1926 г. выйшла «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Спроба паясьніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя» – хрэстаматыя, у якой В. Ластоўскі змясціў фрагменты з беларускіх старадрукаў і рукапісаў.

**Крыніцы**


1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: Даследзіны беларускага светагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.
2. Беларуская думка XX стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура: Анталогія / уклад. Ю. Гарбінскі. – Варшава : ІС ПАН, 1998. – 741 с.
3. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1992. – 479 с.
4. Ластоўскі, В. Ю. Выбраныя творы / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 510 с.
5. Ластоўскі, В. Ю. Кароткая гісторыя Беларусі з 40 рысункамі / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1993. – 126 с.
6. Ластоўскі, В. Ю. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 834 с.


[112] Ластоўскі, В. Аб назовах «Крывія» і «Беларусь» / В. Ластоўскі // Выбраныя творы. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – С. 372 – 385.

**Літаратура**

1. Адамовіч, А. «Браму скарбаў сваіх адчыняю…» / А. Адамовіч. – Мінск : выдавецтва БДУ, 1980. – 224 с.
2. Дасаева, Т. М. Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага / Т. М. Дасаева. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 87 с.

# ТЭМА 26. ІДЭЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ 1914 – 1921 ГГ.

Тэрміны: *беларусізацыя, карэнізацыя.*

1. Беларускі рух напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.
2. Канцэпцыі дзяржаўнага развіцця Беларусі стваральнікаў БНР.
3. Рэалізацыя ідэі беларускай дзяржаўнасці ў БССР.

## 26.1. Беларускі рух напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

***Кансерватыўна-клерыкальныя колы***. Першая сусветная вайна ўнесла значныя карэктывы ў развіццё беларускага нацыянальнага руху. Многія прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі выехалі з Беларусі ў Цэнтральную Расію. Была закрыта газета «Наша ніва». У неакупіраванай частцы Беларусі партыйнае жыццё было фактычна спынена ў сувязі з ваенным становішчам. На акупіраваных немцамі землях беларускія дзеячы (браты Луцкевічы, Р. Скірмунт) вялі перамовы з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, з літоўскімі і яўрэйскімі палітыкамі. Узнік праект адраджэння ВКЛ з сеймам у Вільні пад патранажам Германіі. У снежні 1915 г. на літоўскай, польскай, яўрэйскай і беларускай мовах быў выдадзены «Універсал». У дакуменце гаварылася, што палітыкі, якія яго падпісалі, абвяшчаюць утварэнне канфедэрацыі Літвы і Беларусі. У гэтую дзяржаву павінны былі ўвайсці землі, захопленыя Германіяй. У лютым 1916 г. была распаўсюджана адозва «Грамадзяне», у якой выкладаліся прынцыпы палітычнага ладу канфедэрацыі. Планавалася сфарміраваць сейм на аснове агульных, роўных і прамых выбараў пры тайным галасаванні. Аднак нямецкае камандаванне пасля захопу Вільні абвясціла, што заходнія беларускія землі будуць падпарадкоўвацца Польшчы. На беларускай тэрыторыі пачала фарміравацца сетка польскіх школ і грамадска-палітычных структур. У беларускім нацыянальным руху адбыўся раскол. В. Ластоўскі заснаваў арганізацыю, якая ставіла мэту ўтварэння незалежнай Беларусі ў яе этнаграфічных межах. Памешчыкі-

краёўцы і каталіцкія клерыкалы ў 1915 г. утварылі палітычную арганізацыю «Хрысціянская злучнасць» (барон Роп, барон Шафнагель). Гэтая арганізацыя актыўна шукала паразумення з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі[113].

У пачатку 1916 г. беларускі нацыянальны рух значна актывізаваўся. Пачала выходзіць газета «Гоман». У Вільні дзейнічалі «Беларускі камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны», «Беларускі клуб», згуртаванне «Золак», «Навуковае таварыства», «Беларускі вучыцельскі саюз». Каардынаваў гэтую работу створаны ў 1915 г. у Вільні Беларускі народны камітэт (БНК), які ўзначальваў А. Луцкевіч. Спачатку камітэт прытрымліваўся праекта адраджэння ВКЛ, пазней планаваў стварэнне Беларуска-Літоўскай дзяржавы з аўтаномнымі беларускімі і літоўскімі землямі. У канцы 1916 г. БНК спрабаваў дамовіцца з Літоўскім нацыянальным камітэтам. Аднак Літоўскі камітэт, не губляючы часу на перамовы з рамантычна настроенымі сябрамі БНК, пры падтрымцы Германіі ўтварыў у Вільні Літоўскую дзяржаўную раду (Тарыбу) як вярхоўны дзяржаўны орган Літвы. У склад новай Літоўскай дзяржавы былі ўключаны захопленыя немцамі беларускія землі без усякіх правоў аўтаноміі. Беларусы атрымалі ў Тарыбе два месцы. БНК правёў у 1918 г. у Вільні Беларускую канферэнцыю, дзе была абрана Віленская беларуская рада, якой БНК здаў свае паўнамоцтвы. Беларускі народны камітэт ва ўмовах акупацыі рабіў намаганні, каб звярнуць увагу сусветнай грамадскасці на лёс беларусаў і абудзіць нацыянальную свядомасць беларускага народа[114].

***Нацыянальна-рэвалюцыйная плынь.*** Прадстаўнікі левай плыні ў беларускім нацыянальным руху ў сваёй большасці не засталіся пад нямецкім акупацыйным рэжымам і працягвалі сваю дзейнасць у Маскве. Адзін з кіраўнікоў гэтай плыні А. Бурбіс сцвярджаў, што ва ўмовах акупацыі Беларусі не было ніякіх надзей на магчымае нацыянальнае адраджэнне. Як і іншыя прадстаўнікі левай плыні нацыянальнага руху, ён стаяў на палітычнай платформе паражэння царызму ў вайне.

З другой паловы 1915 г. галоўнымі цэнтрамі беларускага нацыянальнага руху сталі Петраград, Масква, Мінск, Калуга, Смаленск, дзе бежанцы-беларусы ўтварылі свае суполкі. У кастрычніку 1916 г. Міністэрства ўнутраных спраў Расіі дазволіла выданне ў Петраградзе і Мінску беларускіх газет «Дзянніца» і «Светач». Газета «Светач», якая выдавалася ў Петраградзе рэлігійна-клерыкальнымі дзеячамі, прапагандавала ідэі адзінства бела-

---

[113] Сідарэвіч, А. М. Беларуская Народная Рэспубліка / А. М. Сідаровіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 1: А – Беліца / рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]; прадм. М. Ткачова; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 384 – 388.

[114] Мірановіч, Я. Навейшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч. – Беласток : Праграмная Рада Тыднёвіка Беларусаў у Польшчы Ніва, 1999. – С. 40 – 47.

русаў незалежна ад іх класавай прыналежнасці, заклікала ўсе грамадскія сілы да ажыццяўлення «беларускага нацыянальнага ідэалу». У пачатку 1917 г. яе выданне было спынена. Газету «Дзянніца» выдаваў З. Жылуновіч. Яна адлюстроўвала рэвалюцыйна-дэмакратычны характар беларускага нацыянальнага руху. «Дзянніца» прапагандавала думку, што свабоднае развіццё беларускага народа магчыма ў саюзе з рускім народам. У газеце друкаваліся творы З. Жылуновіча, К. Буйло, К. Чарнушэвіча, Ф. Шантыра.

## 26.2. Канцэпцыі дзяржаўнага развіцця Беларусі стваральнікаў БНР

25 сакавіка 1917 г. у Мінску адбыўся першы з'езд нацыянальных арганізацый Беларусі. Буйнейшымі сярод іх былі Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), Беларуская народная грамада (БНГ) і Беларуская партыя народных сацыялістаў (БПНС). Адной з задач з'езду было вызначэнне этнаграфічных межаў Беларусі. Дзеля гэтага была сфарміравана камісія, у склад якой увайшлі Я. Карскі, А. Шахматаў, М. Любаўскі, М. Доўнар-Запольскі. Дэлегаты выказалі пратэст супраць уключэння Віленскай губерні ў склад Літоўскай Рэспублікі. З'езд выказаўся за аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай рэспублікі. Для каардынацыі кантактаў беларускіх арганізацый з Часовым урадам Расіі быў абраны *Беларускі нацыянальны камітэт.* У яго склад увайшлі 18 чалавек (10 прадстаўлялі БСГ) на чале з Р. Скірмунтам. БНК даручалася праводзіць перамовы з Часовым урадам аб аўтаноміі для Беларусі, а таксама падрыхтаваць правядзенне выбараў у Беларускую краёвую раду. У маі 1917 г. на сесіі БНК прадстаўнікі БСГ настойвалі на прыняцці больш радыкальнай праграмы сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Памешчыкі Р. Скірмунт, Э. Вайніловіч, М. Радзівіл, Д. Друцкі-Любецкі блакіравалі прапановы рэарганізацыі дзейнасці камітэта. У ліпені 1917 г. адбыўся II з'езд, які скасаваў БНК пад уплывам пазіцыі дэлегатаў ад БСГ і стварыў *Цэнтральную раду беларускіх арганізацый* (Я. Лёсік, Я. Дыла, Р. Астроўскі, П. Галавач, Ф. Шантыр, А. Смоліч, С. Курчыловіч-Сяўрук, П. Бадунова, З. Жылуновіч). Восенню 1917 г. на 2-й сесіі ЦРБА яна была рэарганізавана ў *Вялікую беларускую раду*[115].

30 лістапада 1917 г. ВБР звярнулася з адозвай «Ко всему народу белорусскому», у якой абвясціла сваю праграму. У ёй прадугледжвалася абвяшчэнне Беларускай дэмакратычнай рэспублікі. У адозве аб'яўлялася скліканне 5 снежня 1917 г. у Мінску з'езда прадстаўнікоў беларускага народа.

[115] Міраловіч, Я. Навейшая гісторыя Беларусі / Я. Міраловіч. – Беласток : Праграмная Рада Тыднёвіка Беларусаў у Польшчы Ніва, 1999. – С. 51 – 56.

ВБР звярнулася да кіраўнікоў *Выканаўчага камітэту Заходняй вобласці і фронту* (Аблвыкамзах) Карла Ландара і Вільгельма Кнорына з прапановай аб супрацоўніцтве па арганізацыі з’езда, аднак прапанова была адхілена.

*Першы Усебеларускі з’езд* праходзіў 7 – 18 снежня 1917 г. у Мінску. У ноч з 17 на 18 снежня з’езд аб’явіў праект рэзалюцыі «Аб самавызначэнні Беларусі і аб часовай краявой уладзе». Прапаноўвалася стварыць новы краявы орган улады – Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Улада Абылвыканкамзаха была прызнана незаконнай. Гэта паслужыла падставай для разгону з’езда сіламі СНК Заходняй вобласці і фронту. 18 снежня 1917 г. члены прэзідыума Усебеларускага з’езда правялі падпольнае паседжанне, на якім выбралі выканкам рады з’езда на чале з лідарам народніцкага крыла БСГ Ф. Грыбам[116].

21 лютага 1918 г. выканкам Усебеларускага з’езда прыняў першую ўстаўную грамату, у якой аб’явіў сябе часовай уладай у Беларусі. Да адкрыцця сойму выканаўчыя функцыі ўскладаліся на створаны выканкамам Народны сакратарыят. 9 сакавіка 1918 г. выканкам Усебеларускага з’езда прыняў другую ўстаўную грамату, у якой аб’явіў Беларусь у межах рассялення пераважнай большасці беларускага этнасу народнай рэспублікай. Выканкам быў перайменаваны ў Раду БНР, прэзідыум якой узначаліў прадстаўнік БСГ І. М. Серада. 25 сакавіка 1918 г. на сесіі Рады была прынята трэцяя ўстаўная грамата, у якой абвяшчалася незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі і выказвалася патрабаванне перагляду ўмоў Брэсцкага міру (3 сакавіка 1918 г.), у дакументах якога Беларусь не прызнавалася самастойным нацыянальным рэгіёнам Расіі. Германія не прызнала БНР. Пасля лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. у Германіі Расія дэнансавала Брэсцкі мірны дагавор. 10 снежня 1918 г. Чырвоная Армія ўвайшла ў Мінск. Большасць членаў Рады і ўрада БНР пакінулі горад[117].

## 26.3. Рэалізацыя ідэі беларускай дзяржаўнасці ў БССР

Прыхільнікамі ідэі беларускай дзяржаўнасці ў лева-рэвалюцыйным крыле нацыянальнага руху Беларусі з’яўляліся З. Жылуновіч, А. Чарвякоў, І. Лагун, Я. Дыла, Я. Канчар. У пачатку 1918 г. яны ўвайшлі ў Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам), створаны пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей РСФСР у адпаведнасці з дэкрэтам У. Ле-

---

[116] Круталевіч, В. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.): вучэб. дапаможнік для студэнтаў юрыдычных і гістарычных спецыяльнасцей ВНУ / В. А. Круталевіч, І. А. Юхо. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – С. 15 – 21.
[117] Тамсама. – С. 21 – 23.

ніна ад 31 студзеня 1918 г. Праз газету «Дзянніца» сярод беларусаў-бальшавікоў Петраграда, Масквы, Варонежа, Казані, Саратава, Тамбова Белнацкам прапагандаваў ідэю самавызначэння беларусаў на аснове савецкай улады і ў саюзе з РСФСР.

21 – 23 снежня 1918 г. у Маскве на Канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б) было створана Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б) на чале з З. Жылуновічам. Бюро было даручана склікаць Усебеларускі з'езд камуністаў і стварыць беларускі партыйны цэнтр. 30 снежня 1918 г. у Смаленску прайшла VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), на якой была прынята рэзалюцыя «Пра абвяшчэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». Паўночна-заходняя арганізацыя РКП(б) была перайменавана ў КП(б)Б, застаўшыся часткай РКП(б). Канферэнцыя абвясціла сябе І з'ездам КП(б)Б. 1 студзеня 1919 г. у Смаленску быў агучаны Маніфест Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага савецкага ўрада, якім абвяшчалася ўтварэнне БССР. Улада перадавалася Саветам рабочых, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Зямля, воды, нетры, фабрыкі і заводы абвяшчаліся ўласнасцю народа. Усе юрыдычныя акты акупацыйных улад абвяшчаліся несапраўднымі.

Задачу надання легітымнасці палажэнням маніфеста павінен быў вырашыць Усебеларускі з'езд Саветаў, на якім меркавалася прыняць Канстытуцыю краіны, зацвердзіць герб і сцяг, выбраць ЦВК. Аднак 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб далучэнні да РСФСР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў і аб'яднанні БССР з Літоўскай ССР. Апошняе тлумачылася інтарэсамі сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. 5 студзеня 1919 г. сталіцай БССР зрабіўся Мінск. 2 – 3 лютага 1919 г. у Мінску праходзіў Усебеларускі з'езд Саветаў, на якім была зачытана пастанова Прэзідыума УЦВК «Аб прызнанні незалежнасці БССР». Адразу ж было прынята рашэнне аб аб'яднанні БССР з Літоўскай ССР. У склад ЛітБел увайшла тэрыторыя Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і частка Сувалскай губерняў. 27 лютага 1919 г. былі створаны ЦВК ЛітБел і яго прэзідыум на чале з К. Цыхоўскім, а таксама ўрад – Савет Народных Камісараў на чале з В. Міцкявічусам-Капсукасам. У жніўні 1919 г. ЛітБел была акупіравана палякамі. Юрыдычна ЛітБел праіснавала да ліпеня 1920 г.[118]

31 ліпеня 1920 г., пасля вызвалення Чырвонай Арміяй Мінска ад польскіх акупантаў, была абвешчана Дэкларацыя аб незалежнасці Беларус-

[118] Круталевіч, В. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.): вучэб. дапаможнік для студэнтаў юрыдычных і гістарычных спецыяльнасцей ВНУ / В. А. Круталевіч, І. А. Юхо. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – С. 42 – 63.

кай ССР. БССР аднавілася толькі ў межах Мінскай губерні. Па Рыжскім мірным дагаворы, які быў падпісаны 18 сакавіка 1921 г. паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, да Польшчы адышла Заходняя Беларусь. Частка ўсходніх зямель заставалася пад юрысдыкцыяй РСФСР.

***Палітыка беларусізацыі ў БССР.*** Пасля стварэння БССР школы ў Савецкай Беларусі пачалі пераходзіць на беларускую мову навучання. Ствараліся школы для нацыянальных меншасцей, фарміравалася сістэма дашкольнага выхавання і школьнай адукацыі, прафесійных вучылішчаў і тэхнікумаў. Выходзілі газеты, часопісы, кнігі на беларускай мове і мовах нацыянальных меншасцей. Пачалі дзейнічаць Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр Уладзіслава Галубка, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1921), Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), Дзяржаўны музей, Цэнтральны архіў. II сесія ЦВК БССР (15 ліпеня 1924 г.) паклала афіцыйны пачатак *беларусізацыі*. Была створана спецыяльная камісія па беларусізацыі пад кіраўніцтвам А. І. Хацкевіча. Планавалася правесці комплекс мерапрыемстваў:

– перавод дзяржаўных устаноў і часцей Чырвонай Арміі на беларускую мову;

– вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую і прафсаюзную работу (*карэнізацыя*);

– арганізацыя работы навучальных устаноў на беларускай мове, развіццё беларускай літаратуры[119].

У 1924 – 1925 гг. праводзілася работа па тлумачэнні сутнасці беларусізацыі. Пераход устаноў і арганізацый на беларускую мову планавалася ажыццявіць на працягу 1 – 3 гадоў. У 1927 г. беларускай мовай валодалі 80 % чыноўнікаў. Да 1927 г. сярод кіраўнікоў акруг і раёнаў было 48 % беларусаў. Да 1928 г. 80 % школ было пераведзена на беларускую мову навучання. Распрацоўваліся курсы гісторыі, эканомікі, геаграфіі Беларусі. Дзейнічалі курсы беларусазнаўства, якія рыхтавалі настаўнікаў і лектараў. Ствараліся галіновыя тэрміналагічныя беларускія слоўнікі. На сярэдзіну 20-х гг. XX ст. у БССР дзейнічала 240 краязнаўчых арганізацый. За некалькі гадоў у беларускую літаратуру прыйшлі дзясяткі маладых таленавітых аўтараў (П. Броўка, К. Крапіва, М. Лынькоў, М. Чарот, К. Чорны). У 1920-я гг. выйшлі паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка» Якуба Коласа, а таксама другая частка трылогіі «На ростанях». Янка Купала стварыў паэму «Безназоўнае». У 1926 г. быў створаны першы беларускі мастацкі фільм «Лясная быль» (рэжысёр Ю. Тарыч), у 1928 г. у Ленінградзе адкрылася кінастудыя мастацкіх фільмаў «Савецкая Беларусь». Выкладанне ў школах вялося на 8

---

[119] Міранові́ч, Я. Навейшая гісторыя Беларусі / Я. Міранові́ч. – Беласток : Праграмная Рада Тыднёвіка Беларусаў у Польшчы Ніва, 1999. – С. 62 – 64.

нацыянальных мовах. Былі створаны нацыянальныя Саветы ў месцах кампактнага пражывання яўрэяў, палякаў, літоўцаў. Шмат зрабілі для фарміравання палітыкі беларусізацыі Старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў, Старшыня СНК БССР Я. Адамовіч, У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч, А. Бурбіс, А. Цвікевіч[120].

*Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі* (1881 – 1931) – грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, ідэолаг палітыкі беларусізацыі ў БССР. Стваральнік Навукова-тэрміналагічнай камісіі пры Наркамаце асветы Беларускай ССР (1921), старшыня Інбелкульта (з 1926), першы прэзідэнт Акадэміі навук БССР (з 1929 да 26 снежня 1930), першы дырэктар Інстытута гісторыі Акадэміі навук (з 15 кастрычніка 1929), прафесар БДУ (1921 – 1930).

Аўтар «*Кароткага нарысу гісторыі Беларусі*» (1919), першага марксісцкага даследавання гісторыі Беларусі. Кніга з 1919 па 1991 гг. вытрымала пяць перавыданняў, доўгі час з'яўлялася школьным падручнікам. У кнізе прапанавалася перыядызацыя гісторыі Беларусі паводле дзяржаўнай прыналежнасці (Полацкі, Літоўска-Беларускі, Польскі, Расійскі перыяды і Беларусь пасля звяржэння царызму). У. М. Ігнатоўскі лічыў, што знаходжанне беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай прывяло да запавольвання развіцця беларускай культуры. Адной з найбольш негатыўных тэндэнцый з'яўлялася паланізацыя прывілеяванага саслоўя.

У. М. Ігнатоўскі высока ацэньваў дзейнасць Я. Чачота, А. Рыпінскага, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, К. Калайдовіча, П. Шпілеўскага, А. Кіркора, П. Бяссонава, П. Шэйна, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, Я. Карскага ў адраджэнні беларускай культуры. Меркаваў, што станоўчы ўплыў на фарміраванне беларускай нацыянальнай свядомасці зрабіла паўстанне 1863 – 1864 гг. Новы этап нацыянальнага адраджэння, на думку І. М. Ігнатоўскага, пачаўся са з'яўленнем сялянска-рабочай інтэлігенцыі: Я. Коласа, Ц. Гартнага і іншых. Як лічыў гісторык, з утварэннем Беларускай ССР у беларусаў з'явіліся прынцыпова новыя магчымасці нацыянальна-культурнага будаўніцтва[121].

*Зміцер Хведаравіч Жылуновіч* (псеўданім Цішка Гартны; 1887 – 1937) – грамадска-палітычны дзеяч, пісьменнік, аўтар Маніфеста, якім абвяшчалася нараджэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь, кіраўнік яе Часовага рабоча-сялянскага ўрада (1 студзеня 1919 – 3 лютага 1919). Аўтар раманаў «Сокі цаліны» і «Перагуды», п'ес, апавяданняў, публіцыстычных артыкулаў. Рэдактар першай беларускай бальшавіцкай газеты «Дзянніца».

---

[120] Круталевіч, В. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.): вучэб. дапаможнік для студэнтаў юрыдычных і гістарычных спецыяльнасцей ВНУ / В. А. Круталевіч, І. А. Юхо. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – С. 144 – 146.

[121] Ігнаценка, І. М. Усевалад Ігнатоўскі і яго час / І. М. Ігнаценка, А. С. Кароль. – Мінск : Беларускі Дом Друку, 1991. – С. 23 – 26.

Рэдактар газеты «Савецкая Беларусь», стваральнік літаратурнага аб'яднання і часопіса «Полымя». Узначальваў Дзяржвыдавецтва БССР і Цэнтральны архіў БССР, працаваў намеснікам наркама асветы БССР. Акадэмік Акадэміі навук БССР з 1928 г.

*Аляксандр (Алесь) Лаўрэнавіч Бурбіс* (1885 – 1922) – грамадска-палітычны дзеяч, адзін з пачынальнікаў беларускага тэатра, аўтар даследаванняў па эканамічнай геаграфіі, гісторыі і этнаграфіі Беларусі. Адзін з рэдактараў «Савецкай Беларусі», удзельнік камісіі пад кіраўніцтвам Мархлеўскага па распрацоўцы пытанняў Рыжскага мірнага дагавора.

У 1920 г. апублікаваў манаграфію «Кароткі нарыс па эканамічнай геаграфіі Беларусі». У рабоце ўпершыню быў апісаны беларускі тэрытарыяльна-гаспадарчы комплекс, прааналізаваны гаспадарчыя і эканамічныя сувязі Беларусі. Працаваў намеснікам народнага камісара замежных спраў, удзельнічаў у распрацоўцы і падпісанні дагавора паміж БССР і РСФСР, з'яўляўся членам ЦВК Беларусі. Выступаў у абарону тэрытарыяльнай цэласнасці БССР, спрыяў узбуйненню яе тэрыторыі. Прапагандаваў неабходнасць кансалідацыі ўсіх плыняў беларускага нацыянальнага руху на базе пабудовы беларускай савецкай дзяржаўнасці.

*Аляксандр Іванавіч Цвікевіч* (1888 – 1937) – грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, юрыст, публіцыст; у 1921 – 1923 гг. з'яўляўся міністрам замежных спраў ва ўрадзе БНР В. Ластоўскага. У 1922 г. А. Цвікевіч разам з В. Ластоўскім зрабіў спробу ўключэння беларускага пытання ў парадак дня Генуэзскай канферэнцыі.

У 1923 г. быў сфарміраваны новы ўрад БНР на чале з А. І. Цвікевічам. На Другой Усебеларускай канферэнцыі ў Берліне ў 1925 г. пад уздзеяннем дасягненняў палітыкі беларусізацыі ў БССР А. І. Цвікевіч прыняў рашэнне аб спыненні дзейнасці Рады міністраў БНР і прызнанні Мінска адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі. У лістападзе 1925 г. А. І. Цвікевіч пераехаў у Мінск. Працаваў у Наркамаце фінансаў БССР, потым вучоным сакратаром у Інбелкульце, з 1929 г. – у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР. Аўтар работ «Кароткі нарыс узнікнення БНР» (1918), «Беларусь: палітычны нарыс» (1921), «Адраджэньне Беларусі і Польшча» (1921), «Погляд П. Бяссонава на беларускую справу», «Вялікае апрашчэньне ці вялікае ўдасканаленьне?» (1926), «Западно-руссизм: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX стст.» (1929). 4 ліпеня 1930 г. быў арыштаваны па справе «Саюза вызвалення Беларусі». 30 снежня 1937 г. быў расстраляны ў Мінску[122].

[122] Вабішчэвіч, А. Аляксандр Цвікевіч (1883 – 1937) / А. Вабішчэвіч // Камунікат [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа: http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/bzh/14/14biogr_vabiszczevicz.htm. – Дата доступа: 24.12.2011.

**Крыніцы**

1. Беларуская думка XX стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура: Анталогія / уклад. Ю. Гарбінскі. – Варшава : ІС ПАН, 1998. – 741 с.

2. Ігнатоўскі, У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. Ігнатоўскі. – 5-е выд. – Мінск : Беларусь, 1992. – 190 с.

**Літаратура**

1. Ігнаценка, І. Усевалад Ігнатоўскі і яго час / І. Ігнаценка, А. Кароль. – Мінск : Беларускі Дом Друку, 1991. – 123 с.

2. Круталевіч, В. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.) / В. А. Круталевіч, І. А. Юхо. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 238 с.

3. Турук, Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белоруссов / Ф. Турук. – Минск : Картографическая фабрика Белгеодезии, 1994. – 144 с.

# ТЭМА 27. ФІЛАСОФСКАЯ НАВУКА БЕЛАРУСІ XX – ПАЧАТКУ XXI СТСТ.

1. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.
2. Тэндэнцыі ў развіцці беларускай філасофскай думкі ў 20 – 30-я гг. XX – на пачатку XXI стст.

## 27.1. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі

У выніку польска-савецкай вайны 1919 – 1920 гг. тэрыторыя Беларусі была падзелена паміж Польшчай і СССР. Ва ўсходняй яе частцы была створана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Заходнія землі Беларусі адышлі да Польшчы згодна з Рыжскім мірным дагаворам (18 сакавіка 1921 г.). У складзе польскай дзяржавы плошча тэрыторыі, на якой пражывалі беларусы, складала больш за 112 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 4,6 млн чалавек (на 1931 г.). За гэтымі землямі замацавалася неафіцыйная назва «Заходняя Беларусь». У афіцыйных польскіх дакументах гэтая тэрыторыя называлася «крэсы всходне».

У 20-х гг. XX ст. на заходніх землях Беларусі, захопленых Польшчай, праводзілася палітыка «рэпаланізацыі» – асіміляцыі нацыянальных меншасцяў. Яна мела на мэце замацаваць польскую ўладу на акупіраваных землях і апраўдаць права Польшчы на ўсе тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Прапагандавалася ідэя падтрымкі культурнай разна-

стайнасці рэгіёнаў у межах «агульнапольскай культуры», сцвярджаўся прыярытэт рэгіянальных інтарэсаў перад інтарэсамі асобных этнасаў і сацыяльных груп. Фактычна такая палітыка была накіравана на размыванне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. Рэгіяналізацыя на справе азначала правінцыялізацыю беларускай культуры і садзейнічала паглынанню яе культурай польскай.

Эканамічная палітыка Польшчы была скіравана на тое, каб пакінуць беларускія землі ў становішчы аграрнага прыдатку. Прамысловасць Заходняй Беларусі ў 1938 г. давала ў 9 разоў менш прадукцыі, чым у БССР, хоць да падзелу абедзве часткі мелі аднолькавы ўзровень развіцця. На прамысловых прадпрыемствах працоўны дзень працягваўся 10 – 11 гадзін. За тую ж самую працу ў прамысловасці польскаму рабочаму плацілі больш, чым беларусу. Знішчаліся прыродныя багацці Беларусі. За 1921 – 1936 гг. плошча лясоў зменшылася больш як на 400 тыс. га. Аграрныя адносіны ў Заходняй Беларусі характарызаваліся панаваннем буйнога памешчыцкага землеўладання і малазямеллем большай часткі сялянства. Праводзілася палітыка насаджэння на «крэсах» польскіх каланістаў-асаднікаў з ліку былых удзельнікаў польска-савецкай вайны 1919 – 1920 гг.

У пачатку 1930-х гг. у турмах Польшчы знаходзілася больш за 10 тыс. палітзняволеных. З чэрвеня 1934 г. па верасень 1939 г. на акупіраванай палякамі тэрыторыі Беларусі функцыянаваў канцэнтрацыйны лагер «Бяроза-Картузскі». Каланіяльная па сваёй сутнасці палітыка Польшчы на захопленых беларускіх землях спарадзіла шырокі рух супраціву. Падчас барацьбы за нацыянальнае вызваленне вызначаліся тры асноўныя сацыяльна-палітычныя лагеры: буржуазна-памешчыцкі, дробнабуржуазны і рэвалюцыйна-дэмакратычны. Сярод палітычных партый найбольш актыўную барацьбу вяла Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (С. Прытыцкі, М. Танк, В. Таўлай, В. Харужая). Актыўнымі дзеячамі нацыянальна-культурнага руху Заходняй Беларусі былі І. Дварчанін, Я. Драздовіч, А. Луцкевіч, Л. Родзевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, У. Самойла, Б. Тарашкевіч, Я. Шутовіч.

*Уладзімір Іванавіч Самойла* (1878 – 1941) – публіцыст, літаратурны крытык, філосаф. Аўтар філасофскага эсэ «Гэтым пераможаш!» (1924).

Супрацоўнічаў з беларускімі перыядычнымі выданнямі («Минский курьер», «Наша ніва»). Пісаў пра асвету народных мас, пра творчасць расійскіх і замежных пісьменнікаў. Быў членам Мінскай гарадской думы. З 1918 г. жыў у Вільні, працаваў выкладчыкам у гімназіі, друкаваўся ў перыядычных выданнях «Виленская речь», «Виленские новости», «Kurier Wileński» і «Przegląd Wileński», «Калосce». У 1923 – 1927 гг. – адзін з вядучых публіцыстаў заходнебеларускага друку вызваленчага кірунку. Вы-

ступіў з серыяй публіцыстычных артыкулаў, у якіх паказваў імперыялістычны характар палітыкі Польшчы, сцвярджаў гістарычную заканамернасць нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі і яго аб'ектыўную непераможнасць. Пасля разгрому БСРГ адышоў ад актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці.

### 27.2. Тэндэнцыі ў развіцці беларускай філасофскай думкі ў 20 – 30-я гг. ХХ – пачатку ХХІ стст.

***Развіццё філасофскай навукі ў БССР.*** У Савецкай Беларусі існавалі два асноўныя навуковыя філасофскія цэнтры – у Беларускім дзяржаўным універсітэце (кафедра філасофіі і логікі (цяпер кафедра філасофіі культуры) і кафедра філасофіі і метадалогіі навукі; 1921) і Інстытуце філасофіі Акадэміі навук БССР (1931). У 20 – 30-я гг. ХХ ст. найбольш вядомымі беларускімі філосафамі былі Б. Быкоўскі, С. Вольфсан, С. Кацэнбоген. У 1921 г. быў выдадзены першы айчынны падручнік па дыялектычным матэрыялізме С. Вольфсана.

*Сямён Якаўлевіч Вольфсан* (1894 – 1941) – філосаф, акадэмік АН Беларускай ССР (1928), прафесар БДУ (1921). У 1931 г. дырэктар Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР. У 1929 – 1938 гг. член Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР. Распрацоўваў пытанні гісторыі філасофіі, праблемы сям'і, навукі і культуры («Плеханов», 1924; «Интеллигенция как социально-экономическая категория», 1926; «Социология брака и семьи», 1930; «Семья и брак в их историческом развитии», 1937).

*Саламон Захаравіч Кацэнбоген* (1889 – 1946) – савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, філосаф і сацыёлаг, арганізатар навукі ў Беларусі ў 1920-х гг. У лютым 1919 г. – ліпені 1920 г. народны камісар сацыяльнага забеспячэння Літоўска-Беларускай ССР, са снежня 1920 г. намеснік народнага камісара адукацыі Беларускай ССР. З чэрвеня 1921 г. па верасень 1925 г. – у Беларускім дзяржаўным універсітэце: прафесар, загадчык кафедры сацыялогіі і першабытнай культуры, намеснік рэктара, загадчык кафедры філасофіі. Сфера навуковых інтарэсаў – сацыяльная і эканамічная гісторыя, тэарэтычныя пытанні сацыялізму, праблемы марксісцка-ленінскай філасофіі, творчасць Б. Спінозы.

У 70 – 80-х гг. ХХ ст. у айчынных даследаваннях быў зроблены акцэнт на вывучэнні філасофіі і метадалогіі навукі, гісторыі філасофіі, праблем тэорыі навуковага пазнання, эстэтыкі як найбольш нейтральных з пункту гледжання марксісцкай ідэалогіі тэм. З'явіліся арыгінальныя даследаванні Н. Жукава, В. Сцёпіна А. Міхайлава, Е. Бабосава. Новая хваля ў

даследаваннях была выклікана новымі з'явамі ў грамадска-палітычным і навуковым жыцці. Такія з'явы, як вылічальная тэхніка, паняцце інфармацыі, новыя накірункі прыкладнай матэматыкі знайшлі адлюстраванне ў працах Н. Жукава. А. Міхайлаў сфакусіраваўся на гісторыка-філасофскім кантэксце адукацыі. Акадэмік Е. Бабосаў на аснове вялікага фактычнага матэрыялу даследаваў тэорыю і практыку катастроф. Э. Дарашэвіч, У. Конан, М. Крукоўскі плённа працавалі ў галіне тэорыі і гісторыі эстэтыкі. Для БДУ ў 70 – 80-я гг. XX ст. асноўным напрамкам развіцця з'яўляўся агульнаадукацыйны кантэкст філасофіі (А. Міхайлаў, В. Сцёпін), а для Інстытута філасофіі – гісторыя філасофскай думкі (Э. Дарашэвіч, У. Конан, А. Майхровіч, С. Падокшын).

*Вячаслаў Сямёнавіч Сцёпін* (нар. 1934) – філосаф, арганізатар навукі. У 1970 – 1980-х гг. распрацаваў канцэпцыю структуры і генезісу навуковай тэорыі, адкрыў і апісаў аперацыю пабудовы тэорыі. У рамках гэтай канцэпцыі В. Сцёпіным была раскрыта структура асноў навукі, паказана яе ўзаемасувязь з тэорыямі і вопытам. Філосаф абгрунтаваў ідэю мноства патэнцыйна магчымых гісторый навукі і селектыўнай ролі культуры ў рэалізацыі асобных з іх. Распрацаваў канцэпцыю тыпаў навуковай рацыянальнасці (класічны, некласічны, постнекласічны), кожны з якіх характарызуецца ўласным тыпам рэфлексіі над навукай і сістэмай ідэалаў і падыходаў. Даследаваў функцыі светапоглядных універсалій культуры, прааналізаваў суадносіны ўніверсалій культуры і філасофскіх катэгорый.

***Філасофская думка 90-х гадоў мінулага стагоддзя***. Напачатку 90-х гг. XX ст. у атмасферы сацыяльнай эйфарыі запатрабаванай зрабілася вострасацыяльная публіцыстыка. Яна накіроўвала ўвагу чытача на светапоглядныя сістэмы, якія ўспрымаліся як альтэрнатыўныя савецкай сацыяльна арыентаванай матэрыялістычнай думцы. Гэта быў шырокі несістэматызаваны дыяпазон пошуку – ад эзатэрыкі і містыкі да постмадэрнізму і лібертарыянства. Дадзенай плыні было ўласціва некрытычнае ўспрыманне заходніх каштоўнасцяў. Адным з прадуктаў гэтай эпохі можна лічыць філасофскую эсэістыку 90-х гг. XX ст., якая, галоўным чынам, спрабавала засвоіць і ў паэтычнай імпрэсіяністычнай форме папулярызаваць канцэпцыі і імёны сучаснай замежнай філасофскай думкі (В. Акудовіч, А. Анціпенка, І. Бабкоў, А. Ніякоўская, А. Разанаў).

***Тэндэнцыі пачатку XXI стагоддзя.*** У апошнія гады ў айчынным філасофскім мысленні назіраецца тэндэнцыя пошуку новага месца Беларусі ў сучасным глабальным свеце і пераасэнсавання яе гістарычнага лёсу ў тэрмінах геапалітыкі і паліталогіі (А. Грыцанаў, А. Казакевіч, Д. Мельян-

цоў, Ю. Шаўцоў). Асаблівасці беларускай мадэлі развіцця становяцца цэнтрам увагі філасофскага аналізу. Адной з асноўных праблем сучаснай беларускай філасофіі з'яўляецца адсутнасць дыялогу паміж рознымі школамі сучаснай беларускай філасофіі. Аднак, нягледзячы на складанасці, сучасная беларуская філасофія павольна вызваляецца ад абстрактных тэарэтычных схем, уплыву як марксісцкай дагматыкі, так і постмадэрністычнага нігілізму. Адбываецца зварот да прынцыпаў аб'ектыўнасці і навуковасці.

### Крыніцы

1. Акудовіч, В. Код адсутнасці: асновы беларускай ментальнасці / В. Акудовіч. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2007. – 216 с.

2. Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня / уклад. і рэд.: А. Анціпенка, В. Акудовіч. – СПб. : Невский Простор, 2003. – 494 с.

3. Бабкоў, І. Генэалёгія беларускай ідэі / І. Бабкоў // Arche. – Мінск, 2005. – № 3. – С. 136 – 165.

4. Беларуская думка ХХ стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура: Анталогія / уклад. Ю. Гарбінскі. – Варшава : ІС ПАН, 1998. – 741 с.

5. Стёпин, В. С. Философская антропология и философия науки / В. С. Стёпин. – М. : Высшая школа, 1992. – 191 с.

6. Шевцов, Ю. В. Объединенная нация: феномен Беларуси / Ю. В. Шевцов. – М. : Европа, 2005. – 239 с.

### Літаратура

1. Майхрович, А. С. Становление нравственного самосознания. Из истории духовной культуры Беларуси / А. С. Майхрович. – Минск, 1997.

# ПЛАНЫ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## ПРАКТЫЧНЫ ЗАНЯТАК 1

### План

1. Роля грамадска-палітычнага і філасофскага мыслення ў фарміраванні айчыннай культуры.
2. Праблемы рэканструкцыі, асаблівасці і перыядызацыя гісторыі айчыннай думкі.

### Тэмы рэфератаў

1. Філасофія ў сістэме культуры Беларусі.
2. Асаблівасці і праблемы рэканструкцыі філасофскай думкі ў Беларусі.
3. Перыяды станаўлення грамадска-філасофскай думкі ў Беларусі.

### Заданні

